# ГІСТОРЫЯ
# СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук,
прафесара *У. С. Кошалева*

У 2 частках

**Частка 2**

2-е выданне, перапрацаванае

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск «Народная асвета» 2014

Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

УДК 94(3)(075.3=161.3)
ББК 63.3(0)3я721
Г90

Аўтары:
**У. С. Кошалеў** (§ 1—8, 19, 20, 22, 23, 25, 28, 30, 31, «Слоўнік гістарычных тэрмінаў і паняццяў», «Храналагічная табліца»);
**М. С. Корзун** (§ 9—12);
**М. І. Мініцкі** (§ 13, 14, 17, 18, 24, 26, 29);
**А. А. Прохараў** (§ 15, 16, 21, 27);
**Н. В. Байдакова** (метадычныя матэрыялы)

Пераклад з рускай мовы *В. К. Раманцэвіч*

Рэцэнзенты:
кафедра ўсеагульнай гісторыі ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» (кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Я. С. Разенблат*; кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Л. В. Харычкава*); настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй» *П. М. Гламбоцкі*; настаўнік гісторыі і грамадазнаўства першай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Бараўлянская гімназія» *І. А. Азарынская*

**Гісторыя Старажытнага свету** : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул.
Г90 сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / У. С. Кошалеў [і інш.] ; пад рэд. У. С. Кошалева. — 2-е выд., перапрац. — Мінск : Народная асвета, 2014. — 127 с. : іл.
ISBN 978-985-03-2214-2.
Першае выданне выйшла ў 2009 годзе.

**УДК 94(3)(075.3=161.3)**
**ББК 63.3(0)3я721**

**ISBN 978-985-03-2214-2 (ч. 2)**
**ISBN 978-985-03-2212-8**

© Раманцэвіч В. К., пераклад на беларускую мову, 2014
© Афармленне. УП «Народная асвета», 2014

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## Дарагія вучні!

Вы ўжо пазнаёміліся з гісторыяй Старажытнага Усходу і Амерыкі. Зараз мы пераходзім да вывучэння першых цывілізацый, якія ўзніклі ў Еўропе. Гэтымі цывілізацыямі былі Старажытная Грэцыя і Старажытны Рым. Разам яны складаюць адзіную антычную цывілізацыю, або ***анты́чнасць***.

Паняцце «антычнасць» паходзіць ад лацінскага слова «антыквус», што азначае «старажытны», або «старажытнасць». Але яно адносіцца толькі да грэка-рымскай старажытнасці.

Калыскай антычнасці з'яўляецца Старажытная Грэцыя. Дасягненні Старажытнай Грэцыі атрымаў у спадчыну Старажытны Рым. Грэка-рымская старажытнасць стала асновай сучаснай еўрапейскай цывілізацыі.

Вялікую ролю ў гісторыі антычных дзяржаў, а гэта значыць і ўсёй Еўропы, адыгралі так званыя варварскія народы.



Народная асвета
Правообладатель Народная асвета

# Раздзел 1. СТАРАЖЫТНАЯ ГРЭЦЫЯ

Старажытная Грэцыя — назва не дзяржавы, а краіны. У старажытнасці на яе тэрыторыі ўзнікла мноства невялікіх дзяржаў. Жыхары гэтых дзяржаў былі аб'яднаны адной мовай, агульнымі звычаямі, ушанаваннем адных і тых жа багоў. Старажытныя грэкі стварылі высокаразвітую культуру і мастацтва.

## § 1. Прырода і насельніцтва Старажытнай Грэцыі

**Успомніце.** У далінах якіх рэк размешчаны буйнейшыя дзяржавы Старажытнага Усходу?

**1. Паходжанне грэкаў.** Продкі старажытных грэкаў жылі на поўначы *Балканскага паўвострава*. Пачынаючы з канца трэцяга тысячагоддзя да н. э. яны паступова праніклі на поўдзень паўвострава, прылеглыя да яго астравы Эгейскага мора і заходняе ўзбярэжжа Малой Азіі (сучасная Турцыя). Сваю новую радзіму грэкі назвалі ***Элладай***, а сябе — ***э́лінамі***. Агульнае імя *грэкі* ім далі старажытныя рымляне.

У грэкаў існаваў міф аб Сусветным патопе. Увесь свет аказаўся пакрытым вадой. Выратаваліся толькі два чалавекі — мужчына і жанчына. У іх нарадзіўся сын *Элін*. Ад яго вядуць свой пачатак чатыры самыя знакамітыя элінскія плямёны — *іанійцы, эалійцы, ахейцы* і *дарыйцы*.



Узбярэжжа Грэцыі. *Сучасны выгляд*



Правообладатель Народная асвета

**2. Прыродныя ўмовы і геаграфічнае становішча.** Вялікі ўплыў на жыццё старажытных грэкаў аказвалі прыродныя ўмовы. Балканская, або мацерыковая, Грэцыя пакрыта скалістымі гарамі, якія раздзяляюць яе на дробныя вобласці. Буйных рэк на паўвостраве няма. Лета тут гарачае і засушлівае, урадлівых зямель мала.


Свяшчэнная гара Алімп

З усіх бакоў, акрамя паўночнага, Грэцыя абмываецца морамі. Берагі зрэзаны зручнымі бухтамі. Вакол размешчана мноства астравоў, і самы вялікі з іх — *Крыт*. Невыпадкова старажытныя грэкі былі вопытнымі мараплаўцамі.

Балканская Грэцыя дзялілася на тры часткі — Паўночную, Сярэднюю і Паўднёвую. Паўночная Грэцыя адрознівалася суровым горным кліматам. Тут на вяршыні самай высокай гары — *Алімпа* — ніколі не раставаў снег і, паводле легендаў, жылі грэчаскія багі.

З Паўночнай Грэцыі ў Сярэднюю Грэцыю вядзе вузкі праход, які пралягае паміж горамі і морам. Важнейшая вобласць Сярэдняй Грэцыі — *Атыка*. Менавіта тут знаходзіўся самы знакаміты горад Старажытнай Грэцыі — ***Афіны***.

У Паўднёвай Грэцыі размешчаны паўвостраў *Пелапанес*. Тут узнікла грэчаская дзяржава *Спарта*, якая праславілася сваімі храбрымі воінамі.

**3. Заняткі старажытных грэкаў.** Асноўным заняткам старажытных грэкаў было земляробства. Ва ўрадлівых далінах грэкі вырошчвалі ячмень і пшаніцу, вінаград, аліўкі, садавіну і агародніну. З пладоў аліўкавага дрэва выціскалі алей, а з вінаграду рабілі віно. Гэтыя прадукты вывозіліся за межы Грэцыі. На схілах гор пасвілі коз і авечак. Зямлю аралі з дапамогай быкоў. Амаль у кожнай гаспадарцы трымалі свіней і свойскіх птушак.

Урадлівых зямель было недастаткова. Таму хлеба ў Старажытнай Грэцыі не хапала. Збожжа звычайна ўвозілі, абменьваючы яго на віно і аліўкавы алей.



Правообладатель Народная асвета

У гарах здабываліся карысныя выкапні: жалеза, медзь, свінец, серабро, мармур. Аднак свайго металу ў Грэцыі было мала. Яго прыходзілася ўвозіць з іншых краін. З мармуру грэкі будавалі цудоўныя храмы і стваралі скульптуры. Каштоўная драўніна горных лясоў выкарыстоўвалася для будаўніцтва караблёў і ў розных рамёствах. У Грэцыі мелася таксама гліна высокай якасці. З яе рабілі дамашні посуд і пасудзіны для перавозкі вадкіх і сыпучых прадуктаў.

*Такім чынам, Старажытная Грэцыя была размешчана на тэрыторыі поўдня Балканскага паўвострава, астравоў Эгейскага мора і заходняга ўзбярэжжа Малой Азіі. Старажытныя грэкі дабіліся поспехаў у развіцці розных галін сельскай гаспадаркі і рамёстваў, асвоілі караблебудаўніцтва і мараплаванне. Яны ахвотна адпраўляліся ў далёкія падарожжы.*

1. Што вы даведаліся аб паходжанні грэкаў?
2. Пакажыце Старажытную Грэцыю на карце і апішыце словамі яе месцазнаходжанне.
3. Вызначце асаблівасці прыродных умоў Грэцыі (не менш за тры). Зрабіце адпаведны вывад, улічваючы свае веды аб прыродзе Старажытнага Егіпта і Месапатаміі.
4. Якім заняткам адпавядала геаграфічнае становішча Грэцыі?
5. Падумайце, на чым заснавана сцвярджэнне аб тым, што старажытныя грэкі былі ўмелымі мараплаўцамі.

6*. Якім чынам грэкі падарожнічалі і асвойвалі тэрыторыю Балканскага паўвострава?

## § 2. Мінойскі Крыт і яго культура

**Успомніце.** Дзе і калі з'явіліся першыя дзяржавы?

Першыя дзяржавы ў Грэцыі ўзніклі на востраве Крыт — адным з самых буйных астравоў Эгейскага мора. У старажытнасці на гэтым востраве жылі нягрэчаскія плямёны. Вучоныя назвалі іх крыцянамі або мінойцамі па імені легендарнага цара Мінаса.



Правообладатель Народная асвета

**1. Фарміраванне Крыцкай цывілізацыі.** Востраў Крыт размешчаны на марскім шляху з Егіпта ў Грэцыю. Яго жыхары актыўна асвойвалі прыгодныя для апрацоўкі землі, развівалі жывёлагадоўлю і рамёствы. Жыццёва важным заняткам была рыбная лоўля.

У *канцы* **трэцяга тысячагоддзя да н. э.** на востраве Крыт узніклі невялікія дзяржавы. Цэнтрам кожнай дзяржавы з'яўляўся палац са сваім правіцелем. У палацы жылі таксама жрацы, шматлікая знаць і прыслуга. Такія дзяржавы вучоныя назвалі *палацавымі*.

Асноўную частку насельніцтва Крыта складалі земляробы. Яны жылі абшчынамі, апрацоўвалі свае зямельныя надзелы і пастаўлялі прадукты ў палацавую казну. Пры палацах знаходзіліся шматлікія рамесныя майстэрні. За выкананую работу рамеснікі атрымлівалі харчовыя пайкі. Правіцелі Крыта выкарыстоўвалі таксама працу рабоў і рабынь.

**2. Росквіт і гібель Крыцкай цывілізацыі.** Росквіт цывілізацыі на Крыце адносіцца да **XVI — першай палавіны XV стагоддзя да н. э.** У гэты час Крыт быў аб'яднаны пад уладай кноскіх цароў. Самы знакаміты з іх — легендарны ***Мінас***.

Паводле падання, пры цары Мінасе вядомы майстар Дэдал пабудаваў Лабірынт. У гэтым вялікім заблытаным збудаванні пражывала пачвара Мінатаўр.

Цары Крыта стварылі моцны ваенны флот і ўстанавілі панаванне на Эгейскім моры. Крыцяне траплялі ў самыя аддаленыя куткі Міжземнамор'я. Яны гандлявалі з Егіптам, Фінікіяй і іншымі краінамі.

Развіццё Крыцкай цывілізацыі было перапынена стыхійным бедствам. У сярэдзіне XV стагоддзя да н. э. недалёка ад Крыта адбылося моцнае вывяржэнне вулкана. Прыбярэжныя гарады і палацы былі разбураны. На востраў сталі перасяляцца грэкі-ахейцы. Яны запазычылі ў крыцян іх культурныя дасягненні, і перш за ўсё знакі крыцкай пісьменнасці.



Правообладатель Народная асвета



Кноскі палац. Паўднёвыя вароты

**3. Культура і рэлігія Крыта.** Крыцяне былі выдатнымі будаўнікамі, стваральнікамі палацавых комплексаў. У 1900 годзе археолагі раскапалі *Кноскі палац*. Гэта самы грандыёзны з усіх крыцкіх палацаў. Ён быў вышынёй у два-тры паверхі і займаў тэрыторыю каля 1 гектара.

У палацы было мноства пакояў, залы для рэлігійных цырымоній, сістэма забеспячэння вадой і каналізацыя. У лабірынце праходаў, калідораў і лесвіц было лёгка заблудзіцца, што, магчыма, парадзіла легенду аб Лабірынце і Мінатаўры. У кладовых і гаспадарчых памяшканнях палаца працавалі рамеснікі. На сценах царскіх пакояў захаваліся фрэскі, або карціны, напісаныя вадзянымі фарбамі па свежым, сырым тынку. На іх паказваліся сцэны прыдворнага жыцця. Асабліва цікавыя выявы крыцкіх прыгажунь і гульні з раз'юшаным быком, які лічыўся на Крыце свяшчэннай жывёлай.



Крыцкая ваза



Выява знатнай жанчыны.
*Фрэска з Кноскага палаца*



Правообладатель Народная асвета

Крыцяне ўмелі рэалістычна адлюстроўваць прыроду. Крыцкія мастакі з любоўю малявалі сады, лугі, кветкі, расліны, мора з рыбамі і іншымі марскімі істотамі. У іх жывапісе адсутнічаюць сцэны жорсткіх ваенных паходаў і бітваў.



Крыцкая багіня-маці

Жыхары Крыта пакланяліся некальkім божаствам. Вярхоўным бажаствам была вялікая *багіня-маці*. Яе выяўлялі ў розных абліччах. Гэта і багіня са змеямі, і валадарка звяроў, і багіня-паляўнічая. У крыцян было таксама бажаство, у якім спалучаліся рысы чалавека і быка.

Божаствам пакланяліся ў свяшчэнных гаях, пячорах, у палацах правіцеляў. Невялікія свяцілішчы з ахвярнымі сталамі ставіліся побач з дамамі простых людзей. У культавых цырымоніях вялікая роля належала жанчынам. Гэта гаворыць аб тым, што ў крыцкім грамадстве жанчыны карысталіся асаблівай павагай.

*Такім чынам, крыцяне былі стваральнікамі старажытнейшай еўрапейскай цывілізацыі. Вучоныя адкрылі на Крыце царскія палацы. Галоўным сярод іх быў Кноскі палац. Важнейшае дасягненне гэтай цывілізацыі — пісьменнасць — ахейцы прыстасавалі для грэчаскай мовы.*

?

1. Дзе і калі ў Грэцыі ўзніклі першыя дзяржавы? Як такія дзяржавы назвалі вучоныя?
2. Што ўяўляў сабой Кноскі палац? Чаму ў ім было лёгка заблудзіцца?
3. Якія доказы сведчаць аб росквіце Крыцкай цывілізацыі? У сувязі з чым і калі было перарвана яе развіццё?



Правообладатель Народная асвета

4. Раскажыце аб культуры Крыта. Растлумачце, што такое фрэска.
5. Як у крыцкім грамадстве адносіліся да жанчын?
6*. Падумайце, чаму ў крыцкім жывапісе адсутнічаюць сцэны жорсткіх ваенных паходаў і бітваў.

## Для дапытлівых

### Міф пра Тэсея

Магутным быў цар Мінас. Цяжкай данінай ён аблажыў горад Афіны. Жыхары горада павінны былі рэгулярна адпраўляць на Крыт сем юнакоў і сем дзяўчат. Там іх з'ядаў Мінатаўр — лютая пачвара з галавой быка і целам чалавека, якая жыла ў Лабірынце. У гэтым вялікім збудаванні было столькі пакояў і заблытаных калідораў, што, трапіўшы туды, ужо было немагчыма выбрацца на свабоду. Смутак і нуда панавалі сярод афінян.

Тады храбры юнак Тэсей, сын афінскага цара Эгея, вырашыў забіць Мінатаўра. Ён сказаў бацьку, што калі пераможа, то матросы падымуць на караблі белыя парусы, калі загіне — то чорныя. На Крыце вельмі прыгожага Тэсея пакахала Арыядна — дачка Мінаса. Каб выратаваць каханага, яна дала яму востры меч і клубок нітак. Тэсей прывязаў каля ўвахода ў Лабірынт канец ніткі, агаліў меч і пайшоў па заблытаных пераходах, раскручваючы клубок. У адным з памяшканняў на юнака накінуўся Мінатаўр. Юнак не разгубіўся і ў смяротнай схватцы праціў пачвару мячом. З дапамогай ніткі ён лёгка знайшоў выхад з Лабірынта. Разам з Арыяднай і выратаванымі юнакамі і дзяўчатамі Тэсей уцёк на караблі з вострава на радзіму. У спешцы Тэсей забыў пра сваё абяцанне бацьку. Калі цар Эгей убачыў чорныя парусы, ён у адчаі кінуўся з высокай скалы ў мора. З той пары гэта мора сталі называць Эгейскім.

**Пытанні да дакумента.** Што ў міфе можна лічыць дакладным, а што — вымыслам?



Правообладатель Народная асвета

## § 3. Ахейская Грэцыя

**Успомніце.** Хто ў грэчаскай міфалогіі быў роданачальнікам ахейцаў і дарыйцаў?

**1. Ахейскае заваяванне Грэцыі.** У канцы трэцяга тысячагоддзя да н. э. з поўначы Балканскага паўвострава ў Грэцыю ўварваліся плямёны ахейцаў. Заваёўнікі знаходзіліся на больш нізкім узроўні развіцця, чым мясцовае нягрэчаскае насельніцтва. Толькі з XVI стагоддзя да н. э. пачынаецца пад'ём гаспадаркі і культуры ахейскай Грэцыі. Узнікла Мікенская цывілізацыя, па назве самай моцнай дзяржавы ахейцаў — ***Мікен***. Гэта была першая цывілізацыя на тэрыторыі мацерыковай Грэцыі.



Мікены. Ільвіныя вароты

Як і на Крыце, цэнтрамі невялікіх дзяржаў былі палацы з прылеглай тэрыторыяй. У адрозненне ад крыцкіх ахейскія палацы мелі магутныя ўмацаванні. Гэта азначае, што ахейскія цары варагавалі адзін з другім і часта ажыццяўлялі ваенныя паходы.

**2. «Золатабагатыя Мікены».** Буйнейшай палацавай дзяржавай у Паўднёвай Грэцыі былі Мікены. Правіцелі Мікен і вышэйшая знаць валодалі невымернымі багаццямі. У царскіх склепах археолагі выявілі шмат залатых рэчаў, упрыгожанні, бронзавыя мячы і іншую зброю. Нядзіўна, што старажытныя грэкі называлі Мікены «золатабагатымі».



Залатая маска з Мікен



Правообладатель Народная асвета



Гамер

Мікенскія цары часта рабілі набегі на прыбярэжныя паселішчы Усходняга Міжземнамор'я. На паўночна-заходнім узбярэжжы Малой Азіі іх сапернікам стала невялікае *Траянскае царства*. **Каля 1240 года да н. э.** мікенскі цар на чале аб'яднанага войска ахейскіх дзяржаў адправіўся заваёўваць Трою.

**3. Траянская вайна.** Пра вайну паміж траянцамі і грэкамі паведамляюць старажытнейшыя легенды і паданні. З пакалення ў пакаленне яны перадаваліся ў вуснай форме. У VIII стагоддзі да н. э. вялікі грэчаскі паэт ***Гамер*** паклаў іх у аснову сваёй паэмы ***«Іліяда»***.

Як паведамляе Гамер, вайна ішла на працягу дзесяці гадоў. Сцены Трoі былі такімі высокімі і непрыступнымі, што грэчаскія воіны ніяк не маглі авалодаць горадам. Урэшце самы разумны з грэкаў — Адысей прыдумаў, як узяць Трою. Па яго парадзе грэкі пабудавалі каля крапасной сцяны вялікую драўляную статую каня.



Траянскі конь. *Сучасны малюнак*



Правообладатель Народная асвета

Усярэдзіне статуі схавалася некалькі адважных грэчаскіх воінаў. Астатнія селі на караблі і адплылі ў адкрытае мора. Легкаверныя траянцы выршылі, што грэкі пайшлі зусім. Узрадаваліся яны доўгачаканай перамозе і ўцягнулі каня ў горад.

Як толькі наступіла ноч, грэчаскія воіны выйшлі з драўлянага каня і адчынілі гарадскія вароты. Разам з грэкамі, якія тайна вярнуліся, яны напалі на сонных траянцаў. Трою разбурылі і спалілі, а яе цара забілі. Так закончылася Траянская вайна.

Доўгі час людзі лічылі гэтую гісторыю міфам. Толькі ў канцы XIX стагоддзя нямецкі археолаг-аматар *Генрых Шліман* даказаў, што Троя існавала. На тэрыторыі сучаснай Турцыі ён раскапаў руіны старадаўняга горада.




Старажытная Грэцыя



Правообладатель Народная асвета



Сцены Трої.
*Сучасны выгляд*

Хутка пасля заканчэння Траянскай вайны загінула і мікенская цывілізацыя. З поўначы Балканскага паўвострава на поўдзень, у Грэцыю, рушылі плямёны грэкаў-дарыйцаў. Яны не валодалі культурай і навыкамі ахейцаў. Новыя заваёўнікі захапілі і разбурылі амаль усе палацы.

**4. Культура ахейскай Грэцыі.** Ахейцы запазычылі знакі крыцкага пісьма і прыстасавалі яго для грэчаскай мовы. Іх пісьмёнамі былі пакрыты шматлікія таблічкі, якія захаваліся да нашага часу.

Насценны жывапіс ахейскіх палацаў вельмі падобны да крыцкага. Але паміж імі ёсць адно істотнае адрозненне. У ахейскім жывапісе пераважала ваенная тэма. Ахейцы малявалі часцей за ўсё бітвы, баявыя калясніцы, людзей са зброяй, аблогу крэпасцей.

*Такім чынам, ахейцы, як і крыцяне, стварылі палацавыя дзяржавы і высокаразвітую культуру. Праўда, яна была больш суровай і ваяўнічай у параўнанні з культурай Крыцкай цывілізацыі.*

?

1. Калі ўзнікла першая цывілізацыя на тэрыторыі мацерыковай Грэцыі? Як яна называлася і хто быў яе стваральнікам?
2. Чым адрозніваліся палацавыя збудаванні на Крыце ад падобных збудаванняў у ахейскай Грэцыі?
3. Чаму старажытныя грэкі называлі Мікены «золатабагатымі»?
4. Па якіх крыніцах можна даведацца аб падзеях Траянскай вайны? Палічыце, колькі гадоў таму яна адбылася.
5. Паразважайце, што прывяло да пагібелі Мікенскую цывілізацыю. Пад чыімі ўдарамі яна не выстаяла? Чаму?

6*. Вызначце найбольш характэрныя рысы культуры ахейцаў.



Правообладатель Народная асвета

### Для дапытлівых

**Міф аб пачатку Траянскай вайны**



Суд Парыса. *Выява на старажытнагрэчаскай вазе*

Неяк тры грэчаскія багіні — Гера, Афіна і Афрадыта — паспрачаліся паміж сабой. Хто з іх самая прыгожая? Каму валодаць яблыкам з надпісам «Цудоўнейшая»? Вырашыць гэтую спрэчку яны папрасілі Парыса — сына правіцеля магутнага Траянскага царства. Парыс прысудзіў першынство Афрадыце, паколькі яна паабяцала яму ў жонкі самую прыгожую жанчыну. Самай прыгожай у той час лічылася Алена — жонка цара Спарты Менелая. Афрадыта дапамагла Парысу выкрасці Алену. Абражаны Менелай вырашыў выступіць у паход супраць Троі. Разам з ім на вайну пайшлі ўсе ахейскія цары. На чале грэчаскага войска стаў старэйшы брат Менелая цар Мікен Агамемнан.

**Пытанні да дакумента.** Да чаго прывяла спрэчка паміж трыма грэчаскімі багінямі? Ці гаворыцца ў міфе аб сапраўднай прычыне вайны?

## § 4. Рэлігія старажытных грэкаў

**Успомніце.** Як называюць рэлігію, заснаваную на пакланенні многім багам і ідалам?

Як і многія народы Старажытнага свету, грэкі абагаўлялі з'явы прыроды і верылі ў існаванне звышнатуральных сіл. Грэкі лічылі, што прыроднымі з'явамі і жыццём людзей кіруюць багі.

**1. Багі-алімпійцы.** Паколькі багі жылі на Алімпе, іх называлі алімпійскімі. Грэкі ўяўлялі багоў у выглядзе людзей, думалі, што багі жывуць адной вялікай сям'ёй. Там, на Алімпе, у раскошных палацах багі праводзілі час у баляваннях і забавах. Адтуль яны спус-



Правообладатель Народная асвета



Бог Зеўс.
*Фрагмент роспісу пасудзіны*

каліся на зямлю і ўмешваліся ў жыццё людзей, дапамагалі ім або, наадварот, перашкаджалі.

Самым галоўным бажаством, бацькам і багоў і людзей, быў ***Зеўс***. Ён загадваў маланкай і громам, падараваў людзям законы. Грэкі малявалі Зеўса ў выглядзе ўсёмагутнага цара, які сядзеў на троне са скіпетрам (жазлом) у руцэ. Жонка Зеўса *Гера* лічылася вярхоўнай багіняй і абаронніцай сям'і.

Два браты Зеўса — *Пасейдон* — бог мораў і акіянаў і *Аід* — бог падземнага царства мёртвых. Пасейдон заўсёды паказваўся з трохзубцам, з дапамогай якога ён падымаў буру ў акіяне. Сястра Зеўса — багіня земляробства *Дэметра* навучыла людзей вырошчваць хлеб. Грэчаскія воіны маліліся суроваму богу вайны *Арэсу*, кавалі— богу-працаўніку *Гефесту*, а гандляры — хітраму і вынаходліваму *Гермесу*.



Бог мора Пасейдон

Асабліва шанаваўся сын Зеўса *Апалон* — бог-воін, апякун мастацтва і паэзіі. Апалон заснаваў у Дэльфах храм з аракулам. *Аракулам* называліся свяшчэнныя месцы, дзе багі давалі прадказанні людзям. У Грэцыі было шмат аракулаў. Але ні адзін з іх не мог параўнацца са славай і аўтарытэтам Дэльфійскага.

Вялікай любоўю карысталася дачка Зеўса *Афіна* — багіня мудрасці і абаронніца гарадоў. У яе го-



Правообладатель Народная асвета

нар грэкі назвалі горад Афіны. Багіня часта паказвалася ў ваенных даспехах і з савой — сімвалам мудрасці. Багіня любові і прыгажосці *Афрадыта* таксама лічылася дачкой Зеўса.



Багіня перамогі Ніка

Акрамя алімпійскіх багоў, грэкамі ўшаноўваліся многія іншыя божаствы: багіня перамогі *Ніка*, бог Сонца *Геліяс*, багіні месяца, дня, зоркі, ночы, вятроў.

**2. Культ, або шанаванне, багоў.** У гонар сваіх багоў старажытныя грэкі ўзводзілі храмы і ставілі статуі. Падчас рэлігійных свят да культавых месцаў сцякалася мноства людзей. Тэрыторыя храма лічылася свяшчэннай і недатыкальнай. У храмах захоўвалі свае каштоўныя рэчы багатыя людзі. У іх знаходзілася нават дзяржаўная казна. Самым знакамітым у Старажытнай Грэцыі быў храм Зеўса ў Алімпіі.

Грэкі стараліся не прагнявіць багоў. Яны строга захоўвалі ўстаноўленыя абрады — узносілі малітвы і рабілі ахвярапрынашэнні.

Ахвяры багам складваліся перад храмам, а часам на плошчы або перакрыжаваннях. На ахвярным алтары распальвалі свяшчэнны агонь. У агонь лілі віно, алей, мёд або малако. У асабліва важных выпадках у ахвяру прыносілі жывёл. У агонь — у дар богу — кідаліся толькі малакаштоўныя часткі жывёл. Усё астатняе з’ядалі ўдзельнікі ахвярапрынашэння. Для вельмі бедных людзей гэта была адзіная магчымасць пачаставацца мясам. Грэкі



Храм Зеўса ў Алімпіі.
*Сучасны выгляд*



Правообладатель Народная асвета

ўспрымалі ахвярапрынашэнні як агульную, сяброўскую трапезу людзей і багоў.

*Такім чынам, старажытныя грэкі былі язычнікамі. Яны верылі ў звышнатуральныя сілы і пакланяліся мностcovy багоў. Яны прасілі ў багоў дапамогі і падтрымкі, праводзілі культавыя абрады, каб багі не адвярнуліся ад людзей.*

1. Пералічыце асноўных грэчаскіх багоў-алімпійцаў. Чаму іх так называлі?
2. Як называліся і якую ролю выконвалі ў жыцці старажытных грэкаў свяшчэнныя месцы? Назавіце самае знакамітае з іх.
3. Дзе адбываліся рэлігійныя святы і ахвярапрынашэнні?
4. Параўнайце рэлігіі старажытных грэкаў і старажытных егіпцян. Што аб'ядноўвала іх вераванні?

5*. Уявіце, што вам удалося пабыць на гары Алімп. Апішыце словамі, што вы там убачылі ў адпаведнасці з міфамі Старажытнай Грэцыі.

## Для дапытлівых

### Міф аб Праметэі

Праметэй быў бажаством старэйшага пакалення — тытанам. Калі багі змагаліся паміж сабой, ён стаў на бок Зеўса і дапамог яму заняць трон вярхоўнага бога. Зеўс надзяліў усіх, хто дапамагаў яму, падарункамі, а пра людзей забыў. Адзіным, хто ўспомніў пра іх, быў Праметэй. Каб дапамагчы людзям, ён перадаў ім нябесны агонь, навучыў іх пісьму і лічэнню, рамёствам і навукам. За гэта Зеўс загадаў прыкаваць тытана да скалы ў гарах Каўказа. Кожны дзень сюды прылятаў арол і раздзіраў цела героя вострай дзюбай і кіпцюрамі. Праметэй пакутаваў, але не адрокся ад людзей і не пакаяўся перад Зеўсам. У Афінах і іншых месцах Праметэя ўшаноўвалі як бога. У наш час гэты міфічны герой з'яўляецца сімвалам духоўнай і фізічнай незалежнасці.

**Пытанні да дакумента.** Чым разгнявіў багоў Праметэй?



Правообладатель Народная асвета

**Храм Зеўса ў Алімпіі**

Алімпія была буйнейшым рэлігійным цэнтрам Старажытнай Грэцыі. Назва горада звязана са свяшчэннай гарой Алімп — месцазнаходжаннем багоў. У V стагоддзі да н.э., пасля перамаганоснага завяршэння грэка-персідскіх войнаў, архітэктар Лібон узвёў тут вялікасны храм Зеўса Грамавержца — Зеўса Алімпійскага. Праўда, быў адзін недахоп — у храме не было дастойнай статуі Зеўса. Гэты недахоп было даручана выправіць знакамітаму скульптару Фідыю. Аснова статуі ім была выраблена з дрэва, а адкрытыя ўчасткі цела былі пакрыты пласцінамі са слановай косці. Статуя вышынёй 17 м здавалася жывой. У Грэцыі няшчасным лічылі таго чалавека, які не мог пабачыць гэтае геніяльнае тварэнне Фідыя. Тыя ж, каму пашчасціла ўбачыць Зеўса, сцвярджалі, што перад імі не выява бога, а само бажаство. Статуя Зеўса лічыцца адным з сямі цудаў свету старажытнасці.

## § 5. Узнікненне грэчаскага поліса

**Успомніце.** Хто кіраваў першымі гарадамі-дзяржавамі ў Міжрэччы?

**1. Пачатак адраджэння Грэцыі.** Мы ўжо ведаем, што дарыйскае заваяванне стала бедствам для ахейскай Грэцыі. Квітнеючыя дзяржавы былі разбураны. Культура, рамёствы і гандаль прыйшлі ў заняпад. Людзі жылі ў невялікіх умацаваных паселішчах. Земляробы працавалі не складаючы рук. А ўраджаі ўсё роўна былі беднымі. Цвёрдыя глебы дрэнна паддаваліся апрацоўцы драўлянымі і меднымі прыладамі працы.



Земляробчыя работы. *Выява на старажытнагрэчаскай вазе*

Хуткае развіццё Грэцыі пачалося толькі ў VIII стагоддзі да н. э. Яно звязана з шырокім распаўсюджан-



Правообладатель Народная асвета



Збор алівак. *Выява на старажытнагрэчаскай вазе*



Каваль. *Выява на старажытнагрэчаскай вазе*

нем жалеза. Выкарыстанне жалезных прылад працы дазволіла лепш апрацоўваць глебу і атрымліваць большыя ўраджаі.

У Грэцыі павялічылася плошча апрацоўваемых зямель, стала больш збожжа і статка. Вырасла колькасць насельніцтва. Земляробы пачалі прадаваць лішкі свайго ўраджаю, рамеснікі — свае вырабы. Хутка развіваліся гандаль і караблебудаўніцтва. У гэты ж час нараджаюцца навука, філасофія, літаратура. Шырока распаўсюдзілася пісьменнасць, якую перанялі грэкі ў фінікійцаў. Фінікійскія знакі былі прыстасаваны для старажытнагрэчаскай мовы і стварэння больш дасканалага алфавіта.

**2. Гарады-дзяржавы.** У VIII—VI стагоддзях да н. э. у Старажытнай Грэцыі ўзніклі дзясяткі самастойных гарадоў-дзяржаў. Усе яны жылі па сваіх законах, пастановах і правілах, мелі сваіх правіцеляў і ўзброеныя сілы. Называліся гэтыя гарады-дзяржавы ***по́лісамі***.

Полісы выраслі з невялікіх умацаваных паселішчаў. Цэнтрам поліса быў горад. Да яго далучалася навакольная тэрыторыя з нешматлікімі паселішчамі. У кожнай такой дзяржаве пражывала ў сярэднім ад 5 да 10 тысяч чалавек.

Асноўная частка насельніцтва жыла ў горадзе. Яго цэнтрам з’яўляўся *акропаль* (верхні горад), які звычайна будаваўся на ўзгорку. Тут знаходзіліся храмы багоў і жылі правіцелі. Каля паднож-



Правообладатель Народная асвета



Афіны. *Сучасны малюнак*

жа акропаля размяшчаліся дамы грамадзян і рыначная плошча — ***агара́***.

Карэнныя жыхары поліса, якія мелі ва ўласнасці зямлю і ўдзельнічалі ў кіраванні полісам, лічыліся ***грамадзя́намі***. Толькі грамадзяне маглі галасаваць на народных сходах, валодаць уласнасцю, выступаць ад свайго імя ў судзе. Ганаровым абавязкам грамадзяніна была абарона айчыны. Іншаземцы, якія пражывалі ў полісе, не мелі ўсіх гэтых правоў і грамадзянамі не з'яўляліся. Таму яны часцей за ўсё займаліся рамяством і гандлем. Ніякіх правоў не мелі толькі рабы.

Войска поліса складалася з цяжкаўзброеных пехацінцаў — *гаплітаў* (ад грэчаскага слова «гоплан» — узбраенне). У баі гапліты выстройваліся адзін за другім некалькімі радамі. Такі строй называўся *фалангай*.



Грэчаская фаланга. *Выява на старажытнагрэчаскай вазе*

Першапачаткова ўся ўлада знаходзілася ў руках родавай знаці. Такая ўлада называлася *арыстакратыяй*, г. зн. «уладай лепшых, знатных». Думка арыстакратаў значыла больш, чым думка простага народа — *дэмасу*. Знатныя людзі з пагардай



Правообладатель Народная асвета

адносіліся да простых людзей, паколькі лічылі сябе нашчадкамі багоў і старажытных цароў. Нягледзячы на гэта, простыя грамадзяне імкнуліся ўдзельнічаць у кіраванні полісам.

Барацьба паміж арыстакратамі і дэмасам ператваралася ў многіх полісах у сапраўдную вайну. Часам прадстаўнікі дэмасу сілай захоплівалі ўладу і правілі аднаасобна. Такіх правіцеляў называлі *тыранамі*, а іх уладу *тыраніяй*. Тыраны жорстка распраўляліся з арыстакратамі. Але думалі яны не аб дабрабыце народа, а толькі аб умацаванні сваёй уласнай улады. Таму ўлада тыранаў у Старажытнай Грэцыі была недаўгавечнай.

*Такім чынам, асваенне тэхнікі выплаўкі і апрацоўкі жалеза адыграла вялікую ролю ў развіцці грэчаскага грамадства. Яно станавілася мацнейшым і багацейшым. З'явіліся полісы — гарады-дзяржавы, у якіх ішла барацьба за ўладу паміж дэмасам і арыстакратыяй. Полісы склалі аснову старажытнагрэчаскай цывілізацыі.*

**1.** Калі і ў сувязі з чым пачалося адраджэнне Грэцыі?
**2.** Што такое поліс? Растлумачце, як ён быў уладкаваны.
**3.** Хто такія грамадзяне? Якімі правамі і абавязкамі яны валодалі?
**4.** Каму належала ўлада ў грэчаскім горадзе-дзяржаве?
**5.** Што ўяўлялі сабой войскі поліса? Выкарыстоўваючы дадатковую літаратуру, раскажыце аб грэчаскай фаланзе.
**6*.** Чым растлумачыць настойлівую барацьбу за ўладу паміж арыстакратамі і дэмасам?

## § 6. Вялікая грэчаская каланізацыя

**Успомніце.** Які старажытны народ і для чаго заснаваў калоніі на ўзбярэжжы Міжземнага мора?

Старажытныя грэкі былі выдатнымі мараплаўцамі. У **VIII—VI стагоддзях да н. э.** яны, рассяляючыся па берагах Міжземнага і Чорнага мораў, стваралі свае пасяленні. У выніку ўзнікла мноства гарадоў, якія называліся *калоніямі* або пасяленнямі. Перасяленне



Правообладатель Народная асвета

грэкаў і стварэнне пасяленняў на чужых землях гісторыкі назвалі *Вялікай грэчаскай каланізацыяй.*

**1. Прычыны каланізацыі.** Прычыны перасяленняў былі розныя. Але асноўная — адна. У Грэцыі рэзка павялічылася колькасць жыхароў. Частка грэкаў ужо не магла пракарміцца на радзіме. Умовы жыцця станавіліся ўсё горшымі і горшымі. А свабодных зямель у гарыстай Грэцыі і на астравах не было. Выхадам мог быць толькі пошук падыходзячых зямель на чужбіне. Накіроўваючыся ў далёкі шлях, многія людзі ратаваліся ад беднасці і голаду.

Перасяленне насіла арганізаваны характар. Улады поліса праводзілі разведвальныя экспедыцыі, назначалі адказных асоб за арганізацыю ад'езду пасяленцаў і асваенне новых зямель. Такім чынам, яны кіравалі ўсім працэсам каланізацыі.

Перад далёкай дарогай будучыя каланісты наведвалі Дэльфійскі храм. Калі прадказанні багоў былі неспрыяльнымі, то ад'езд




Утварэнне грэчаскіх калоній у VIII — VI стст. да н. э.



Правообладатель Народная асвета



Старажытнагрэчаскі карабель. *Рэканструкцыя*

пераносіўся. Калі жыццё на новым месцы складвалася спрыяльна, дэлегацыя каланістаў наведвала былы родны горад з багатымі дарамі.

**2. Шлях да новай радзімы.** Каланісты, звычайна жыхары аднаго горада, перасяляліся групамі па 100—200 чалавек. Яны везлі з сабой статак, зброю, насенне, жменю зямлі сваёй айчыны і агонь. На шляху да новай радзімы іх чакала мноства небяспек — буры, хваробы, голад і холад, марскія разбойнікі — піраты.

Але вось усе цяжкасці падарожжа ззаду. Перасяленцы выбіралі зручнае месца каля гавані або каля вусця ракі, на ўзвышшы. Высыпалі пад ногі зямлю, прывезеную з радзімы. Раскладвалі на ёй касцёр і падпальвалі яго ад агню, які пільна ахоўвалі ў час свайго неспакойнага падарожжа. Пасля гэтага прыносілі ахвяру багам у знак удзячнасці і з надзеяй на будучае.

Затым дзялілі зямлю на роўныя часткі пад ворыва і для выпасу статка. Будавалі храмы і жыллё. Горад акружалі сценамі. Уладкаваўшыся, перавозілі жанчын, дзяцей і старых. Так пачыналася новае жыццё на новым месцы.

Грэкі-каланісты не парывалі сувязяў з родным горадам, з якога прыплылі. Яны называлі яго *метраполіяй* — горадам-маці. Калі каланіст вяртаўся на радзіму, ён надзяляўся ўсімі правамі грамадзя-



Правообладатель Народная асвета

ніна. У той жа час новыя гарады былі цалкам незалежнымі ад метраполій.

Буйнейшай метраполіяй з'яўляўся горад Мілет у Малой Азіі. Жыхары гэтага горада заснавалі некалькі дзясяткаў калоній. Усяго адну калонію заснавала Спарта, і ні адной — Афіны.

**3. Вынікі каланізацыі.** Каланізацыя зрабіла вялікі ўплыў на ўвесь старагрэчаскі свет. Яна спрыяла развіццю гаспадаркі, гандлю і караблебудаўніцтва. З калоній у метраполіі вывозілі збожжа, рабоў, статак, соль, сыравіну (драўніну і металы). У калоніі з Грэцыі везлі тавары і рэчы, якія каланісты не маглі спачатку вырабляць самі: рамесныя вырабы, аліўкавы алей, віно.

Каланізацыя пашырала межы старажытнагрэчаскага свету. Эліны спачатку засялілі ўзбярэжжа Паўднёвай Італіі і Сіцыліі, а затым — сучаснай Паўднёвай Францыі і Іспаніі. Заснавалі буйныя калоніі на паўночных берагах Чорнага мора — тэрыторыі сучасных Расіі і Украіны.

Усё гэта садзейнічала расшырэнню ведаў грэкаў аб навакольным свеце. Эліны сустрэліся з народамі, якія адрозніваліся ад іх мовай, звычаямі, рэлігіяй і культурай. Усіх, хто размаўляў на незразумелай мове, яны называлі ***варварамі*** (ад гукапераймальнага «варвар»), лічачы такімі і персаў, і егіпцян, і жыхароў Вавілоніі, не гаворачы ўжо аб астатніх плямёнах. Слова «варвар» азначала «чужак», «не элін». З цягам часу грэкі сталі лічыць толькі сябе лепшымі, дастойнымі, якія ва ўсім пераўзыходзяць варвараў, народжаных для рабства.

*Такім чынам, каланізацыя адыграла важную ролю ў развіцці Старажытнай Грэцыі. Яна садзейнічала пад'ёму гаспадарчага жыцця, гандлю і караблебудаўніцтва, фарміраванню ў грэкаў пачуцця прыналежнасці да адзінага народа.*

?

**1.** Чаму частка грэкаў павінна была пакідаць родныя краі?
**2.** Як грэкі-каланісты называлі родны горад?



Правообладатель Народная асвета

3. Якім быў шлях да новай радзімы? Пакажыце на карце месцы рассялення элінаў.
4. Хто і якім чынам кіраваў працэсам грэчаскай каланізацыі? Каму і чым было выгадна ўтварэнне калоній?
5*. Паразважайце, што агульнае аб'ядноўвала ўсіх грэкаў, дзе б яны ні жылі.

## § 7. Старажытная Спарта

**Успомніце.** Якія грэчаскія гарады-дзяржавы вам вядомы?

Буйнейшымі гарадамі-дзяржавамі Старажытнай Грэцыі былі Спарта і Афіны. Спарта мела мацнейшую армію, а Афіны — мацнейшы ў Грэцыі флот. Абодва полісы, хоць і адрозніваліся адзін ад другога, адыгралі важную ролю ў гісторыі Старажытнай Грэцыі. Самі грэкі казалі, што іх радзіма Элада стаіць як бы на дзвюх нагах. Адной нагой з'яўляецца Афінская, другой — Спартанская дзяржава.



Мясцовасць у Спарце. *Сучасны выгляд*



Правообладатель Народная асвета

**1. Узнікненне Спарты.** Спартанская дзяржава ўзнікла на поўдні Пелапанескага паўвострава ва ўрадлівай даліне пад прыгожай назвай *Лаконіка*.

У XI стагоддзі да н. э. сюды прыйшлі плямёны грэкаў-дарыйцаў і заняволілі мясцовых жыхароў — грэкаў-ахейцаў. Пераможцаў было нашмат менш, чым заняволеных. Таму ўсе яны пасяліліся ў адным месцы, на рацэ *Эўрот*. У **X стагоддзі да н. э.** тут узнікла Спарта — некалькі асобных пасяленняў, без умацаванняў і абарончых сцен. З гэтага часу заваёўнікі сталі называць сябе спартыятамі. Іх пасяленне паступова ператварылася ў цэнтр магутнай дзяржавы.

**2. Свабодныя і рабы.** Насельніцтва Спарты дзялілася на тры катэгорыі: спартыятаў, ілотаў і перыэкаў.

Свабоднымі і паўнапраўнымі грамадзянамі з'яўляліся *спартыяты*. Яны не займаліся земляробствам, гандлем або рамяством, амаль не цікавіліся навукай і мастацтвам. Усё жыццё прысвячалі ваенным практыкаванням, шмат ваявалі са сваімі суседзямі і мелі поспех у ваеннай справе. Спартыяты падпарадкавалі сабе суседнюю вобласць Месенію, а яе жыхароў ператварылі ў рабоў.

Усе захопленыя землі і рабоў спартыяты дзялілі паміж сабой пароўну. Але працавалі на гэтых землях *ілоты*. Гэта былі земляробы-рабы, якія палавіну свайго ўраджаю аддавалі гаспадарам. Яны не маглі свабодна перамяшчацца па краіне. З дазволу вярхоўных улад любы спартыят мог беспакарана забіць ілота. Спартыяты палявалі на сваіх карміцеляў, употай забіваючы мацнейшых толькі для таго, каб наганяць страх і жах на людзей, зламаць іх волю да супраціўлення. Ілоты ненавідзелі сваіх гаспадароў і часта паўставалі супраць іх.

Гандлем і рамяством займаліся *перыэкі*. Яны не былі рабамі, але і не мелі грамадзянскіх правоў жыхара поліса. У адрозненне ад спартыятаў перыэкі не маглі ўдзельнічаць у кіраванні дзяржавай.



Правообладатель Народная асвета

**3. Органы ўлады.** Спартай кіравалі два цары, якія знаходзіліся пад кантролем пяці вярхоўных правіцеляў. У выпадку вайны адзін з цароў ішоў у паход, а другі заставаўся ў Спарце. Асноўнымі органамі ўлады былі *Савет старэйшын* і *Народны сход*. Савет старэйшын складаўся з 30 чалавек. Народны сход уяўляў сабой агульны сход воінаў-спартанцаў, на якім прымаліся важнейшыя рашэнні.




Будова грамадства ў Старажытнай Спарце

Выступаць у Народным сходзе мелі права толькі старэйшыны. Рашэнні прымаліся або адхіляліся крыкамі тых, хто сабраўся, без абмеркавання. Дзяржаўны лад у Спарце называўся ***алiга́рхiяй*** (ад грэчаскага слова «алігой» — нямногія), паколькі ўлада ў ёй належала нямногім.

**4. Спартанскі лад жыцця.** Паселішчы спартанскага поліса не мелі крапасных сцен. Спартыяты лічылі, што лепшай абаронай поліса былі яго грамадзяне-воіны. Таму выхаваннем воінаў у Спарце займаліся з ранняга дзяцінства.

Калі нараджалася дзіця, яго аглядалі старэйшыны. Здароваму пакідалі жыццё і аддавалі бацьку. Слабых і нездаровых немаўлят скідалі з горнага абрыву ў бездань.

Падрыхтоўка юнакоў да будучага суровага жыцця воіна пачыналася з сямігадовага ўзросту. Хлопчыкаў аб'ядноўвалі ў групы аднагодкаў і выхоўвалі ў казарме. Іх вучылі чытаць, пісаць і карыстацца зброяй. Ежа была простай, беднай. З верхняга адзення хлопчыкі



Правообладатель Народная асвета

атрымлівалі толькі накідку. Хадзілі басанож, моўчкі, апусціўшы вочы, і размаўлялі толькі тады, калі да іх звярталіся старэйшыя або калі гэта было неабходна. Спалі на адкрытым паветры, без пакрывала. Мужчынам дазвалялася жаніцца з 20 гадоў. У арміі яны служылі да шасцідзесяцігадовага ўзросту.



Спартанскі воін

Спартанскія жанчыны карысталіся большай свабодай, чым жанчыны іншых грэчаскіх гарадоў-дзяржаў. Нараўне з мужчынамі яны маглі займацца спортам і ваенным мастацтвам. Калі спартанскія жанчыны адпраўлялі сваіх мужоў у паход, то жадалі ім вярнуцца «са шчытом або на шчыце». І калі мужчыны вярталіся са шчытом, гэта азначала, што яны атрымалі перамогу. Загінуўшых воінаў прыносілі на шчытах.

*Такім чынам, Спарта ператварылася ў адзін з самых магутных полісаў Старажытнай Грэцыі. Усе законы і правілы паводзін былі накіраваны на ўмацаванне ўлады спартыятаў над пакораным насельніцтвам. У Спарце існавала дзяржаўная сістэма выхавання дзяцей, якая адрознівалася ад выхавання дзяцей у іншых грэчаскіх полісах.*

?

**1.** Калі і як узнікла Спарта? Знайдзіце на карце Спартанскую дзяржаву.
**2.** Якім быў склад насельніцтва гэтай дзяржавы?
**3.** Раскажыце аб органах улады ў Старажытнай Спарце. Як тут прымаліся законы?
**4.** Што вам спадабалася і што не спадабалася ў спартанскім ладзе жыцця?
**5.** Чаму Спарта не мела абарончых сцен і ўмацаванняў? Пра што сведчыць гэты факт?
**6.** Чаму воінаў у Спарце рыхтавалі з дзяцінства? Якія асноўныя якасці спартанцы выхоўвалі ў хлопчыкаў?
**7*.** Аднойчы цар магутнага поліса заявіў спартанцам: «Калі я ступлю ў Пелапанес, Спарта будзе знішчана». Спартанцы адказалі адным словам: «Калі!» Як гэта паведамленне характарызуе спартанцаў?



Правообладатель Народная асвета

### Для дапытлівых

**Выхаванне спартанцаў** (Паводле Плутарха)

Мамкі былі клапатлівыя і ўмелыя, дзяцей не спавівалі, каб даць свабоду целу, гадавалі іх так, каб былі непатрабавальнымі і непераборлівымі ў ежы, каб не баяліся цемнаты і адзіноты, не ведалі, што такое свавольства і плач. Як толькі хлопчыкі дасягалі сямігадовага ўзросту, іх забіралі ў бацькоў і раздавалі па атрадах, каб яны разам жылі і елі, прывучаліся гуляць і працаваць адзін каля другога. На чале атрада назначалі таго, хто пераўзыходзіў астатніх кемлівасцю і быў храбрэйшым у бойцы. Грамаце яны вучыліся толькі ў той меры, у якой без гэтага нельга было абысціся. У астатнім жа ўсё выхаванне зводзілася да патрабаванняў бездакорна падпарадкоўвацца, стойка пераносіць пазбаўленне волі і атрымліваць верх над праціўнікам.

**Пытанні да дакумента.** Якую асноўную мэту мелі на ўвазе старэйшыны, выхоўваючы дзяцей менавіта такім чынам?

**Лаканічная мова**

З ранняга дзяцінства спартанцы прывучаліся гаварыць коратка, дакладна і зразумела. Таму і зараз такую мову называюць лаканічнай — па назве вобласці Лаконіка ў Спарце, дзе менавіта так і размаўлялі.

**Пытанні да дакумента.** Дык што азначае «гаварыць лаканічна»?

## § 8. Узнікненне і развіццё Афінскай дзяржавы

**Успомніце.** Каму належала ўлада ў Спарце?

**1. Старажытныя Афіны.** Афінская дзяржава ўзнікла ў *Атыцы*. У гэтай вобласці здаўна жылі жывёлаводы і земляробы. У прыбярэжных паселішчах — рыбакі, якія займаліся лоўляй марской рыбы.



Правообладатель Народная асвета

Горад, названы ў гонар багіні Афіны, з'яўляецца адным са старажытнейшых гарадоў Еўропы. Ён размешчаны на высокім узгорку за 6 кіламетраў ад мора. У VIII стагоддзі да н. э. Афіны ператварыліся ў цэнтр самастойнай дзяржавы — поліса. На вуліцах горада з'явілася шмат лавак і рамесных майстэрань. У іх працавалі ганчары і шаўцы, кавалі і муляры.



Афінскі акропаль. *Рэканструкцыя*



Афінскія манеты

Знакамітае месца Афін — плошча агара, размешчаная паблізу ад акрополя. Яна служыла месцам народных сходаў грамадзян поліса. На акропалі стаялі свяцілішча і храмы, а таксама захоўвалася дзяржаўная казна.

На агары па рынычных днях адбываўся бойкі гандаль. З усіх канцоў Атыкі сюды з'язджаліся сотні людзей. Афіняне ахвотна куплялі прадукты харчавання, а земляробы — рамесныя вырабы.

Чаго толькі не было на рынку: амфары, бочкі для збожжа, збаны і чашы; матыкі і сярпы, шарсцяныя тканіны, скураныя сандалі; празрысты аліўкавы алей, цыбуля і часнок, авечы сыр і свежая рыба! Вялікі попыт на пшанічную муку, якую можна было купіць толькі вельмі рана. Вялікі асобны рад у прадаўцоў віна. Грэкі ўжывалі віно ў разбаўленым выглядзе, п'янства асуджалі. Былі таксама і латкі, каля якіх надоўга спыняліся жанчыны. Тут прадаваліся сярэбраныя бранзалеты, пярсцёнкі, завушніцы. Усе расплачваліся манетамі з выявай галавы багіні Афіны і савы.

**2. Арыстакраты і дэмас у Афінах.** Некалі Афінамі кіравалі цары. У сярэдзіне VIII стагоддзя да н. э. улада аказалася ў руках знаці — арыстакратаў. Савет старэйшын штогод выбіраў з ліку знатных людзей *архонтаў* — правіцеляў Афінскай дзяржавы. Знатныя



Правообладатель Народная асвета




Будова грамадства Афінскага поліса

людзі прыгняталі афінскі дэмас. Яны захоплівалі лепшыя землі, размешчаныя ва ўрадлівых далінах, апутвалі земляробаў пазыкамі.

У неўрадлівыя гады бяднейшыя земляробы часта пазычалі збожжа або грошы ў багатых суседзяў. Але не проста было вярнуць пазыкі ў тэрмін. Земляробу прыходзілася расплачвацца ўчасткам зямлі. Нярэдка ён павінен быў аддаваць у рабства жонку, дзяцей, а то і самога сябе.

Афінскі дэмас быў незадаволены ўладай арыстакратаў. Беднякі патрабавалі адмены пазыковага рабства і перадзелу абшчыннай зямлі, захопленай арыстакратамі.

**3. Законы Салона.** Паміж грамадзянамі Афінскай дзяржавы гатова была разгарэцца кровапралітная вайна. Але яны своечасова апамяталіся і сталі шукаць выхад са становішча. У **594 годзе да н. э.** афінскія арыстакраты і дэмас сазвалі Народны сход і выбралі архонтам усімі паважанага ***Салона***. Яго надзялілі вялікай уладай, толькі б ён выратаваў айчыну ад крывавага разладу.

Салон апраўдаў давер афінян. Ён забараніў рабства з-за пазык. Усе афінскія грамадзяне абвяшчаліся навекі свабоднымі людзьмі. Рабства захавалася толькі для іншаземцаў, узятых у палон або купленых. З гэтага часу да кіравання дзяржавай дапускалася не толькі знаць, але і выхадцы з дэмасу. Вышэйшым органам улады ў Афінах стаў Народны сход. У рабоце Народнага сходу маглі ўдзельнічаць толькі паўнапраўныя афінскія грамадзяне, якія дасягнулі 20-гадовага ўзросту. Жанчыны, метэкі і рабы ў Народны сход не



Правообладатель Народная асвета

дапускаліся. Метэкамі называлі іншаземцаў і адпушчаных на волю рабоў.

Дзякуючы законам Салона ў Афінах пачаўся пераход ад арыстакратыі да ***дэмакра́тыі***, г. зн. *улады народа*.

*Такім чынам, у афінскім полісе ўладу на доўгі час захапілі арыстакраты. Яны пагарджалі меркаваннем простых людзей — дэмасу. Ім належала не толькі ўлада, але і лепшыя землі і рабы. Гэта ледзь не прывяло да вайны паміж грамадзянамі адной дзяржавы. Становішча выратаваў Салон, які заклаў асновы дэмакратыі ў Афінах.*

1. Дзе размешчаны Афіны і чым займалася насельніцтва Атыкі?
2. Апішыце афінскую агару.
3. Хто такія арыстакраты і дэмас? Чаму паміж імі ўзнікла рознагалоссе?
4. Колькі гадоў таму архонтам Афінскай дзяржавы быў выбраны Салон? У чым яго галоўная заслуга? Ці можна гэтага чалавека назваць мудрым?
5. Дакажыце, што дзякуючы законам Салона ў Афінах стала складвацца дэмакратыя.
6. Параўнайце дзяржаўны лад Афін і Спарты. (Пытанні для параўнання прыдумайце самі.)

## Для дапытлівых

### Цудоўныя Афіны

Ты доўбня, калі не ведаеш Афін! Калі ж бачыў і не захапляўся — асёл! А калі добраахвотна пакінуў Афіны, то ты вярблюд! — заявіў адзін старажытнагрэчаскі пісьменнік. Гэта было сказана жартам, але пісьменнік меў рацыю. Афіны сапраўды былі адным з самых цудоўных гарадоў Старажытнай Грэцыі.

**Пытанні да дакумента.** Як старажытнагрэчаскі пісьменнік адносіўся да Афін?



Правообладатель Народная асвета

# § 9. Грэка-персідскія войны і росквіт Афін

**Успомніце.** Які іранскі народ у VI стагоддзі да н. э. стварыў магутную дзяржаву ад Ніла да Інда?

**1. Паходы персаў супраць Грэцыі.** У сярэдзіне VI стагоддзя да н. э. над Грэцыяй навісла смяротная небяспека з боку магутнай Персідскай дзяржавы. Спачатку персы захапілі Вавілон, Егіпет, затым грэчаскія гарады Малой Азіі. Пасля гэтага яны вырашылі падпарадкаваць сабе ўсю Эладу. Персідскія паслы патрабавалі ад грэкаў «зямлі і вады», г. зн. поўнай пакорнасці. Многія грэчаскія астравы і гарады скарыліся, накіраваўшы сваіх воінаў у персідскую армію. Толькі Афіны і Спарта вырашылі супраціўляцца персідскаму «цару цароў» Дарыю. Афіняне скінулі паслоў са скалы, а спартанцы — у калодзеж, параіўшы ім там знайсці «зямлю і ваду».




Грэка-персідскія войны (500—449 гг. да н. э.)



Правообладатель Народная асвета

У **490 годзе да н. э.** армія персаў высадзілася каля мястэчка *Марафон* за 42 км ад Афін. Грэкаў было нашмат менш, чым персаў, але эліны вырашылі змагацца да канца. Афінскі палкаводзец *Мільтыяд* распрацаваў разумны план. Грэкі аслабілі цэнтр баявой лініі. Яны заманілі ворагаў у стан свайго войска, затым злучыліся ў тыле персідскага войска і перамаглі.

Аднак пагроза новага нашэсця персаў па-ранейшаму захавалася. Больш чым 30 грэчаскіх гарадоў-дзяржаў на чале са Спартай аб'ядналіся ў Пелапанескі саюз для абароны ад персаў. Яны стварылі агульную армію, флот і казну.

Праз дзесяць гадоў пасля марафонскай перамогі адбылася вялікая бітва ў *Фермапільскай цясніне* — вузкім праходзе паміж морам і горамі. Храбра змагаліся эліны пад камандаваннем спартанскага цара ***Леаніда***, але былі акружаны ворагамі і загінулі. Персы занялі ўсю Атыку і пакінутыя жыхарамі Афіны.

**2. Перамога над персамі.** Пасля гэтага ініцыятыву на сябе ўзяў афінскі *стратэг* (военачальнік) ***Фемістокл***. Ён пераканаў саюзнікаў даць марскі бой. Грэкі сабралі ўсе свае сілы і разбілі ў **480 годзе да н. э.** персідскі флот каля вострава *Саламін*.

Праўда, барацьба працягвалася на морах. Толькі ў **449 годзе да н. э.** абодва бакі заключылі мір. Персія адмовілася ад сваіх уладанняў у Малой Азіі. Невялікія грэчаскія дзяржавы перамаглі найвялікшую дзяржаву таго часу таму, што заключылі паміж сабой саюз і змагаліся за сваё жыццё, свабоду і айчыну. Аднак саюз гэты распаўся. У Грэцыі ўзнік новы саюз пад кіраўніцтвам Афін, якія выкарысталі яго ў сваіх мэтах.

**3. Улада дэмасу ў Афінах.** Менавіта грэчаскі флот забяспечыў перамогу пры Саламіне. Ад марской магутнасці залежала плаванне на морах, дзе раней уладарыла Персія. Таму Фемістокл вырашыў умацаваць флот. Для гэтага ён прыцягнуў да службы на флоце маламаёмасных грамадзян, якія былі выхадцамі з дэмасу. Тым самым дэмас дабіўся пашырэння сваіх правоў. Справу Фемістокла



Правообладатель Народная асвета



Перыкл

працягваў стратэг Перыкл. Па яго прапанове нават грамадзяне-беднякі атрымалі права займаць усе высокія пасады. Сыны загінуўшых на вайне выхоўваліся за кошт дзяржавы да 18 гадоў, а затым ім бясплатна выдавалі зброю. З 18 гадоў афінскія юнакі праходзілі абавязковую ваенную падрыхтоўку на працягу двух гадоў. Пасля гэтага яны станавіліся паўнапраўнымі грамадзянамі.

Дэмас складаў большасць Народнага сходу, які ажыццяўляў вярхоўную ўладу: ён выбіраў Савет 500, военачальнікаў, вырашаў пытанні вайны і міру. На Народным сходзе абмяркоўваліся і прымаліся законы.

**4. Асноўныя рысы афінскай рабаўладальніцкай дэмакратыі.** Афінскія грамадзяне мелі выключнае права валодаць зямлёй, домам, памяшканнем для майстэрні. Такая ўласнасць належала ўсёй абшчыне грамадзян. Афінянін не меў права прадаць зямлю жыхару другога поліса. Толькі грамадзянін мог купіць зямлю ў Афінах.



Фукідзід

Афіны былі зацікаўлены ў працы тых высокапрафесіянальных і таленавітых людзей, якія не былі грамадзянамі. Гэтыя людзі надзяляліся правамі метэкаў, г. зн. маглі валодаць рабамі, займацца гандлем і рамяством. Метэкі плацілі падушны падатак, служылі ў апалчэнні, але не мелі правоў, якія былі ў афінскіх грамадзян.

Перыкл зрабіў больш жорсткім доступ у склад афінскіх грамадзян. Ён правёў закон, па якім грамадзянінам лічыўся толькі той, у каго бацька і маці былі афінянамі. Пяць тысяч чалавек было асуджана на продаж у рабства за незаконнае прысваенне грамадзянскіх правоў.



Правообладатель Народная асвета

Вызначэнне дэмакратыі пры Перыкле даў старажытнагрэчаскі гісторык Фукідзід. «Наш дзяржаўны лад называецца дэмакратычным, паколькі ён будуецца не на меншасці, а на большасці грамадзян», г. зн. абараняе інтарэсы большасці.

*Такім чынам, саюз грэчаскіх полісаў забяспечыў перамогу над Персіяй, уласную свабоду і росквіт. Афіны ператварыліся ў агульнапрызнаны цэнтр элінскага свету. Роля афінскага дэмасу ў перамозе прывяла да пашырэння яго дэмакратычных правоў. Дэмас складаў большасць Народнага сходу, якому належала вышэйшая ўлада ў Афінах.*

1. Якія падзеі адбыліся пасля адмаўлення Афін і Спарты падпарадкавацца і выканаць патрабаванні персаў даць «зямлі і вады»? Дайце ацэнку ўчынкам спартанцаў і афінян.
2. Назавіце асноўныя рысы афінскай рабаўладальніцкай дэмакратыі. Якія былі яе недахопы?
3. Растлумачце, чаму Перыкл быў знакамітым правадыром афінскага дэмасу.
4. Якая існуе сувязь паміж законамі Салона і праўленнем Перыкла?
5*. Хто ў часы Перыкла лічыўся афінскім грамадзянінам? Пералічыце правы і абавязкі афінскіх грамадзян.
6. Вызначце галоўныя прычыны перамогі невялікіх грэчаскіх дзяржаў над найвялікшай Персідскай дзяржавай.

## Для дапытлівых

**Бітва пры Саламіне** (З трагедыі Эсхіла «Персы»)

Увесь флот спяшаўся, і чуцен у той жа час
Быў моцны крык: «Сыны Элады, уперад!
Ратуйце радзіму, ратуйце жонак,
Дзяцей сваіх, багоў бацькоўскіх храмы,
Грабніцы продкаў: бой цяпер — за ўсё!»

**Пытанні да дакумента.** Як аўтар тэксту адносіцца да бітвы? На чыім ён баку?



Правообладатель Народная асвета

# § 10. Пелапанеская вайна і заняпад Афін

**Успомніце.** 1. Што дапамагло невялікім грэчаскім дзяржавам атрымаць перамогу над Персіяй? 2. Каму належала вышэйшая ўлада ў Афінах?

**1. Рост варожасці паміж Афінамі і Спартай.** Пасля перамогі над персамі вядучымі полісамі Грэцыі сталі Афіны і Спарта. У Спарце вышэйшая ўлада належала пяці *эфорам*. Яны штогод выбіраліся з ліку ўсіх грамадзян. Спартанцы, у адрозненне ад афінян, не ўмешваліся ва ўнутраныя справы сваіх саюзнікаў. Паступова ўсе полісы Грэцыі раздзяліліся на прыхільнікаў Спарты або Афін. Паміж дзвюма дзяржавамі і іх саюзнікамі пачалася барацьба за панаванне ў Грэцыі.

**2. Ваенныя дзеянні.** У **431 годзе да н. э.** Спарта і яе саюзнікі асадзілі Афіны, спалілі і аліўкавыя гаі. Насельніцтва схавалася за сценамі. Ад скучанасці і бруду людзі пачалі хварэць на чуму або тыф. Памёр кожны чацвёрты воін. Афінскі флот, у сваю чаргу, спусташаў узбярэжныя паселішчы Пелапанеса. Хутка Афіны запрасілі міру, але Спарта працягвала вайну, якая доўжылася да **404 года да н. э.**



Афінскі воін



Афінскі ваенны карабель.
*Сучасны малюнак*

У гэты час многія гарады пачалі выходзіць з Афінскага саюза. Для яго захавання Афіны прынялі жорсткія меры. Так, напрыклад, у горадзе *Мітылены* на востраве Лесбас былі пакараны смерцю 1000 мужчын, якія паўсталі. Нянавісць саюзнікаў да Афін узрастала, што яшчэ больш аслабляла Афіны.

Афіны накіравалі вялікі флот на заваяванне вострава *Сіцыліі*, населенага грэкамі. Сіцылійцы разбілі афінян і многіх узялі ў палон. Палонных



Правообладатель Народная асвета

утрымлівалі ў каменяломнях. Ад рабства вызвалялі толькі тых, хто ведаў вершы *Эўрыпіда, Эсхіла, Сафокла*.

Між тым у Афінах з'явіліся здраднікі. Уцёк у Спарту адзін з военачальнікаў. Па яго парадзе спартанцы захапілі мястэчка Дэкелею ў Атыцы і ператварылі яго ва ўмацаваны лагер. Дваццаць тысяч афінскіх рабоў перабеглі да ворага.

У **405 годзе да н. э.** спартанцы разбілі афінскі флот пры *Эгаспатамах* («Казіных рэчках»). У 404 г. да н. э. афінскія алігархі — праціўнікі дэмакратыі — здзейснілі дзяржаўны пераварот. Яны пазбавілі грамадзянскіх правоў большую частку афінян і запрасілі ў Афіны атрад спартанскіх воінаў. Такім чынам, яны здрадзілі айчыне. Было пакарана смерцю 1500 чалавек, пераважна багатых грамадзян і метэкаў. Маёмасць забітых алігархі прысвоілі сабе і выкарысталі для ўтрымання спартанскіх салдат. Дэмакратыя ў Афінах замянілася алігархіяй.

Такім чынам, ваенныя дзеянні працягваліся 27 гадоў. У выніку афінскія саюзнікі атрымалі незалежнасць ад Афін, але сталі даннікамі Спарты. Спарта захавала свабоду Афінам, якія перасталі прэтэндаваць на лідарства ў Эладзе.

У 403 годзе да н. э. пасля адыходу спартанцаў з Афін жыхары горада аднавілі дэмакратычны лад.



Рабская праца на сярэбраных рудніках.
*Сучасны малюнак*



Правообладатель Народная асвета

**3. Разарэнне грамадзян.** У Пелапанескай вайне загінула большая частка воінаў. Гаспадарка свабодных земляробаў і рамеснікаў заставалася без карміцеляў і разбуралася. У багачоў з'явілася шмат рабоў. Рабы працавалі ў майстэрнях пад кантролем рабоў-наглядчыкаў. У такіх майстэрнях выраблялася больш рэчаў, чым у майстэрнях, дзе працавалі самі майстры, якія мелі толькі аднаго-двух рабоў. Гаспадары былі і выканаўцамі і наглядчыкамі. Гэта прывяло да таго, што рабаўладальнікі маглі прадаваць свае вырабы танней, чым рамеснікі. Паступова гаспадарка дробных рамеснікаў прыйшла ў заняпад.

Рабская праца на карысць багатых рабіла бедных гараджан яшчэ больш беднымі. Няроўнасць паміж тымі і другімі пашыралася. Узрастала пагроза грамадзянскіх войнаў.

*Такім чынам, вынікі Пелапанескай вайны былі згубнымі для ўсёй Грэцыі. Ні Афіны, ні Спарта, ні іншыя полісы не маглі дасягнуць былой магутнасці. Гэта і выкарыстала Македонскае царства, якое хутка расло.*

1. Як называліся пяць вярхоўных правіцеляў у Спарце? Знайдзіце значэнне гэтага паняцця ў слоўніку.
2. Чаму пачалі варагаваць паміж сабой грэчаскія гарады-дзяржавы? Пакажыце на карце галоўныя з іх — Афіны і Спарту.
3. Раскажыце аб ваенных дзеяннях паміж Спартай і Афінамі. Колькі гадоў працягвалася вайна? Ці можна яе назваць братазабойчай?
4. Растлумачце, чаму ў канцы V стагоддзя да н. э. гаспадаркі свабодных землеўладальнікаў і дробных рамеснікаў прыйшлі ў заняпад.
5. Устанавіце сувязь паміж Пелапанескай вайной і заняпадам Грэцыі.

6*. Дайце ацэнку вынікам Пелапанескай вайны.

## Для дапытлівых

**Жорсткасці Пелапанескай вайны** (Паводле Фукідзіда)

Падчас Пелапанескай вайны спартанцы ўзялі аблогай саюзныя Афінам маленькія Платэі. Яны ўчынілі суд, задаючы кожнаму ваеннапалоннаму адно пытанне: «Ці аказаў ты паслугу Спарце і яе саюз-



Правообладатель Народная асвета

нікам?» Адказ быў вядомы. Тыя, хто ваяваў на баку афінян, не маглі аказаць такую паслугу. Так спартанцы пакаралі смерцю 200 платэян і 25 афінян. Платэйскія жанчыны сталі рабынямі. У ходзе Пелапанескай вайны грэкі таксама часта пераводзіліся ў рабоў.

**Пытанні да дакумента.** Што адбывалася ў ходзе Пелапанескай вайны?

### Пошукі міру

У 1955 годзе Арганізацыя Аб'яднаных Нацый адзначыла 2400-годдзе з дня нараджэння знакамітага старажытнагрэчаскага паэта Арыстафана.

У камедыі «Мір» аўтар высмеяў палкаводцаў Спарты і Афін, якія скінулі багіню міру ў бездань. Яе вызваліў земляроб. Наступіў доўгачаканы для ўсіх простых людзей мір.

**Пытанні да дакумента.** Чаму радаваліся простыя людзі?

## § 11. Дзяржава Аляксандра Македонскага

**Успомніце.** Чым закончылася Пелапанеская вайна?

**1. Барацьба грэчаскіх полісаў з Македоніяй.** Хутка ўзвышалася *Македонія*, якая знаходзілася на поўначы Балканскага паўвострава. Энергічны цар ***Філіп II*** падпарадкаваў сабе родавую македонскую знаць, якая раней займалася вайной і паляваннем. Свабодных земляробаў ён ператварыў у асноўную сілу арміі. Філіп II запазычыў у грэкаў фалангу. Уперад высоўваліся коп'і даўжынёй больш чым пяць метраў. Лёгкаўзброеныя воіны пачыналі бой і потым адступалі. Па краях фалангу ахоўвала конніца.

У 355 годзе да н. э. грэчаскі поліс Факіда захапіў участак зямлі і скарбы Дэльфійскага храма. Фівы, не жадаючы ўзмацнення суседа, аб'явілі Факідзе вайну і папрасілі дапамогі ў Філіпа. Факідзян падтрымалі Спарта і Афіны. Вайна атрымала назву «свяшчэннай». Філіп абвясціў сябе абаронцам агульнагрэчаскага цэнтра рэлігійнага



Правообладатель Народная асвета

жыцця. Ён разбіў факідзян, утапіў тры тысячы палонных. Толькі пасля гэтага грэкі зразумелі, што Філіп намерваўся падпарадкаваць усю Грэцыю, і вырашылі даць адпор.

У **338 годзе да н. э.** пры *Херанеі* адбылася рашаючая бітва. Грэкі панеслі цяжкае паражэнне. Але Філіп не знішчыў полісы, а склікаў агульнагрэчаскі сход і абвясціў *Элінскі саюз* гарадоў. Ён забараніў войны паміж полісамі. Сход аб'явіў свяшчэнную вайну Персіі. Аднак Філіп быў забіты ў самой Македоніі. Царом стаў яго 20-гадовы сын ***Аляксандр***.



Аляксандр Македонскі ў баі. *Фрагмент старажытнай мазаікі*



Манета з выявай Аляксандра Македонскага

**2. Заваяванні Аляксандра Македонскага.** У **334 годзе да н. э.** аб'яднанае грэка-македонскае войска пад кіраўніцтвам Аляксандра разбіла персаў на рацэ *Гранік*. Пачаліся паходы па ўладаннях Персіі. Аляксандр атрымаў яшчэ адну перамогу ў бітве на поўначы Сірыі, захапіў у палон маці, жонку і дзвюх дачок персідскага цара Дарыя III, а потым — абоз з яго казной і скарбамі. Частка гарадоў Сірыі здалася добраахвотна.

Затым Аляксандр падпарадкаваў Фінікію і яе горад Цір, размешчаны на скалістым востраве. Паслы Ціра прапанавалі заваёўнікам дары, але адмовіліся ўпусціць войскі. Македонцы пабудавалі дамбу даўжынёй 800 метраў ад берага да вострава. Пачаўся агульны штурм. 8 тысяч абаронцаў былі забіты, 30 тысяч чалавек былі прададзены ў рабства. Аляксандр падпарадкаваў Егіпет без бітваў. Егіпецкія жрацы віталі цара як вызваліцеля



Правообладатель Народная асвета




Заваявальныя паходы войскаў Аляксандра Македонскага

ад персідскага ярма. Яны ўсклалі на яго галаву двайную карону фараона і абʼявілі сынам бога Амона.

Пакуль Аляксандр знаходзіўся ў Егіпце, Дарый сабраў новую армію, узмацніў яе баявымі сланамі і калясніцамі з вострымі сярпамі. Але ў бітве пры *Гаўгамелах* у 331 годзе да н. э. ён пацярпеў знішчальнае паражэнне. Дарый III, які ўцякаў, быў забіты сваімі прыбліжанымі. Пасля гэтага Аляксандр рушыў у Сярэднюю Азію. Перайшоўшы раку Амударʼю, заваёўнік уступіў у *Сагдыяну*. Тут таленавіты палкаводзец *Спітамен* арганізаваў партызанскую вайну супраць іншаземцаў. Аляксандр загадаў паліць вёскі, забіваць усіх дарослых, астатніх ператвараць у рабоў.

Пасля разбурэння Сагдыяны заваёўнікі рушылі ў Індыю, частку якой захапілі з вялікімі стратамі. Воіны адмовіліся працягваць паход. Дасягнуўшы Аравійскага мора, Аляксандр вырашыў павярнуць армію і вярнуцца ў сваю новую сталіцу — Вавілон — па сушы



Правообладатель Народная асвета



Аляксандр і Дарый III у бітве пры Гаўгамелах.
*Старажытная мазаіка*

і па моры. Ад смагі, голаду і стомленасці загінула тры чвэрці воінаў. Ахвярамі перамог аказаліся салдаты.

**3. Дзяржава Аляксандра і яе распад.** З Вавілона Аляксандр кіраваў вялікай дзяржавай. Новы цар ураўнаваў у правах персаў з македонцамі і тым самым выклікаў незадаволенасць сваіх воінаў. Улада мясцовых правіцеляў — сатрапаў — захавалася, але пад кантролем македонскіх военачальнікаў. У гэты час грэчаскія жрацы ўключылі Аляксандра ў пантэон алімпійскіх багоў.

У **323 годзе да н. э.** вялікі палкаводзец памёр. Цела цара яшчэ не пахавалі, а палкаводцы пачалі ваяваць за ўладу. У выніку дзяржава Аляксандра распалася. Выдзеліліся вялікія самастойныя царствы: Македонскае, Егіпецкае, Сірыйскае.

*Такім чынам, македонскі цар Філіп II заваяваў усю Грэцыю. Македонскія цары аб'ядналі грэкаў у барацьбе супраць іх пастаяннага ворага — Персіі. Але і дзяржава цара Аляксандра, створаная ў выніку войнаў, распалася.*

1. Якая дзяржава на поўначы Грэцыі ўзвысілася пад кіраўніцтвам Філіпа II? Пакажыце яе тэрыторыю на карце.
2. Хто і як забяспечыў Філіпу II умяшанне ў справы грэчаскіх полісаў?



Правообладатель Народная асвета

3. Якім чынам Аляксандр Македонскі стварыў вялікую дзяржаву?
4. Выкажыце свае адносіны да вайны Спітамена супраць Аляксандра.
5. Прасачыце па карце шлях заваявальных паходаў Аляксандра Македонскага. Растлумачце, чаму яго дзяржава распалася.
6*. Ці згодны вы з думкай, што ў выніку бітвы пры Херанеі «была закапана свабода грэкаў»?

## Для дапытлівых

### Аляксандр Македонскі і Дыяген

Перад тым як ісці вайной на персаў, Аляксандр накіраваўся да знакамітага мудраца Дыягена. У гэты час той спакойна ляжаў і грэўся на сонцы. Злёгку прыўзняўшыся, калі ўбачыў многа людзей, Дыяген уважліва паглядзеў на Аляксандра. Павітаўшыся, цар запытаў Дыягена, ці няма ў яго якой-небудзь просьбы. «Адступіся крыху ўбок, — сказаў той, — не засланяй мне сонца!» Словы Дыягена вельмі здзівілі цара. Ён быў уражаны гордасцю і веліччу гэтага чалавека. Вярнуўшыся, цар сказаў сваім спадарожнікам: «Калі б я не быў Аляксандрам, я хацеў бы стаць Дыягенам».

**Пытанні да дакумента.** Чым павучальная сустрэча цара з мудрацом?

### Гордзіеў вузел

У крэпасці горада Гардзіёна ў Фрыгіі знаходзілася баявая калясніца легендарнага цара Гордзія. Ярмо і дышаль калясніцы былі злучаны рэменем, завязаным складаным заблытаным вузлом. У легендзе гаварылася: хто зможа развязаць вузел, стане валадаром Азіі. Аляксандр вырашыў выпрабаваць лёс, але вузел не паддаваўся. Тады ён выхапіў меч і адным ударам рассек яго. Выраз «рассячы гордзіеў вузел», г. зн. сілай вырашыць складаную праблему, стаў ходзячай назвай.

**Пытанні да дакумента.** Якія рысы характару Аляксандра Македонскага адлюстроўвае легенда?



Правообладатель Народная асвета

# § 12. Школа, навуковыя веды і рэлігія

**Успомніце.** Якія народы першымі вынайшлі пісьменнасць?

**1. Пісьменнасць і школа.** Дасягненні грэчаскіх полісаў у земляробстве, жывёлагадоўлі, рамястве і гандлі стварылі ўмовы для развіцця культуры. Грэкі прыдумалі знакі для абазначэння галосных гукаў у фінікійскім алфавіце. Яны назвалі літарамі тое, што ў фінікійцаў абазначала прадметы: «альфа» — алеф («бык»), «бэта» — бэт («дом»), «дэльта» — далет («дзверы»). У беларускай і рускай мовах гэта літары: *а, б, д* і гэтак далей. Пераστаўляючы месцамі 24 літары свайго алфавіта, грэкі запісалі каля 70 тысяч слоў у розных галінах ведаў.



Афінская школа. *Старажытнагрэчаскі рэльеф*

Выкарыстанне рабскай працы давала грамадзянам вольны час для заняткаў мастацтвам, навукай, для навучання ў школе. Нездарма грэчаскае слова «схоле» мае значэнне «вольны час» (не толькі «разумовыя заняткі»). Пазней слова «схоле» стала ўжывацца ў сучасным значэнні — «школа».



У старажытнагрэчаскай школе. *Сучасны малюнак*

Хлопчыкі з сямі гадоў навучаліся ў школе, дзяўчынкі — дома, у асноўным рукадзеллю і дамаводству. Вучыліся пісаць на дошчачках, пакрытых воскам. Металічная палачка з вострым і тупым канцамі, якой саскрабалі літары, называлася *стылем*. Дзеці рамеснікаў і сялян маглі навучыцца чытаць і пісаць. Дзеці багатых працягвалі навучанне ў гімназіях, слухалі лекцыі вучоных, аратараў, якія ўмелі правільна і пры-



Правообладатель Народная асвета

гожа гаварыць. Хто меў сродкі і час, вучыліся спяваць, іграць на ліры, танцаваць. Многія грэкі ведалі на памяць знакамітыя паэмы Гамера «Іліяда» і «Адысея». Вялікае значэнне надавалася фізічнаму выхаванню, і для гэтага ствараліся спецыяльныя школы — *палестры*.

**2. Навуковыя веды.** Захаваўся зборнік 58 медыцынскіх твораў, якія належалі ці былі прыпісаны вядомаму ўрачу ***Гіпакрату***. Назвы многіх твораў, у прыватнасці «Аб паветры, вадзе і мясцовасці», «Аб прыродзе чалавека» сведчаць аб тым, што старажытныя грэкі перасталі тлумачыць стан здароўя чалавека ўмяшаннем непрыродных сіл. Гіпакрат вучыў, што трэба аднавіць сілы самога чалавека, яго арганізма для вылячэння. Урачы раілі прытрымлівацца дыеты ў харчаванні, прымянялі лячэбную гімнастыку. *Клятва Гіпакрата* і зараз лічыцца асновай паводзін урача.



Гіпакрат

Знакамітым вучоным быў ***Дэмакрыт***. Ён доўга жыў у Егіпце, Вавілоне, знаёмячыся з навуковымі дасягненнямі Усходу. Талент Дэмакрыта раскрыўся ў Афінах. Дэмакрыт сцвярджаў, што ўсё жывое выйшла з «вады і гразі». Спачатку на зямлі з'явіліся жывёлы, а потым — людзі. Яны змаглі выжыць, абапіраючыся на свае сілы і вопыт. Гэтая думка супярэчыла міфам, згодна з якімі людзей усяму навучыў тытан *Праметэй*.

Вядомы старажытнагрэчаскі філосаф ***Сакрат*** вучыў, што сэнс жыцця і прызначэнне чалавека — рабіць дабро.


Сакрат



Правообладатель Народная асвета

Грэкі з'яўляюцца стваральнікамі геаграфіі. У гамераўскі час яны лічылі зямлю круглым дыскам сярод акіяна. Ім былі вядомы землі ад усходняга ўзбярэжжа Чорнага мора да Атлантычнага акіяна. Але ўжо ***Парменід*** лічыў Зямлю шарам. ***Эратасфен***, які быў загадчыкам Александрыйскай бібліятэкі, дастаткова дакладна падлічыў даўжыню акружнасці зямнога шара.

**3. Рэлігійныя святы.** У VI—V стагоддзях да н. э. змяніліся ўяўленні грэкаў аб багах. Цяпер багі не толькі сімвалізавалі сілы прыроды, але і атрымалі здольнасць аказваць заступніцтва полісам і яго грамадзянам. Раней Зеўс лічыўся падаўцом дажджу і навальніцы, а цяпер ён стаў ахоўнікам прыватнай уласнасці.

У гэты час усенародным і дзяржаўным святам сталі *Панафінеі* ў гонар багіні Афіны. Асабліва старанна да гэтага свята рыхтаваліся жыхары Афін. Задоўга да яго пачатку афінскія дзяўчаты ткалі адзенне для статуі Афіны. Паводле ўяўлення грэкаў, багіня жыла ў храме *Парфенон*, куды мелі права заходзіць толькі жрацы.

Свята адкрывалася факельным шэсцем, музычнымі і танцавальнымі спаборніцтвамі. Цэнтральным эпізодам свята з'яўлялася ахвярапрынашэнне жывёл. Яно праводзілася каля ахвярніка — вялікай мармуровай пліты, размешчанай перад храмам. Вантробы жывёлы даследаваліся, каб вызначыць, як адносіцца да ахвяры і, такім чынам, да людзей бажаство. Усё астатняе размяркоўвалася паміж грамадзянамі. Завяршалі свята музычныя, атлетычныя, конныя спаборніцтвы. У лістападзе — снежні афіняне святкавалі *Дыянісіі*, пакланяючыся богу Дыянісу. Рэлігійныя святы выхоўвалі ў грамадзян патрыятычныя пачуцці.

*Такім чынам, у Старажытнай Грэцыі вялікая ўвага надавалася школе і навуковым ведам. Яны служылі выхаванню патрыятызму грамадзян, умацаванню здароўя, распаўсюджанню пісьменнасці.*



Правообладатель Народная асвета

1. Як грэкі ўдасканалілі фінікійскі алфавіт?
2. Ці ўсім дзецям была даступна грэчаская школа? Што ў ёй можна было вывучаць?
3. Хто яны: Гіпакрат, Дэмакрыт, Парменід, Эратасфен? Якія ідэі і адкрыцці, выказаныя і даследаваныя імі, з'яўляюцца значнымі і сёння?
4. Як змяніліся ўяўленні грэкаў аб заступніцтве багоў у VI—V стагоддзях да н. э.?
5. Апішыце рэлігійныя святы і падумайце, у чым іх асноўнае значэнне.

6*. «Не гавары шмат: жыццё кароткае» — так лічылі грэкі, паважаючы бога часу Хронаса. А як лічыце вы?

## § 13. Старажытнагрэчаскае мастацтва

**Успомніце.** 1. Вядомыя вам віды мастацтва. 2. Якую ролю ў жыцці чалавека адыгрывае мастацтва?

**1. Грэчаская архітэктура.** Самае дзіўнае ў грэчаскай архітэктуры — гэта ***храм***. Яго лічылі жыллём бога. Стваральнікі храма ў першую чаргу клапаціліся аб знешнім выглядзе збудавання. Галоўнае ў яго архітэктуры — калоны. Іх верхняя частка называецца *капітэллю*.



Капітэлі дарычнага, іанічнага, карынфскага храмаў

Магутныя ствалы калон *дарычнага* храма мелі капітэлі без упрыгожанняў. *Іанічны* храм быў лёгкім і прыгожым. Капітэлі яго калон завяршаліся завіткамі. Дарычны храм стаў сімвалам мужнасці і сілы, а іанічны — жаноцкасці і зграбнасці. Найбольш гарманічны і ўрачысты *карынфскі* храм. Яго капітэлі нагадвалі кашолку з кветкамі. Ва ўсіх збудаваннях калоны разам з перакрыццем складалі галерэю, якая называлася *порцікам*. Ён укрываў людзей ад гарачыні або дрэннага надвор'я, а таксама быў месцам выставак работ мастакоў і скульптараў.



Правообладатель Народная асвета



Парфенон. *Сучасны выгляд*

Вяршыня грэчаскай архітэктуры – храм Парфенон. Ён размяшчаўся на Акропалі — умацаванай частцы Афін. Храм быў пабудаваны ў гонар багіні Афіны пасля перамогі над персамі. Тут захоўвалася дзяржаўная казна. Акрапаль стаў цэнтрам грамадскага і рэлігійнага жыцця. Сюды падчас свят сыходзілася мноства народу. Акрамя Парфенона, на Акропалі знаходзіліся і іншыя выдатныя архітэктурныя збудаванні. Другім па значнасці храмам быў Эрэхтэён. Адзін з яго порцікаў падтрымліваўся не звычайнымі каланамі, а *карыятыдамі* — скульптурнымі фігурамі жанчын. Здаецца, што яны лёгка і грацыёзна нясуць свой звыклы груз. Аб грэчаскай архітэктуры нашы сучаснікі кажуць, што «сапраўдная архітэктура прыгожая нават у руінах».



Карыятыды на старажытнагрэчаскім храме

**2. Скульптура і кераміка.** Галоўным упрыгожаннем храмаў сталі скульптуры. У іх адлюстравалася агульнае ўяўленне грэкаў аб багах, героях і людзях. Грэкі лічылі важным у скульптуры захаванне прапорцый частак цела. Па такіх правілах скульптар



Правообладатель Народная асвета

***Паліклет*** стварыў статую *Кап'яносец*. З цягам часу скульптары навучыліся выражаць рух, сілу і прыгажосць чалавечага цела. Самым знакамітым прыкладам такога роду стаў *Дыскабол* ***Мірана***. Гэта скульптура атлета, які кідае дыск.



Міран. Дыскабол

У спіс цудаў свету ўваходзіць статуя Зеўса ў Алімпіі. Скульптуру вырабілі з дрэва і слановай косці. Затым яе пакрылі залатымі пласцінамі. Такім жа спосабам стварылі статую багіні Афіны. Яна стала сімвалам велічы горада. Аўтарам гэтых твораў мастацтва быў знакаміты скульптар ***Фідзій***. Аднойчы яго абвінавацілі ў крадзяжы золата, выдзеленага на стварэнне статуі Афіны. Такую магчымасць ён прадбачыў загадзя. Таму пласціны металу зрабілі на статуі здымнымі. Золата ўзважылі, вага аказалася такой жа, якой і была, і Фідзія суд апраўдаў.



Фідзій.
Статуя Афіны.
*Старажытная копія*

У скульптурах ***Праксіцеля*** галоўнае — пачуццё асалоды ад спакою і пяшчоты. А погляды багоў і герояў летуценныя і задуменныя. Такая скульптура Гермеса з дзіцём Дыёнісам.

Сапраўднымі творамі мастацтва з'яўляліся вырабы з керамікі. Найбольш распаўсюджанымі з іх былі піфасы і амфары. Яны прызначаліся для захавання і перавозкі алею, віна і іншых прадуктаў. Вырабы з керамікі расфарбоўвалі, лакіравалі, наносілі на іх мудрагелістыя ўзоры, выявы людзей, сцэны з міфаў. Мастацкія вырабы майстроў керамікі сталі вядомы ўсяму свету.

**3. Жывапіс.** Жывапіс грэкі цанілі не менш, чым архітэктуру або скульптуру. Расказваюць, што аднойчы лідзійскі цар заплаціў столькі золата за карціну, колькі яна важыла. Знакаміты мастак *Палігнот* напісаў карціну *«Разбурэнне Троі»*, дзе былі паказаны ўдзельнікі



Правообладатель Народная асвета

падзей. Ён падараваў свае карціны Афінам, а яны яму — права грамадзянства. Мастак *Зеўксіс* быў настолькі багатым, што карціны раздаваў бясплатна. Ён лічыў, што ніякая цана за яго тварэнні не будзе дастатковай.

*Такім чынам, майстры старажытнагрэчаскага мастацтва вучыліся ў прыроды і пераймалі яе. Грэчаскія храмы былі невялікія, але вялікасныя. А ў скульптуры і жывапісе адлюстраваліся ідэальныя ўяўленні аб чалавеку, аб адзінстве багоў і людзей. Грэчаскае мастацтва вучыла разумець прыгожае і здзяйсняць высакародныя ўчынкі.*

**1.** Апішыце словамі грэчаскі храм, выкарыстоўваючы пры гэтым словы: *калоны, капітэль, карыятыды*. Пакажыце адрозненні дарычнага, іанічнага і карынфскага храмаў.
**2.** Якую ролю ў жыцці грэкаў адыгрываў Парфенон? Дзе ён размяшчаўся?
**3.** Што новае ўнеслі грэкі ў развіццё скульптуры? Які скульптурны твор уваходзіць у спіс цудаў свету? Хто яго аўтар?
**4.** У чым заключалася карысць і прыгажосць грэчаскіх вырабаў з керамікі?
**5*.** Абмяркуйце, у чым была сіла старажытнагрэчаскага мастацтва.



Статуя Зеўса работы Фідзія. *Рэканструкцыя*

## Для дапытлівых

**Апісанне статуі Зеўса** (Паводле старажытнагрэчаскага аўтара Паўсанія)

Бог сядзіць на троне; яго фігура зроблена з золата і слановай косці... У правай руцэ ён трымае Ніку (Перамогу), таксама зробленую з золата і слановай косці, на ёй павязка і вянок на галаве. У левай руцэ бога скіпетр, прыгожа расквечаны рознымі металамі, а птушка, якая сядзіць на скіпетры, — гэта арол.

**Пытанні да дакумента.** Што абазначаюць сімвалы ў Зеўса: Ніка, скіпетр, арол?



Правообладатель Народная асвета

# § 14. Старажытнагрэчаскі тэатр і святы

**Успомніце.** Сучасныя відовішчы, на якіх вам удалося пабываць.

**1. Тэатр.** Грэкі вельмі любілі ўсякія відовішчы: тэатр, рэлігійныя святкаванні, гульні. На іх яны весяліліся, удзельнічалі ва ўрачыстасцях і спартыўных спаборніцтвах. Адным з папулярных відовішчаў быў тэатр. Яго наведвалі як знаць, так і простыя земляробы і рамеснікі.

Тэатр размяшчаўся пад адкрытым небам каля падножжа гары. Былі месцы для гледачоў, пляцоўка для артыстаў, якія выступалі. Побач знаходзіліся пабудовы для дэкарацый. Па літаратурных творах ставіліся спектаклі. Аўтары, чые пастаноўкі спектакляў гледачы лічылі лепшымі, узнагароджваліся прызамі. Беднякам раздавалі спецыяльныя білеты або грошы для наведвання тэатра.

Тэатр адукоўваў і выхоўваў чалавека. Са сцэны гучалі словы шырока вядомых тады літаратурных твораў — ***трагéдый***. Яны застаўлялі задумацца над галоўнымі пытаннямі жыцця: што ёсць бог, чалавек, лёс? Людзям унушалася думка, што фанабэрыстасць



Старажытнагрэчаскі тэатр у Эпідаўры. *Сучасны выгляд*



Правообладатель Народная асвета

і гордасць абавязкова будуць пакараны. Найбольш знакамітыя драматургі таго часу — Эсхіл, Сафокл і Эўрыпід.

У трагедыях ***Эсхіла*** самы знакаміты герой — Праметэй. Гэта ён навучыў людзей жывёлагадоўлі і мараплаванню, будаўніцтву і лячэнню, а галоўнае, навучыў карыстацца агнём. Яшчэ ў старажытнасці аб Праметэі гаварылі, што ён, вылепіўшы чалавека, павесіў яму на плечы дзве торбы. Адна з іх з чужымі заганамі, а другая — з уласнымі. Першая вісела спераду, а другая — за спінай. Так і атрымалася, што чужыя заганы людзям адразу кідаюцца ў вочы, а ўласныя яны не заўважаюць. Эсхіл марыў аб згодзе, якая павінна быць у свеце багоў і людзей. Для Эсхіла галоўнае: «Хачу, каб злое не глушыла добрае».



Сафокл

***Сафокл*** праслаўляў магутнасць і розум чалавека. Горда гучаць словы яго трагедыі са сцэны: «Шмат ёсць цудаў на свеце, чалавек за ўсе іх цудоўней». А чым каштоўны сам чалавек? «Розумам», — адказаў знакаміты драматург. Сафокл стварыў вобразы ідэальных людзей, яго цікавіла, якім павінен быць чалавек.



Эўрыпід з маскай акцёра грэчаскага тэатра

***Эўрыпід*** паказваў людзей такімі, якімі яны ёсць на самай справе. Ён асуджаў вайну і заклікаў усіх да згоды. Эўрыпід выступаў супраць рабства. Па яго меркаванні, людзі становяцца рабамі не па паходжанні, а ў сілу абставін. Эўрыпіда хвалюе няшчасце, слабасць і адзінота чалавека. Ён гаварыў аб прыродзе багоў і лёсе чалавека, ролі жанчыны і несправядлівасці рабскай долі.

Акрамя трагедый, на сцэне тэатра ставіліся ***камéдыі***. Самым знакамітым складальнікам камедый быў ***Арыстафан***. Ён вы-



Правообладатель Народная асвета

смейваў чалавечыя глупства і лжывасць, прагу да нажывы. Яго смех быў сатырычным, выкрывальным, але вясёлым. Аўтар расказвае аб бедствах вайны, беднасці народа, ілжывых палітыках, багачах і спекулянтах. Смех Арыстафана вяртаў чалавека да здаровага сэнсу. Таму аўтара камедый лічылі ўрачом і выхавацелем афінскага грамадства.



Бегуны.
*Выява на старажытнагрэчаскай вазе*

**2. Алімпійскія гульні.** Пачатак Алімпійскіх гульняў адносіцца да **776 года да н. э.** Паводле падання, яны былі заснаваны Гераклам у гонар бога Зеўса. Гульні праходзілі праз кожныя чатыры гады. Свята несла ўсім людзям мір і радасны настрой. Аб'яўленне гульняў азначала спыненне ваенных дзеянняў. Хто парушаў грамадскі парадак, падвяргаўся пракляццю багоў і пакаранню.

Свята — гэта, у першую чаргу, вялікі наплыў народу. Усе імкнуліся прыняць удзел у цікавым кірмашы. Тут можна было пачуць выступленні аратараў, паэтаў і філосафаў. Галоўнае ў Алімпійскіх гульнях — спартыўныя спаборніцтвы. Да ўдзелу ў іх дапускаліся толькі свабодныя людзі. Самымі папулярнымі відамі спаборніцтваў былі бег, скачкі, кіданне дыска і кап'я, барацьба. Пераможцаў узнагароджвалі вянкамі з галін масліны. Затым праводзілі ўрачыстае шэсце і гатавалі багатую ежу. Выдатныя пераможцы атрымлівалі права на залатую статую ў свяшчэнным гаі, у іх гонар складаліся гімны.

*Тэатр і Алімпійскія гульні выхоўвалі людзей. Алімпійскія гульні і іншыя грэчаскія святы аб'ядноўвалі грэкаў і садзейнічалі развіццю элінскай культуры, мовы і традыцый.*

?

1. Назавіце любімыя відовішчы старажытных грэкаў.
2. Намалюйце або начарціце збудаванне старажытнагрэчаскага тэатра. Чым яно адрозніваецца ад сучаснага?



Правообладатель Народная асвета

3. Хто з элінаў напісаў знакамітыя трагедыі і камедыі? Падумайце, чаму грэкі называлі тэатр «школай для дарослых».
4. Калі адбыліся першыя Алімпійскія гульні? У гонар каго яны былі заснаваны? Колькі стагоддзяў аддзяляе іх ад нас? Колькі гадоў прайшло ад першых Алімпійскіх гульняў у Грэцыі да апошніх у наш час?
5*. Ад імя ўдзельніка або гледача складзіце паведамленне аб Алімпійскіх гульнях.

## Для дапытлівых

### Алімпійскія гульні

Згодна са «свяшчэнным перамір'ем», якое ўстанаўлівалася на час Алімпійскіх гульняў, войны спыняліся. Уся Элада аб'яўлялася недатыкальнай. Пад страхам праклящця і няміласці багоў ніхто не мог з'яўляцца ў Алімпіі са зброяй. Парушальнікаў каралі вялікім грашовым штрафам. Падчас перамір'я нават піраты і разбойнікі не нападалі на падарожных. На кароткі час свята ў Алімпіі аб'ядноўвала ўсіх грэкаў.

**Пытанні да дакумента.** Якое значэнне мелі Алімпійскія гульні для старажытных грэкаў? Чаму парушэнне «свяшчэннага перамір'я» не толькі асуджалася, але і каралася? *Ці змянілася сітуацыя ў наш час?

# § 15. Паўсядзённае жыццё грэкаў

**Успомніце.** Якімі правамі і абавязкамі валодалі грамадзяне грэчаскага поліса?

**1. Жыццё ў горадзе-полісе.** Вы ўжо ведаеце, што ў Старажытнай Грэцыі існавала мноства гарадоў-дзяржаў — полісаў. Усе хлопчыкі, якія нараджаліся ў сем'ях грамадзян, станавіліся грамадзянамі поліса. Грамадзянства давала чалавеку права валодаць маёмасцю, удзельнічаць у вырашэнні ўсіх праблем горада.

Важнейшыя дзяржаўныя пытанні грамадзяне пастаянна абмяркоўвалі і вырашалі сумесна. Для гэтага патрабавалася шмат часу праводзіць разам. Менавіта таму ў грэчаскіх гарадах былі спецыяль-



Правообладатель Народная асвета



Урачыстая працэсія на Афінскім Акропалі. *Сучасны малюнак*

ныя месцы, дзе грамадзяне маглі сустракацца. Сумесныя сустрэчы садзейнічалі згуртаванасці грамадзян, агульнасці іх інтарэсаў.

Самымі важнымі месцамі ў горадзе былі акропаль і агара. Тут размяшчаліся шматлікія вялікасныя грамадскія будынкі — храмы, тэатры і г. д. Іх наведвалі ўсе грамадзяне. Улады клапаціліся аб прыгажосці і пышнасці грамадскіх збудаванняў. Бо яны былі сімвалам магутнасці кожнага горада. Яркім прыкладам велічы Афін з'яўляецца Акропаль. Да гэтага часу ён узвышаецца над горадам, нагадваючы аб старажытных каранях еўрапейскай культуры.

**2. Жыллё і побыт.** Калі грамадскія будынкі былі адкрыты для ўсіх, то грэчаскі дом з'яўляўся замкнутым светам прыватнага жыцця. Жыллё ўяўляла сабой некалькі пабудоў, акружаных глухой сцяной. У цэнтры знаходзіўся ўнутраны двор, часта з басейнам. Вокны ніколі не выходзілі на вуліцу. У кожным доме ў спецыяльным памяшканні пастаянна гарэў у ачагу агонь. Ён быў прысвечаны багіні *Гестыі* — апякунцы дома і сямейнага шчасця.

Дамы будаваліся з каменю або з цэглы-сырцу. Ноччу дом асвятлялі невялікія гліняныя лямпы, а ў багатых — вялікія металічныя падстаўкі з алеем, які гарэў. Жылыя будынкі размяшчаліся скучана.



Правообладатель Народная асвета

Вуліцы былі вузкія, заблытаныя і без асвятлення. Багатыя людзі стараліся жыць за горадам.

Сцены жылых памяшканняў у багатых дамах абавязкова фарбавалі. Грэкі асабліва любілі сіні і чырвоны колеры, а таксама арнаментальныя ўзоры. У багатых дамах на падлозе выкладвалі мазаіку з рознакаляровых камянёў.



Рабыня дапамагае апранацца знатнай грачанцы

**3. Харчаванне і адзенне.** У бітве пры Платэях грэкі разбілі персідскую армію. Яны захапілі багаты шацёр правадыра ворага. Кіраўнік грэчаскага войска загадаў прыгатаваць ежу персідскага палкаводца. Убачыўшы яе, ён засмяяўся і сказаў: «Эліны, я запрасіў вас для таго, каб давесці вам дурасць персаў. У іх такі багаты стол, а яны прыйшлі забраць у нас нашу бедную ежу».

Паўсядзённая ежа грэкаў была вельмі простай. Елі тры разы ў дзень. Раніцай перад работай проста размочвалі сухі хлеб у вадзе або казіным малаку. Днём падчас работы елі ячменныя ляпёшкі з казіным або авечым сырам і дадавалі да гэтага некалькі алівак. Толькі вечарам ежа была больш каларыйнай: ячменная каша або гародніна з рыбай. Рыбу елі ў вялікіх колькасцях. А вось мяса авечак, коз і быкоў было сапраўдным ласунком, яго елі толькі на святы.



Выява дзяўчынкі з галубамі. *Старажытнагрэчаскі рэльеф*

Старажытныя грэкі не выкарыстоўвалі шытае адзенне. Яны апраналіся ў шырокія кавалкі тканіны, якія абвівалі вакол цела і зашпільвалі спецыяльнымі зашпількамі. Жаночае адзенне было да пят, а мужчынскае — да кален. Адзенне было з шэрсці або лёну.



Правообладатель Народная асвета

*Такім чынам, грэкі надавалі вялікае значэнне ўдзелу ў грамадскім жыцці поліса. Пры гэтым іх побыт і жыллё былі простымі і непатрабавальнымі.*

1. У якім месцы збіраліся грэчаскія грамадзяне для вырашэння важных пытанняў жыцця горада?
2. Што ўяўлялі сабой гарадскі акропаль і агара? Якія славутасці тут можна было ўбачыць?
3. Параўнайце паўсядзённае жыллё старажытных грэкаў і іх грамадскія будынкі. Зрабіце вывад.
4. Раскажыце аб харчаванні і адзенні грэкаў. Што вас здзівіла?
5. Ці адпавядаюць сапраўднасці словы Арыстафана аб афіняніне, які браў з сабой у дарогу «хлеба кус, ды цыбулі галоўку, ды жменьку алівак»?

**6*.** Падумайце, чым было выклікана тое, што ў грэчаскай школе спецыяльна навучалі ўменню прыгожа драпіраваць адзенне.

## § 16. Эліністычная культура

**Успомніце.** Якія культурныя дасягненні грэкаў увайшлі ў жыццё сучаснага грамадства?

**1. Узнікненне эліністычнай культуры.** У выніку заваёў Аляксандра Македонскага была створана вялікая дзяржава ад Грэцыі да Індыі. У склад дзяржаў, якія ўтварыліся пасля яе распаду, увайшлі землі са старажытнай, шматвяковай культурай. Гэта былі Егіпет, Месапатамія, Сірыя, Персія, Малая Азія і інш.



Храм Артэміды ў Эфесе. *Сучасны малюнак*



Правообладатель Народная асвета

Военачальнікі Аляксандра абвясцілі сябе царамі ў гэтых дзяржавах. Цары самі ўстанаўлівалі законы і перадавалі ўладу ў спадчыну.

Новыя дзяржавы аказаліся змацаванымі не толькі ваеннай сілай. Заваяваныя народы сталі прымаць грэчаскія звычаі і дасягненні. Старажытнагрэчаская мова стала агульнай мовай для насельніцтва гэтых краін. Грэчаская культура ўсё больш перапляталася з мясцовымі традыцыямі, з культурай заваяваных народаў. Так узнікла эліністычная культура, якая з цягам часу дасягнула небывалага росквіту.

**2. Александрыя Егіпецкая.** Сапраўдным сімвалам велічы старажытнагрэчаскай цывілізацыі стала будаўніцтва новага горада — Александрыі Егіпецкай. Горад быў заснаваны Аляксандрам Македонскім і названы ў яго гонар. Ён адрозніваўся ад старых цесных грэчаскіх гарадоў і зрабіўся прыкладам для будучых гарадоў. Александрыя была распланавана на шырокай раўніне каля мора. У цэнтры на перасячэнні праспектаў размяшчалася вялікая плошча. У горадзе было шмат паркаў і зелені. Тут зрабілі водаправод. Свежы марскі вецер свабодна прадзімаў прамыя вуліцы, выносячы духату. Гэта перашкаджала ўзнікненню хвароб і эпідэмій у шматлюдным горадзе.

Паводле падання, менавіта тут быў пахаваны Аляксандр Македонскі.

**3. Эліністычная навука.** Эліністычныя манархі садзейнічалі развіццю навук. Так, уладары Александрыі запрашалі да свайго двара вядомых вучоных. Яны шчодра ўзнагароджвалі іх і вызвалялі ад падаткаў. Александрыя зрабілася буйнейшым навуковым цэнтрам. Тут працавалі вучоныя са шматлікіх краін. Адным з самых вядомых з'яўляўся ***Архімед***.



Архімед.
*Старажытнагрэчаскі бюст*



Правообладатель Народная асвета

Дасягненні вучоных уражвалі. Астраномы змаглі стварыць дзіўныя механізмы для вывучэння сонечных зацьменняў. Яны даказвалі, што Зямля — шар. Медыкі апісалі нервовую сістэму чалавека.

У Александрыі быў адкрыты ***Мусеён***. Яго назву можна перакласці як «Дом Муз». Ён быў прысвечаны музам — апякункам розных ведаў і мастацтваў. Тут было сабрана больш чым паўмільёна рукапісных кніг. У Мусеёне працавалі выдатныя вучоныя таго часу. Ад яго назвы паходзіць слова «музей».

**4. «Цуды» Старажытнага свету.** У Старажытнай Грэцыі людзей, якія праектавалі дзіўныя збудаванні, называлі механікамі. Ніколі раней свет не бачыў нічога падобнага і цяпер ганарыўся сваімі тварэннямі. Таму гэтыя збудаванні сталі называць «цудамі».

У Александрыі на востраве Фарос быў пабудаваны маяк вышынёй больш за 120 м. На яго вяршыні ноччу пастаянна гарэў агонь. Праз сістэму адпаліраваных бронзавых люстраў ён даваў моцны прамень святла. Гэтае святло было відаць за 80 км ад берага, паказваючы караблям шлях у гавань багатага горада. Грэкі назвалі маяк адным з сямі



Фароскі маяк.
*Рэканструкцыя*



Калос Радоскі.
*Рэканструкцыя*



Правообладатель Народная асвета

цудаў свету. Фароскі маяк выкарыстоўвалі больш чым паўтары тысячы гадоў, пакуль землетрасенне не разбурыла яго.

Не толькі Александрыя магла пахваліцца нябачанымі да гэтага часу збудаваннямі. На востраве Родас была пабудавана вялізная 36-метровая статуя бога Сонца Геліяса. Яе бачылі мараплаўцы здалёк. Таму яна атрымала назву Калос Радоскі.

Пышную грабніцу цара Маўсола ўпрыгожвалі шматлікія скульптуры. Беручы прыклад з яе прыгажосці і велічнасці, іншыя ўладары таксама пачалі будаваць сабе пахавальныя збудаванні — маўзалеі.

*Элiністычная культура аказала вялікі ўплыў на суседнія народы. Яна стала ўзорам для далейшага развіцця еўрапейскай культуры.*

## Для дапытлівых

### Механізм вострава Антыкітэра

У 1901 годзе ў Эгейскім моры каля паўднёвага ўзбярэжжа паўвострава Пелапанес знайшлі затоплены яшчэ ў старажытнасці карабель. Судна перавозіла скарбы з Малой Азіі ў Рым, але трапіла ў шторм і патанула. Археолагі выявілі шмат розных знаходак, у тым ліку рэшткі старажытнага механізма. Механізм, створаны ў пачатку I стагоддзя да н. э., быў зроблены з бронзавых шасцерняў, заключаных у драўляны корпус.



Старажытнагрэчаскі механізм

Зараз менавіта гэтыя рэшткі механізма лічацца самай важнай і ўнікальнай знаходкай сярод усіх скарбаў. Дзякуючы гэтаму механізму старажытнагрэчаскія вучоныя маглі вылічваць рух Сонца, Месяца і планет. Выявы гэтых аб’ектаў знаходзіліся на



Правообладатель Народная асвета

адным баку драўлянага кораба. А з другога боку размяшчаўся каляндар. Можна было паставіць любую каляндарную дату і ўбачыць, як будуць размяшчацца планеты ў гэты дзень на небасхіле. Гэты механізм дапамагаў вылічваць час сонечных і месячных зацьменняў, іншыя нябесныя з'явы.

**Пытанні да дакумента.** Аб чым сведчыць знаходка археолагаў?

**1.** Пакажыце на карце краіны, якія ўваходзілі ў дзяржаву Аляксандра Македонскага. Якая мова стала агульнай для насельніцтва гэтых краін?
**2.** Што адрознівала Александрыю Егіпецкую ад вядомых вам грэчаскіх гарадоў?
**3.** Якія прыклады сведчаць аб тым, што элліністычныя ўладары паважалі вучоных?
**4.** Раскажыце аб «цудах» Старажытнага свету. Пацікаўцеся, якое з іх захавалася да нашых дзён.
**5.** Растлумачце, як вы зразумелі, што такое элліністычная культура. У чым яе значэнне для еўрапейскіх народаў?
**6*.** Падумайце, што аб'ядноўвала дзяржавы, утвораныя пасля распаду дзяржавы Аляксандра Македонскага.

## Абагульненне да раздзела «Старажытная Грэцыя»

Працягваючы падарожжа па старонках таямнічага і загадкавага свету старажытнай гісторыі, вы заўважылі, што мінулае неахвотна прыадкрывае свае тайны. Толькі дзякуючы самаадданай працы вучоных з'явілася магчымасць пазнаёміцца з вялікай цывілізацыяй Старажытнай Грэцыі. Менавіта з яе пачынаецца адчуванне вельмі важных адрозненняў ладу жыцця грэкаў ад ладу жыцця суседніх з імі цывілізаваных народаў Усходу. У другім тысячагоддзі да н. э. узніклі першыя цывілізацыі ў Еўропе з цэнтрамі на Крыце і ў Мікенах. Уварванне дарыйцаў у канцы XII стагоддзя да н. э. адкінула грэчаскае грамадства ў першабытнасць. І толькі ў VIII стагоддзі да н. э. у Грэцыі нарадзілася цывілізацыя, асновай якой быў поліс. Земляробы поліса з'яўляліся паўна-

Народная асвета



Правообладатель Народная асвета

праўнымі грамадзянамі. Яны, удзельнічаючы ў Народным сходзе, вырашалі лёс свайго горада-дзяржавы, абаранялі радзіму ад ворагаў. Але ў іх грамадстве былі і абяздоленыя — рабы, якіх не лічылі за людзей. У VIII—VI стагоддзях да н. э. грэкі, утвараючы калоніі, рассяліліся на ўзбярэжжах Міжземнага і Чорнага мораў.

Росквіт элінскай цывілізацыі адносіцца да V—IV стагоддзяў да н. э., калі Афіны сталі цэнтрам грэчаскай культуры і самай праслаўленай у свеце дэмакратыяй. Мудры Салон заклаў яе асновы, а Перыкл дабіўся вышэйшага развіцця. У ходзе барацьбы паміж багатымі і беднымі грамадзянамі Грэцыі ў іх выпрацавалася імкненне да мірнага суіснавання шляхам дамоўленасцей, якія складалі аснову закона.

Старажытная Грэцыя падаравала нам Алімпійскія гульні, тэатр, бессмяротныя ўзоры мастацкай культуры.

Завяршальны этап гісторыі старажытных грэкаў звязаны з узвышэннем Македоніі і заваявальнымі паходамі Аляксандра Македонскага. Вялікі палкаводзец марыў аб злучэнні шляху развіцця Захаду і Усходу. Але пасля яго смерці створаная ім сусветная дзяржава распалася.

**1.** Калі ўзніклі першыя цывілізацыі ў Еўропе? Пакажыце іх цэнтры на карце.
**2.** Назавіце асноўныя грэчаскія плямёны. Хто лічыцца іх роданачальнікам?
**3.** Растлумачце, што такое Элада. Якія адносіны да Грэцыі мае гэтае слова?
**4.** Калі ў Грэцыі нарадзілася цывілізацыя, асновай якой стаў поліс? Якія з полісаў былі найбольш вядомымі? Знайдзіце іх на карце.
**5.** Які час лічыўся часам росквіту старажытнагрэчаскай культуры? Чаму?
**6.** Калі і чаму грэчаскія гарады-дзяржавы прыйшлі ў заняпад і згубілі незалежнасць?



Правообладатель Народная асвета

# Раздзел 2. СТАРАЖЫТНЫ РЫМ

Старажытны Рым узнік на тэрыторыі Апенінскага паўвострава. Спачатку гэта было невялікае пасяленне, затым горад. Паступова горад распаўсюдзіў сваю ўладу на ўвесь паўвостраў. З цягам часу Старажытны Рым ператварыўся ў буйнейшую дзяржаву свету.

## § 17. Легендарны пачатак Рыма

**Успомніце.** Самыя вядомыя гарады Старажытнага свету. Пакажыце іх на карце.

**1. Дзе жылі і чым займаліся старажытныя рымляне.** Продкі старажытных рымлян жылі на *Апенінскім* паўвостраве. Зручныя, хоць і нешматлікія гавані, стваралі спрыяльныя ўмовы для гандлю з іншымі краінамі. Рымляне гандлявалі керамікай, вырабамі з бронзы, вінаградным віном, янтаром, аліўкавым алеем.

Мяккі і цёплы клімат, урадлівыя даліны рэк *По* і *Тыбра* садзейнічалі развіццю земляробства. Людзі сеялі пшаніцу, ячмень, бабовыя. Была развіта і жывёлагадоўля. На лугах пасвіліся быкі, авечкі, свінні. Важнай справай для развіцця гаспадаркі была здабыча карысных выкапняў: жалезнай руды, волава, медзі, солі, гліны.



Рака Тыбр з прылеглымі ўзгоркамі, на якіх быў закладзены Рым. *Рэканструкцыя*



Правообладатель Народная асвета




Старажытная Італія (да сярэдзіны III ст. да н. э.)

Рым, ці як яго інацай называюць Вечны горад, узнік у нізоўі Тыбра, у Цэнтральнай Італіі. Гэта месца было заселена *этрускамі, лацінамі, сабінамі, грэкамі.*

**2. Ромул — заснавальнік Рыма.** **У 753 годзе да н. э.** ***Ромул*** заснаваў новы горад і стаў першым рымскім царом. Згодна з легендай, Рым быў заснаваны па «волі багоў». Пры заснаванні горада адбылося братазабойства. Ромул забіў свайго брата за тое, што той высмеяў мару Ромула аб будучай велічы Рыма.

Ромул раздзяліў народ на знакамітых і простых людзей: ***патрыцыяў*** і ***плебе́яў***. Пры родаплемянным ладзе патрыцыі — гэта тыя сем'і, з якіх выбіраліся старэйшыны родаў. Патрыцыі займалі



Правообладатель Народная асвета

пасады жрацоў, суддзяў, кіравалі горадам. Просты народ займаўся земляробствам, жывёлагадоўляй і рамяством. Рабы выконвалі дамашнюю работу ў якасці прыслугі.

Паступова ствараліся органы ўлады. Галоўным правіцелем быў *цар*. Ромул правіў разам з самымі знакамітымі людзьмі — *старэйшынамі родаў*. З іх складаўся *сенат* — сход, або савет старэйшын. Не быў абдзелены ўладай і просты народ. На *народных сходах* вырашаліся пытанні вайны і міру, выбіралі цара.




Будова грамадства Рыма ў царскі перыяд

Плямёны, якія жылі побач, недалюблівалі людзей Ромула за простае паходжанне і пастаянныя ваенныя сутыкненні. Суседзі не хацелі сябраваць і радніцца з рымлянамі. Аб гэтым нам паведамляе легенда. Аднойчы рымляне запрасілі сабінскія сем'і да сябе на свята. Парушыўшы правілы гасціннасці, Ромул і яго паплечнікі захапілі хітрасцю дзяўчат гэтага племені. Праз некаторы час успыхнула вайна. Сабінянкі прымірылі бацькоў і братоў з рымлянамі, якія сталі іх мужамі. У выніку плямёны, якія былі ворагамі, аб'яднаціся ў адну абшчыну.

**3. Рымскія цары пасля Ромула.** Пасля Ромула правіў ***Нума***. Пры яго праўленні Рым ні з кім не ваяваў. Храм бога міру і парадку пры Нуме быў зачынены. Яго адчынялі толькі падчас вайны. Нума першы з цароў замацаваў законам права ўласнасці на зямлю. Зямельныя ўчасткі раздзяляліся межавымі камянямі. Парушэнне меж каралася смерцю.



Правообладатель Народная асвета

Два рымскія цары — Ромул і Нума — умацавалі рымскую дзяржаву. Першы дабіўся магутнасці ваеннай сілай, а другі — мірнымі справамі. Цар ***Сервій Тулій*** правёў рэформу, па якой усё насельніцтва было раздзелена паводле маёмаснага дастатку. Правы свабоднага чалавека вызначаліся яго багаццем. Уладу захапілі самыя багатыя патрыцыі.

Праўленне апошняга рымскага цара ***Тарквінія Гордага*** вызначалася самаўпраўствам і жорсткасцю. Ён вырашаў дзяржаўныя пытанні, не раячыся з сенатам і народам. Гараджане, абураныя такімі паводзінамі цара, выгналі яго ў **510 годзе да н. э.**

*Такім чынам, Рым быў заснаваны ваяўнічым Ромулам. Пры ім з'явіліся сенат і Народны сход. Ромул раздзяліў усё грамадства на знаць — патрыцыяў і просты народ — плебеяў. Іншыя цары ўстанавілі законы, замацавалі права на валоданне зямлёй. Да канца царскага часу грамадствам кіравалі самыя багатыя патрыцыі. Хто меў больш зямлі і рабоў, той меў і ўладу.*

1. Калі і дзе ўзнік горад Рым? Колькі гадоў прайшло ад яго заснавання да нашых дзён?
2. Чым займаліся старажытныя рымляне?
3. Раскажыце аб грамадскім парадку і органах кіравання ў Старажытным Рыме.
4. Растлумачце, за што недалюблівалі рымлян плямёны, якія жылі побач.
5. Якім чынам рымскія цары — Ромул і Нума — умацавалі сваю дзяржаву?
6. Хто захапіў уладу ў Рыме пры Сервіі Туліі? Чаму?

## Для дапытлівых

**Легенда аб заснаванні Рыма** (Паводле Плутарха)

Па волі бога Марса жрыца нарадзіла на свет блізнят Ромула і Рэма. Іх загадалі кінуць у раку. Цячэннем вады кошык, у якім плылі немаўляты, прыбіла да берага. Хлопчыкаў знайшла і выкарміла ваўчыца, а выраслі яны ў сям'і пастуха.



Правообладатель Народная асвета

Хутка людзі даведаліся, што гэта асобы царскага паходжання. Паводле старажытнага звычаю, браты павінны былі заснаваць свой горад. Узлезшы на суседнія ўзгоркі і гледзячы на птушак, якія ляцелі, пачалі гаданні. Паміж імі ўзнікла спрэчка: каму заснаваць горад? Чаму аддаць перавагу: колькасці птушак ці часу іх з'яўлення? Выйсце знайшлі ў паядынку. У жорсткай сутычцы Ромул забіў Рэма. Пасля гэтага Ромул заснаваў горад, які атрымаў яго імя.



Капіталійская ваўчыца.
*Статуя VI ст. да н. э.*

**Пытанні да дакумента.** Які абрад выконвалі Ромул і Рэм перад заснаваннем горада? Што паслужыла прычынай спрэчкі паміж братамі?

## § 18. Ранняя Рымская рэспубліка

**Успомніце.** Хто лічыўся грамадзянінам у грэчаскім полісе?

**1. Кіраванне рэспублікай.** Пасля выгнання апошняга цара Рымам кіравалі *сенат*, які складаўся з патрыцыяў, і *Народны сход*. У дапамогу сенатарам Народны сход штогод выбіраў з патрыцыяў двух правіцеляў — *консулаў*. Консулы былі суддзямі, а падчас вайны — военачальнікамі. Такое кіраванне дзяржавай рымляне называлі «грамадскай справай» — ***рэспублі-***




Будова грамадства ранняй Рымскай рэспублікі



Правообладатель Народная асвета



Пасяджэнне рымскага сената. *Карціна еўрапейскага мастака*

***кай***. Рэспубліканская форма кіравання ўсталявалася ў Рыме ў **509 годзе да н. э.**

Вышэйшыя дзяржаўныя пасады ў рэспубліцы належалі патрыцыям. Яны валодалі зямлёй, статкам і рабамі. Плебеі маглі ўдзельнічаць толькі ў сходах воінаў, але і там панавалі патрыцыі.

**2. Барацьба плебеяў з патрыцыямі**. Плебеі лічылі несправядлівым сваё становішча ў рымскім грамадстве, паколькі яны нараўне з патрыцыямі неслі ваенную службу. Багатыя плебеі вялі барацьбу за доступ да дзяржаўных пасад. Бедныя плебеі імкнуліся мець невялікі ўчастак зямлі. Галоўным для іх было не трапіць у рабства за пазыкі. Дзейнічаючы разам, простыя людзі час ад часу дабіваліся поспехаў.

Плебеі пагражалі, што пакінуць Рым і будуць жыць асобна, калі іх не прызнаюць раўнапраўнымі грамадзянамі. Яны неаднаразова прымянялі сваю пагрозу. Упершыню гэта адбылося ў 494 годзе да н. э. Тады плебейскае насельніцтва выйшла з Рыма і заняло Свяшчэнную гару непадалёку ад горада. Толькі пасля доўгіх перагавораў з патрыцыямі плебеі вярнуліся назад. У выніку



Правообладатель Народная асвета

плебеі атрымалі права выбіраць сваіх прадстаўнікоў улады — *трыбунаў*.

Трыбуны маглі адмяняць распараджэнні консулаў і сената, калі яны датычыліся інтарэсаў плебеяў. Для гэтага дастаткова было сказаць слова «*вета*», што азначала «Я забараняю». Дзверы дома трыбуна былі заўсёды адчынены. У любы час дня і ночы той, хто хацеў, мог знайсці ў яго абарону. Забойства трыбуна лічылася цяжкім злачынствам.

Наступнай важнай перамогай плебеяў сталі ***Законы XII табліц***, прынятыя Народным сходам у **451 — 450 гадах да н. э.** Сваю назву яны атрымалі ад таго, што былі запісаны на 12 драўляных дошках-табліцах. Законы XII табліц абаранялі асобу і ўласнасць грамадзяніна. Цяпер было немагчыма без рашэння суда заключыць чалавека ў турму. Суд караў за пазыкі нават смерцю.

У выніку быў прыняты закон, які назаўсёды адмяняў рабства з-за пазык, але толькі для рымскіх грамадзян і іх сем'яў. Пасля гэтага галоўнымі крыніцамі рабства сталі войны. Паступова плебеі дабіліся права выбірацца на ўсе дзяржаўныя пасады ў Рымскай дзяржаве. У пачатку III стагоддзя да н. э. плебеі дабіліся канчатковай роўнасці ў правах з патрыцыямі.

**3. Рымскія грамадзяне.** Тры важнейшыя прыметы адрознівалі грамадзян ад астатняга насельніцтва. Кожны рымскі грамадзянін меў права валодаць участкам зямлі, удзельнічаць у кіраванні дзяржавай і абараняць радзіму. Грамадзянін быў абавязаны па першым закліку выступіць на абарону сваёй айчыны. Сярод грамадзян былі багатыя і бедныя, знакамітыя людзі і людзі простыя. Усе былі роўныя перад законам, аднак грамадская значнасць рымскага грамадзяніна залежала ад велічыні маёмасці. Прадстаўнікі не-



Рымскія трыбуны. *Старажытны рэльеф*



Правообладатель Народная асвета

калькіх дзясяткаў самых багатых патрыцыянскіх і плебейскіх сем'яў з года ў год займалі высокія пасады. Так, у Рыме паступова ўзнікла *новая знаць — набілітэт*, якая валодала зямлёй, рабамі і кіравала дзяржавай.

*Такім чынам, асноўнымі органамі кіравання Рымскай рэспублікай былі Народны сход, сенат і консулы. У выніку шматгадовай барацьбы плебеі сталі раўнапраўнымі грамадзянамі Рыма. Унутраны разлад быў пераадолены. Грамадзяне адчувалі сябе часткай адзінага калектыву. Цяпер асобу і ўласнасць грамадзян абараняў закон, перад якім усе былі роўныя. Усё гэта ўмацоўвала рымскае грамадства і дзяржаву.*

**1.** Чаму рымляне сваё дзяржаўнае кіраванне называлі «грамадскай справай»? Што гэта азначала?
**2.** За што плебеі вялі барацьбу з патрыцыямі?
**3.** Раскажыце аб правах і абавязках народных трыбунаў. Ацаніце значэнне іх выбрання для плебеяў.
**4.** Пералічыце правы і абавязкі рымскіх грамадзян. Чаму займацца дзяржаўнымі справамі маглі толькі багатыя людзі?
**5.** Растлумачце, з каго сфарміравалася новая знаць у Рыме.
**6*.** Якія прычыны садзейнічалі ўмацаванню Рымскай дзяржавы?

## Для дапытлівых

**Выхад плебеяў на Свяшчэнную гару ў 494 годзе да н. э.**
(Паводле А. І. Неміроўскага)

Вярнуцца ў Рым плебеяў угаварыў Мененій Агрыпа, які расказаў ім наступную прытчу. Некалі, у далёкія часы, жыў толькі адзін чалавек, якому не было з кім перакінуцца словам. Аднак дарам мовы валодалі часткі яго цела. Аднойчы яны ўзбунтаваліся супраць страўніка. Ім здалося, што яны дарэмна працуюць на гэтага гультая і абібока. Адмовіўшы страўніку ў харчаванні, часткі цела хацелі жыць не напружваючыся. Яны радаваліся таму, што страўнік пакутуе. Але хутка і самі пачалі пакутаваць ад хо-



Правообладатель Народная асвета

ладу і слабець. Тады яны зразумелі, што ў кожнай часткі цела, у тым ліку і ў страўніка, свая задача. Пагадзіўшыся з гэтым, усе сталі працаваць разам, і справы ў іх пайшлі на лад. Так ішлі справы ў кожнай абшчыне, часткі якой звязаны і выконваюць агульную работу.

**Пытанні да дакумента.** Чаму Мененію Агрыпе ўдалося вярнуць плебеяў у Рым?

## § 19. Заваяванне Рымам Італіі

**Успомніце.** Калі і дзе ўзнік горад Рым?

**1. Войны Рыма з суседнімі плямёнамі.** Рым быў размешчаны ў густанаселенай вобласці Італіі. Зямля тут уяўляла вялікую каштоўнасць. З-за яе вяліся бесперапынныя войны. У V—III стагоддзях да н. э. рымляне ваявалі з рознымі італійскімі плямёнамі.

Больш за сто гадоў ішла барацьба паміж рымлянамі і этрускамі. Упарта супраціўляліся этрускі, але да сярэдзіны IV стагоддзя да н. э. іх супраціўленне было зламана. У войнах з этрускамі праславіўся рымскі палкаводзец Марк Фурый Каміл, які авалодаў багатым горадам Веі і захапіў вялікую здабычу. Згубіўшы незалежнасць, этрускі паступова пераймалі лад жыцця рымлян.

У выніку паспяховай барацьбы рымляне авалодалі вялікімі тэрыторыямі ў цэнтральнай частцы Апенінскага паўвострава.

**2. Нашэсце галаў на Рым.** У IV стагоддзі да н. э. рымляне сутыкнуліся з грозным праціўнікам — *галамі*. Ваяўнічыя галы пражывалі на тэрыторыі сучаснай Францыі. Праз Альпы яны пранікалі ў Паўночную Італію і захоплівалі італійскія землі і гарады.

**У пачатку IV стагоддзя да н. э.** над Рымам навісла страшная небяспека: галы ўзялі ў аблогу Вечны горад. Рымскае войска было разбіта, а горад разрабаваны і спалены. У руках у рымлян застаў-



Правообладатель Народная асвета



Помнік гусям,
якія выратавалі Рым

ся толькі Капіталійскі ўзгорак, над якім узвышаліся храмы багоў. Мужна адбіваліся абаронцы горада. Але хутка пачаўся голад. Былі з'едзены апошнія запасы харчавання. Засталіся толькі свяшчэнныя гусі, якія жылі ў храме багіні Юноны. Не раз падумвалі пра іх галодныя воіны, але баяліся гневу багіні — апякункі горада.

Згодна з легендай, аднойчы ноччу галы паспрабавалі прабрацца на Капітолій. Варта мірна спала. Толькі свяшчэнныя гусі адчулі набліжэнне ворага. Гучным гагатаннем і лопаннем крылаў яны разбудзілі воінаў. Рымляне далі адпор ворагу і заставілі яго пайсці на перагаворы. Адсюль узнік выраз «Гусі Рым выратавалі».



Рымскія воіны.
*Старажытны рэльеф*

Галы згадзіліся пакінуць разрабаваны горад толькі ў тым выпадку, калі яго жыхары заплацяць выкуп — 300 кг золата. Калі каштоўныя вырабы сталі ўзважваць, гальскі правадыр кінуў на шалі з гірамі яшчэ і свой цяжкі меч. Рымляне сталі пратэставаць. Але правадыр галаў адказаў здзекліва: «Гора пераможаным!»

У рэшце рэшт рымляне сабраліся з сіламі. У ваколіцах Рыма яны стварылі новую армію і разбілі галаў. Заваёўнікі пакінулі не толькі Рым, але і межы Італіі.

**3. Вайна з Пірам.** Устанавіўшы кантроль над Цэнтральнай Італіяй, рымляне прыступілі да заваёвы Паўднёвай Італіі. Тут яны сутыкнуліся з моцным супраціўленнем грэчаскіх гарадоў-калоній.



Правообладатель Народная асвета

У 280 годзе да н. э. ім на дапамогу з Грэцыі прыйшла армія цара ***Піра***.



Цар Пір

Пір лічыўся другім з найвялікшых палкаводцаў пасля Аляксандра Македонскага. Яго армія налічвала 20 тыс. салдат, 3 тыс. коннікаў, 2 тыс. лучнікаў, 500 прашчнікаў і 20 баявых сланоў. Рымляне, ніколі раней не бачыўшыя гэтых жывёл, цярпелі адно паражэнне за другім і адступілі. Аднак, перамагаючы, грэчаскія войскі таксама неслі вялікія страты. Пасля адной з такіх бітваў цар Пір усклікнуў: «Яшчэ адна такая перамога, і я застануся без войска!» Так узнік крылаты выраз *«пірава перамога»*, гэта значыць перамога, раўназначная паражэнню. У 275 годзе да н. э. войскі Піра былі разбіты.

Пасля перамогі над Пірам рымляне ўстанавілі кантроль над усёй Італіяй. Заваяваныя плямёны і гарады аб'ядналіся ў саюз на чале з Рымам. Удзельнікі гэтага саюза мелі розныя правы. Тыя плямёны, якія дапамагалі Рыму, мелі поўнае самакіраванне і рымскае грамадзянства. Тыя, хто ваяваў супраць Рыма, не мелі ніякіх правоў і карысталіся толькі абмежаваным самакіраваннем. Усе ўдзельнікі саюза павінны былі пастаўляць рымлянам воінаў і ўзбройваць рымскую армію. Па ўсёй Італіі стала ўжывацца адзіная манета — рымскі сярэбраны дынарый.

*Такім чынам, рымляне ўдасканальвалі сваю армію і ператварылі яе ў самую лепшую армію свайго часу. Рым устанавіў кантроль над паўночнымі і цэнтральнымі раёнамі паўвострава. А пасля перамогі над Пірам стаў панаваць над усёй Італіяй.*

**1.** Што выклікала пастаянныя войны Рыма з суседнімі плямёнамі?
**2.** Складзіце паведамленне па тэме (на выбар): а) «Нашэсце галаў на Рым»; б) «Гора пераможаным!»; в) «Пірава перамога».



Правообладатель Народная асвета

**3.** На стужцы часу адзначце: год заснавання Рыма, год асады Вечнага горада галамі, год разгрому войскаў Піра.

**4.** Параўнайце на карце тэрыторыю Рыма ў пачатку яго ўзнікнення і тую, над якой ён устанавіў кантроль у 275 годзе да н. э. Зрабіце вывад.

**5*.** Ці згодны вы з выказваннем аднаго з рымскіх сенатараў: «З Пірам трэба ваяваць, а не ўступаць у дружбу»?

## Для дапытлівых

**Легенда пра храбрага воіна Муцыя Сцэволу** (Паводле Ціта Лівія)

Ішла вайна паміж этрускамі і Рымам. Аднойчы малады рымскі воін пралез у ваенны лагер этрускага цара Парсены, але быў схоплены пільнымі вартавымі. На допыце Муцый цвёрда маўчаў. Парсена настойліва пытаў: «Скажы мне, якія яны, рымскія воіны, колькі іх і ці вытрымаюць яны наша наступленне?» Наканец Муцый загаварыў: «Глядзі сам!» і няспешна паклаў правую руку ў агонь ахвярніка. Уражаны Парсена зразумеў, што яму не перамагчы такіх храбрых воінаў. Ён накіраваў у Рым паслоў для заключэння міру. Пасля гэтага Муцыя празвалі Сцэволам, што азначае «ляўша». Ва ўзнагароду за адвагу сенатары выдалі яму зямлю за Тыбрам.

**Пытанні да дакумента.** Якія рысы характару праявіў Муцый Сцэвола?

# § 20. Заваяванне Рымам Міжземнамор'я

**Успомніце.** Калі, дзе і з якой мэтай быў заснаваны горад Карфаген?

Да сярэдзіны III стагоддзя да н. э. рымляне падпарадкавалі сабе амаль усю Італію. Пасля гэтага яны пачалі заваёўваць іншыя народы Міжземнамор'я.

Увагу Рыма прыцягвала *Сіцылія* — востраў з цудоўнейшымі гарадамі і ўрадлівымі глебамі. Але на гэты востраў прэтэндаваў магутны Карфаген. Сутыкненне Рыма і Карфагена было непазбежным. Тры працяглыя вайны паміж імі доўжыліся з **264** па



Правообладатель Народная асвета

**146 год да н. э.** і атрымалі назву ***Пунічных***, паколькі рымляне называлі карфагенян *пунамі*.



Ганібал

**1. Першая і Другая Пунічныя войны.** *Першая Пунічная вайна.* Ваенныя дзеянні ішлі на моры і на сушы. Першая Пунічная вайна працягвалася 20 гадоў і закончылася перамогай рымлян. Рым захапіў астравы *Сардзінію* і *Корсіку*. Карфагеняне выплацілі яму вялікую даніну — 84 тоны серабра.

*Другая Пунічная вайна (218 — 201 гады да н. э.)*. Карфаген не змірыўся. Пачалася новая вайна. На чале карфагенскай арміі стаяў таленавіты палкаводзец ***Ганібал***. Рымляне чакалі яго з поўдня. А ён нечакана абрушыўся на іх з поўначы, прайшоўшы праз Альпы.



Армія Ганібала ў Альпах. *Сучасны малюнак*

Важная бітва адбылася ў **216 годзе да н. э.** каля мястэчка *Каны*. Рымская армія налічвала 80 тыс. салдат і была ў два разы большай, чым карфагенская. Нягледзячы на гэта, Ганібал атрымаў бліскучую перамогу. Рымляне загубілі больш чым палавіну сваіх воінаў, аднаго консула і 80 сенатараў. Бітва пры Канах да гэтага часу лічыцца яркім прыкладам таго, як можна атрымаць перамогу над больш шматлікім праціўнікам.

Жыхары Рыма з жахам чакалі з'яўлення ворага каля сцен Вечнага горада. Аднак Ганібал, стомлены ад бесперапынных паходаў, не адважыўся на штурм шматлюднага горада. Ён адвёў свае войскі і тым самым зрабіў вялікую ваенную памылку.



Правообладатель Народная асвета

Выкарыстаўшы сітуацыю, рымскі палкаводзец ***Сцыпіён*** высадзіўся з арміяй на зямлі Карфагена ў Паўночнай Афрыцы. Ганібал быў вымушаны пакінуць Італію і пасляшацца на дапамогу роднаму гораду. У бітве пры *Заме* ў **202 годзе да н. э.** ён пацярпеў першае і апошняе ў сваім жыцці паражэнне. Гэтая бітва канчаткова вырашыла канец Другой Пунічнай вайны.

Па ўмовах падпісанага міру да Рыма былі далучаны ўсе заморскія ўладанні Карфагена, уключаючы Сіцылію, Іспанію і іншыя землі. Увесь карфагенскі флот быў знішчаны.

**2. Трэцяя Пунічная вайна.** Рымляне баяліся адраджэння і ўмацавання Карфагена. Таму яны імкнуліся да яго поўнага знішчэння. Сенатар ***Катон*** усе свае выступленні ў сенаце заканчваў словамі: «Карфаген павінен быць разбураны!»

У **149 годзе да н. э.** рымскі сенат аб'явіў Карфагену вайну. Рымляне высадзіліся ў Афрыцы. Пасля трохгадовай асады яны штурмам



Штурм Карфагена. *Сучасны малюнак*

узялі горад і зраўнавалі яго з зямлёй. Усе карфагенскія тэрыторыі былі аб'яўлены рымскай правінцыяй.

Рымляне таксама вялі войны з іншымі народамі Міжземнамор'я. Былі заваяваны Македонія і Грэцыя, гарады Малой Азіі і Егіпта.

*Такім чынам, у выніку гэтых войн усё Міжземнамор'е аказалася пад уладай Рыма.*



Правообладатель Народная асвета

1. З якой нагоды сутыкнуліся інтарэсы Рыма і Карфагена ў Заходнім Міжземнамор'і? Да якіх падзей гэта прывяло?
2. Чаму развязаныя войны атрымалі назву Пунічных? Колькі гадоў яны працягваліся? Да чаго імкнуліся іх галоўныя ўдзельнікі?
3. Колькі было войн у Рыма з Карфагенам? Пакажыце на карце ўладанні, захопленыя Рымам у выніку Першай Пунічнай вайны.
4. Апішыце Другую Пунічную вайну: а) ад імя Ганібала; б) ад імя Сцыпіёна.
5. Назавіце асноўнае адрозненне Трэцяй Пунічнай вайны ад дзвюх першых.
6*. Як вы разумееце словы рымскага сенатара Катона «Карфаген павінен быць разбураны»? Ці выкарыстоўваецца гэты выраз у нашы дні? У якіх выпадках?

## Для дапытлівых

**Разбурэнне Карфагена** (Паводле А. І. Неміроўскага)

Сямнаццаць дзён гарэў Карфаген. Сямнаццаць дзён курчыліся ў агні лімонныя і міндалевыя дрэвы, якія некалі старанна даглядалі садаводы. Рушыліся аркі і скляпенні храмаў, узведзеныя рукамі працавітых фінікійскіх будаўнікоў; гінулі будынкі, пабудаваныя сотні гадоў таму назад і вартыя таго, каб стаяць многія стагоддзі. Згаралі ў агні схаваныя ў тайніках скарбы карфагенскіх купцоў і мізэрныя пажыткі беднякоў. Пылалі бібліятэкі, якія захоўвалі вопыт і мудрасць народа.

Сямнаццаць дзён гарэў Карфаген, а на васямнаццаты пайшоў лівень; здавалася, неба не вытрымала і пачало ліць слязьмі. Дождж ішоў цэлыя суткі. Рымляне хаваліся ў палатках.

Палкаводзец рымскай арміі Эмільян Сцыпіён Малодшы і яго світа падняліся на скалу. Замест цудоўнага, поўнага жыцця горада да самага заліва прасціралася чорнае, безжыццёвае поле з бясформеннымі руінамі. Удушлівы дым нізка слаўся па зямлі. Нават птушкі цяпер не лёталі тут.

**Пытанні да дакумента.** У чым прычына поўнага разбурэння Карфагена рымлянамі?



Правообладатель Народная асвета

# § 21. Зямельная і ваенная рэформы ў Рыме

**Успомніце.** З-за чаго рымляне вялі бесперапынныя войны з суседнімі плямёнамі?

**1. Рым пасля Пунічных войн.** Перамога рымлян у Пунічных войнах прынесла краіне ўзбагачэнне. Скарбы Карфагена аказаліся ў руках пераможцаў, а большасць яго жыхароў была ператворана ў рабоў. З гэтага часу рабы выконвалі асноўныя работы ў Рыме.

Раней асноўным насельніцтвам Італіі былі сяляне. Рабская праца прынесла шмат для каго з іх поўнае разарэнне. Многія земляробы страцілі свае невялікія надзелы зямлі, якія апрацоўвалі. Пры гэтым багатыя рымляне маглі павялічваць сваю ўласнасць. А многія рымляне ўзбагаціліся за кошт рабавання квітнеючага Карфагена. Багачы скуплялі землі земляробаў і стваралі вялікія зямельныя гаспадаркі, у якіх працавалі толькі рабы. Такія гаспадаркі пастаянна мелі патрэбу ў новых рабах. А для гэтага былі патрэбны новыя пераможныя войны.

**2. Зямельныя рэформы братоў Гракхаў.** ***Тыберый Гракх*** праславіўся сваёй храбрасцю пры ўзяцці Карфагена. Калі ён вярнуўся на радзіму, то ўбачыў рабоў, якія працавалі на палях. Гэта ўразіла



Рабы на сельскагаспадарчых работах. *Рымская мазаіка*



Правообладатель Народная асвета

Тыберыя. У той час рымскае войска складалася з людзей, якія валодалі зямлёй. Лічылася, што менавіта яны зацікаўлены ў абароне Рыма. Збяднелыя сяляне ўжо не маглі служыць у арміі. Што ж атрымаецца, калі земляробы страцяць зямлю?



Браты Гракхі.
*Сучасная скульптура*

У **133 годзе да н. э.** Тыберый Гракх зрабіўся народным трыбунам. Ён прапанаваў адабраць у багатых грамадзян частку зямель і раздаць іх небагатым. Але багатыя рымляне, перш за ўсё сенатары, з усяе моцы стараліся спыніць раздачу зямельных валоданняў. Бо яны ўжо распараджаліся лепшымі ўчасткамі дзяржаўных зямель. Прыхільнікі сената забілі Тыберыя Гракха.

У **123 годзе да н. э.** народным трыбунам быў выбраны ***Гай Гракх***. Ён абяцаў працягваць палітыку свайго брата. Каб зацікавіць народ, Гай загадаў прадаваць хлеб бедным гараджанам па самым нізкім кошце. Адначасова ён прыступіў да стварэння калоній на заваяваных тэрыторыях. Сюды маглі перасяліцца бедныя і беззямельныя рымскія грамадзяне. Яны атрымлівалі прыдатную для земляробства зямлю. Гэта было вельмі выгадна дзяржаве. Рымскія грамадзяне засялілі захопленыя землі. Калоніі ўмацоўвалі ўладу Рыма.

Рэформы братоў Гракхаў падтрымалі бедныя грамадзяне Рыма. Затое сенатары і багатыя былі супраць. Неаднаразова справа даходзіла да ўзброеных сутыкненняў паміж паплечнікамі тых і другіх. У адной з такіх сутычак загінуў і Гай Гракх.

**3. Ваенная рэформа Гая Марыя.** Гракхам не ўдалося прыпыніць збядненне земляробаў Італіі. Беднякоў па-ранейшаму было вельмі шмат. Як і раней, востра стаяла пытанне: хто будзе служыць у арміі і абараняць Рым?

Гэтую задачу змог вырашыць консул ***Гай Марый***. У **107 годзе да н. э.** ён ажыццявіў ваенную рэформу. Усім грамадзянам Рыма ў незалеж-



Правообладатель Народная асвета

насці ад іх багацця і валодання зямлёй было дазволена служыць у арміі. Служба працягвалася 16 гадоў. За гэты час яны станавіліся сапраўднымі прафесіяналамі. Салдаты на час службы атрымлівалі дзяржаўную зброю. А ад свайго палкаводца — плату. Чым большая ваенная здабыча, тым большая плата. У канцы службы легіянерам на заваяваных тэрыторыях належала зямля. У легіёны Марыя натоўпам пайшлі рымскія беднякі.



Узброеныя рымляне. *Старажытны рэльеф*

Армія Рыма ўмацавалася. Доўгія стагоддзі гэтая армія не будзе ведаць паражэнняў. Аднак салдаты цяпер ваявалі не толькі за Рым. Яны залежалі ад сваіх палкаводцаў больш, чым ад дзяржавы. Менавіта палкаводзец раздаваў зямельныя ўчасткі ветэранам пасля завяршэння службы. Патрыятызм рымскай арміі стаў саступаць месца асабістай адданасці салдат свайму палкаводцу. Напрыклад, самога Марыя насуперак закону 7 разоў выбіралі консулам. Такая была воля арміі.

*Такім чынам, браты Гракхі стараліся зрабіць армію баяздольнай, павялічваючы колькасць уласнікаў зямлі. Гай Марый прапанаваў беднякам служыць у арміі, што садзейнічала ўмацаванню Рымскай дзяржавы.*



Правообладатель Народная асвета

1. Што прынесла рымлянам перамога ў Пунічных войнах? Чаму ім былі патрэбны новыя заваяванні?
2. Якія прычыны прымусілі братоў Гракхаў правесці зямельныя рэформы? З чым звязана, што іх дзейнасць закончылася трагічна?
3. Што ўдалося ажыццявіць Гаю Марыю?
4. Вызначце вынікі ваеннай рэформы Гая Марыя.
5*. Што аб'ядноўвае падзеі, якія адбываліся ў 133, 123, 107 гадах да н. э.? Колькі гадоў прайшло ад атрымання плебеямі права выбіраць свайго плебейскага трыбуна да выбрання трыбунамі братоў Гракхаў?

## Для дапытлівых

**З выступлення Тыберыя Гракха перад народам** (Паводле Плутарха)

Дзікія звяры, якія насяляюць Італію, маюць свае норы і логавы для начлегу. А тыя людзі, якія змагаюцца і паміраюць за Італію, не маюць нічога, акрамя паветра і святла. Як бяздомныя бадзягі яны вандруюць усюды са сваімі дзецьмі і жонамі. Ілгуць палкаводцы, калі перад бітвай заклікаюць воінаў абараняць ад ворага магілы продкаў і храмы. Бо ні ў кога з гэтых рымлян няма ні айцоўскага алтара, ні магіл продкаў. А ваююць і паміраюць «уладары сусвету», як іх называюць, за чужую раскошу і багацце, хоць ў іх саміх няма нават кавалка ўласнай зямлі!

**Пытанні да дакумента.** У каго выступленне Тыберыя магло выклікаць нянавісць?

# § 22. Рабаўладанне ў Рыме

**Успомніце.** Як адносіўся да рабства грэчаскі паэт Эўрыпід?

**1. Крыніцы рабства.** Самымі бяспраўнымі ў Рыме былі рабы. Яны знаходзіліся ў поўным распараджэнні сваіх гаспадароў. Раба можна было прадаць, купіць, падараваць. Рабская праца з'яўлялася адной з крыніц багацця і дабрабыту рымскіх грамадзян.

Пасля адмены пазыковага рабства асноўнай яго крыніцай сталі войны, якія Рым вёў бесперапынна. Колькасць рабоў папаўнялася



Правообладатель Народная асвета

і за кошт дзяцей, народжаных рабынямі. Вельмі распаўсюджаным было таксама выкраданне людзей. На моры займаліся паляваннем марскія піраты, на сушы — разбойніцкія шайкі. Захопленых людзей прадавалі ў рабства. У тыя часы гандаль рабамі квітнеў ва ўсім Міжземнамор'і. Існавалі вялікія рынкі для гандлю рабамі. Буйнейшы з іх знаходзіўся на востраве Дэлос у Міжземным моры. Прадавалі рабоў і ў самім Рыме. Цэны на іх былі невысокімі. Небагатая сям'я магла купіць аднаго-двух чалавек.

**2. Становішча рабоў.** Рабы працавалі на сваіх гаспадароў з самай раніцы і да позняга вечара. Рабаўладальнікі называлі рабоў «гаворачымі» прыладамі працы. Нават самыя бедныя рымляне глядзелі на рабоў з пагардай. Ператварыўшыся ў раба, чалавек страчваў сваё асабістае імя. З гэтага часу яго называлі Галам, Персам, Скіфам (скіфы — жыхары стэпавай паласы Паўночнага Прычарнамор'я) па назве мясцовасці, адкуль ён паходзіў.

За самую малую правіннасць рабоў жорстка каралі. Іх кідалі ў турму, білі, нярэдка распіналі на крыжах уздоўж вялікіх дарог. У самім Рыме хворых і знясіленых нявольнікаў завозілі паміраць на востраў пасярод Тыбра. Самых моцных і вынослівых аддавалі ў гладыятарскія школы. Тут іх вучылі валодаць зброяй і змагацца аднаго з другім.

Становішча *гладыятараў* было асабліва цяжкім. Жылі яны ў казармах, на ноч іх замыкалі ў камеры. Гладыятары біліся насмерць



Рымскія гладыятары. *Сучасны малюнак*



Правообладатель Народная асвета

адзін з другім на спецыяльна прызначаных для гэтага арэнах. Нярэдка для пацехі гледачоў іх застаўлялі змагацца з дзікімі звярамі: ільвамі, тыграмі, быкамі. Невыпадкова гладыятараў называлі смертнікамі.

**3. Паўстанне Спартака.** Рабы не хацелі мірыцца са сваёй доляй. Яны ўцякалі, не раз паўставалі супраць сваіх гаспадароў. Буйнейшым за ўсю гісторыю Старажытнага свету было паўстанне ***Спартака***, якое адбылося ў **74—71 гадах да н. э.**

Спартак быў фракійцам, паходзіў з царскага роду. Пасля палानення трапіў у гладыятарскую школу ў *Капуі* на поўдні Італіі. Адсюль ён і яго таварышы ўдачна ўцяклі і разбілі свой лагер на гары *Везувій*. Шэрагі паўстанцаў папаўняліся з кожным днём. Спартак вельмі хутка ператварыў беглых рабоў у добра абучаную і дысцыплінаваную армію.

Сенат накіраваў на падаўленне паўстання вялікія воінскія сілы. Але яны цярпелі адно паражэнне за другім. Рым дрыжаў, але Спартак павёў сваю армію на поўнач. Там, за Альпамі, паўстанцы спадзяваліся набыць свабоду. Аднак частка рабоў захацела застацца ў Італіі. Не ўсім рабам падабалася суровая дысцыпліна, якую ўстанавіў Спартак. Яны пакінулі армію і ў той жа час былі знішчаны рымскімі легіянерамі.

Паўстанне разгарэлася і ператварылася ў сапраўдную вайну. Яе полымем была ахоплена амаль уся Італія. Колькасць паўстанцаў павялічылася да 120 тысяч чалавек.

У гэты час рымскую армію супраць Спартака ўзначаліў палкаводзец ***Марк Крас***. Па невядомай прычыне паўстанцы нечакана павярнулі на поўдзень. Яны зноў прайшлі ўвесь Апенінскі паўвостраў і выйшлі да марскога праліва, які аддзяляе Італію ад Сіцыліі. Спартак дамовіўся з піратамі, каб яны перакінулі паўстанцаў на востраў. Піраты грошы ўзялі, але перавозіць паўстанцаў не захацелі. Абмануты Спартак павінен быў павярнуць назад. Аднак армія Краса адрэзала ўсе шляхі да адступлення. Рашаючая бітва адбылася вясной 71 года да н. э. Аслабленае войска Спартака было



Правообладатель Народная асвета

разбіта, а сам ён гераічна загінуў у няроўным баі. Узятыя ў палон рабы-паўстанцы былі распяты ўздоўж дарогі, якая вяла з Капуі ў Рым.

*Такім чынам, рабства ў Рыме атрымала большае распаўсюджанне, чым у Грэцыі. Рымляне з пагардай ставіліся да рабоў і не лічылі іх за людзей. Рабы спрабавалі змагацца за свабоду і не раз паўставалі супраць сваіх гаспадароў. Самае вядомае паўстанне рабоў было пад кіраўніцтвам Спартака. Яго імя да гэтага часу застаецца сімвалам барацьбы за свабоду і чалавечую годнасць.*

**1.** Пералічыце крыніцы рабства ў Старажытным Рыме.
**2.** Якім было становішча рымскіх рабоў? Што агульнага вы можаце адзначыць у адносінах да рабоў ва ўсіх краінах Старажытнага свету?
**3.** Ці мірыліся рабы са сваім становішчам? Як вы лічыце, чаму самых моцных і вынослівых з іх аддавалі ў гладыятарскія школы?
**4.** Складзіце паведамленне аб адным з наступных падзей ад імя яго ўдзельніка: а) пра ўцёкі гладыятараў з Капуі; б) пра рашаючую бітву паўстанцаў супраць рымскай арміі ў 71 годзе да н. э.
**5.** Вызначце галоўную прычыну паўстання пад кіраўніцтвам Спартака і яго мэту. Чаму яно пацярпела паражэнне? У чым заключаецца яго гістарычнае значэнне?
**6*.** Падумайце, чаму чалавек, які пабыў у рабстве, не меў права быць грамадзянінам.

## Для дапытлівых

**Паўстанне Спартака** (Паводле Плутарха)

Спартак пакрысе адыходзіў да мора. Сустрэўшы ў праліве пірацкія судны, ён вырашыў адправіцца ў Сіцылію і, перакінуўшы на востраў 2000 чалавек, аднавіць сіцылійскую вайну, якая толькі нядаўна патухла і патрабавала няшмат гаручага матэрыялу, каб зноў выбухнуць. Піраты дамовіліся са Спартаком, але, узяўшы падарункі, абманулі яго і адплылі. Тады ён зноў павярнуў ад мора...



Правообладатель Народная асвета

Крас, падышоўшы сюды, пастараўся ўмацаваць сцяною перашыек, каб адначасова і даць занятак свайму войску, і не даць ворагу падвозіць правіянт. Ён правёў ад мора да мора праз перашыек роў і над ровам узвёў сцяну вялікай вышыні і трываласці. Спартак убачыў, што яго войска акружана сцяною.



Гібель Спартака.
*Сучасны малюнак*

Крас распачаў бітву, самую вялікую з былых у гэтую вайну. У ёй загінула 12 300 рабоў. Спартак пасля паражэння пачаў адступаць. Затым ён рушыў на самога Краса, але з-за мноства ўдзельнікаў бітвы і параненых яму не ўдалося дабрацца да рымскага палкаводца. Затое ён забіў двух цэнтурыёнаў (камандзіраў), якія ўступілі з ім у бой.

Світа Спартака ўцякла, а ён, акружаны вялікай колькасцю ворагаў і мужна адбіваючы іх удары, у рэшце рэшт быў засечаны.

**Пытанні да дакумента.** Чым тлумачыць аўтар паражэнне паўстанцаў? Як лічыце вы?

## § 23. Падзенне Рымскай рэспублікі і стварэнне імперыі

**Успомніце.** Чаму ў выніку ваеннай рэформы Гая Марыя вырасла роля рымскіх палкаводцаў?

**1. Грамадзянскія войны.** У канцы II стагоддзя да н. э. у Рыме ўзмацніліся супярэчнасці паміж сенатарскай арыстакратыяй і часткай багатых рымлян. Апошнія былі незадаволены тым, што ўсе вышэйшыя пасады ў рэспубліцы знаходзіліся ў руках сенатараў-арыстакратаў. Іх падтрымлівалі італійскія саюзнікі Рыма, якія патрабавалі



Правообладатель Народная асвета

рымскага грамадзянства. Гэтыя супярэчнасці прывялі да непрымірымых і жорсткіх ***грамадзя́нскіх войнаў***, г. зн. да ўзброенай барацьбы за ўладу ў дзяржаве паміж рознымі групамі насельніцтва.

У ходзе адной з такіх войнаў да ўлады прыйшоў ***Юлій Цэзар***. Гэта быў выдатны палкаводзец і дзяржаўны дзеяч. Амаль усё сваё жыццё ён правёў у ваенных паходах. Славу яму прынесла заваяванне Галіі ў 50-х гадах да н. э. Яго любілі народ і простыя салдаты.

Рымскія арыстакраты, напалоханыя ўзмацненнем і папулярнасцю Цэзара, імкнуліся не дапусціць яго вярнуцца з Галіі ў Рым. Яны прызвалі для абароны вядомага палкаводца ***Пампея.*** Даведаўшыся аб гэтым, у **49 годзе да н. э.** Цэзар вырашыў узяць вярхоўную ўладу ў свае рукі. Са словамі: «Жэрабя кінута!» ён разам са сваімі войскамі перайшоў пагранічную раку *Рубікон* і рушыў на Рым. З гэтага часу выраз «перайсці Рубікон» стала азначаць рашучыя дзеянні. Сенатары разам з Пампеем у страху ўцякалі са сталіцы. Войскі Цэзара без бою ўвайшлі ў Рым. Насельніцтва горада з радасцю сустрэла палкаводца.

**2. Праўленне Цэзара.** Стаўшы ўладаром Рыма, Юлій Цэзар засяродзіў у сваіх руках неабмежаваную ўладу. Сенат і консулы паслухмяна выконвалі яго загады. Цэзара абвясцілі пажыццёвым ***дыкта́тарам***, г. зн. службовай асобай, якая валодае ўсёй паўнатой улады. Моцная аднаасобная ўлада Цэзара спыніла кровапраліцце і садзейнічала ўмацаванню дзяржавы. Цэзар аддзякаваў сваім верным салдатам. Многія атрымалі зямельныя ўчасткі і грошы. Насельніцтву правінцый шчодра давалася права рымскага грамадзянства.


Гай Юлій Цэзар

Аднак частка сенатараў была незадаволена Цэзарам, які не ўтойваў свайго імкнення да царскай улады. Прыхільнікі рэспублікі арганізавалі загавор і забілі безабароннага Цэзара падчас



Правообладатель Народная асвета

пасяджэння ў сенаце **15 сакавіка 44 года да н. э.** Рымляне не падтрымалі змоўшчыкаў. Ратуючыся ад народнага гневу, сенатары-забойцы паспешліва ўцяклі з Рыма.

Цэзара пахавалі з вялікай пашанай. Паводле рымскай традыцыі, яго цела было аддадзена агню. На месцы спалення ў гонар Цэзара рымляне ўзвялі храм. Забойства дыктатара не прывяло да аднаўлення ранейшага праўлення. У Рыме зноў успыхнула барацьба за вярхоўную ўладу.

Новая грамадзянская вайна ішла паміж прыхільнікамі Цэзара і абаронцамі рэспублікі. Вайна закончылася перамогай палкаводца ***Актавіяна***, які з'яўляўся родзічам Юлія Цэзара.

**3. Імператар Актавіян Аўгуст.** У **27 годзе да н. э.** сенат абвясціў Актавіяна галавой Рымскай дзяржавы. З гэтага часу ён стаў називацца ***імпера́тар*** Цэзар Аўгуст. Імператар у той час азначала «военачальнік», «палкаводзец». Слова «Цэзар» сведчыла аб родасных сувязях з Юліем Цэзарам. А імя Аўгуст, г. зн. «свяшчэнны», даў яму сенат.

Імператар Аўгуст засяродзіў у сваіх руках вялікую ўладу. Ён быў галоўнакамандуючым усіх ваенных сіл дзяржавы, вярхоўным жрацом, народным трыбунам і галоўным суддзёй. Яго асобу ахоўвала спецыяльна створаная палацавая гвардыя. Аднак Аўгуст не забыў пра трагічны лёс Юлія Цэзара. Таму Рымская дзяржава па-ранейшаму называлася рэспублікай. У сапраўднасці ж Рым ператварыўся ў ***імпе́рыю***, г. зн. у дзяржаву, у якой сенат і народны сход цалкам падпарадкоўваліся волі імператара.



Актавіян Аўгуст

Імператар Аўгуст клапаціўся аб сваім аўтарытэце, імкнуўся заваяваць сімпатыі простых людзей. Ён вёў сціплы лад жыцця. На вуліцах з'яўляўся ў простым адзенні, бясплатна раздаваў хлеб беднякам, клапаціўся аб выхаванні



Правообладатель Народная асвета

моладзі. Суровыя законы Аўгуста асуджалі раскошу і непрыстойныя паводзіны. Ён правіў 41 год і памёр у **14 годзе н. э**.

У перыяд праўлення Аўгуста Рымская дзяржава дасягнула вялікай магутнасці. Улада Рыма распаўсюджвалася на захадзе да Атлантычнага акіяна, на ўсходзе — да Каўказа. Былі канчаткова пакораны гальскія плямёны. Рымскія легіёны дасягнулі Дуная і Днястра. Усе тэрыторыі, на якія распаўсюджвалася ўлада Рыма, сталі называцца Рымскай імперыяй.

*Такім чынам, супярэчнасці паміж сенатарскай арыстакратыяй і багатымі рымлянамі прывялі да працяглых грамадзянскіх войнаў. Грамадзянскія войны сталі адной з прычын падзення рэспублікі і стварэння імперыі. Першым імператарам стаў Актавіян Аўгуст.*

1. Якія супярэчнасці ў рымскім грамадстве прывялі да грамадзянскіх войнаў?
2. Раскажыце, як Юлій Цэзар стаў аднаасобным правіцелем. На каго ён абапіраўся? Хто яго не падтрымліваў?
3. Адзначце на стужцы часу даты ўстанаўлення рэспублікі і захаплення Цэзарам улады ў Рыме. Колькі гадоў прайшло паміж гэтымі падзеямі?
4. Чым закончылася грамадзянская вайна ў Рыме? Каго і калі сенат абвясціў уладаром Рымскай дзяржавы?

5*. Растлумачце, чаму менавіта ад Актавіяна вядзе адлік Рымская імперыя.

## Для дапытлівых

**Юлій Цэзар** (Паводле Святонія)

Кажуць, ён быў невысокага росту, светласкуры, добра складзены, твар меў крыху паўнаваты, вочы чорныя, жывыя. Здароўем ён вызначаўся выдатным...

У красамоўстве і ў ваеннай справе ён меў не меншую, калі не большую славу, чым лепшыя іх знаўцы. Ён ніколі не вёў войскі па дарогах, зручных для засады, не разведаўшы перад гэтым



Правообладатель Народная асвета

мясцовасці. Калі ж яго войска пачынала адступаць, ён часта адзін аднаўляў парадак, кідаючыся насустрач тым, хто ўцякаў. Воінаў ён цаніў не за нораў і не за род і багацце, а толькі за мужнасць; а ў абыходжанні з імі аднолькава бываў і строгім, і спагадлівым. Учынкі салдат ён не заўсёды заўважаў і не заўсёды пэўным чынам караў. Уцекачоў і бунтаўшчыкоў ён праследаваў і караў жорстка. На сходах ён звяртаўся да іх не «воіны», а ласкавей — «саратнікі». Усім гэтым ён дабіваўся ад салдат рэдкай адданасці і адвагі.

**Пытанні да дакумента.** Выдзеліце ў тэксце ключавыя словы, якія ўказваюць на талент Цэзара як палкаводца.

## § 24. Улада рымскіх імператараў

**Успомніце.** Каму належала ўлада ў Рыме пасля выгнання апошняга цара?

У Рымскай рэспубліцы вярхоўная ўлада была раздзелена. Ёю валодалі сенат, консулы і Народны сход. З прыходам да ўлады Актавіяна папярэдні парадак стаў мяняцца. Цяпер амаль усё дзяржаўнае кіраванне паступова падпарадкоўвалася імператару. Пераход ад рэспублікі да імперыі адбыўся не адразу. Рымляне яшчэ памяталі рэспубліканскія свабоды.

**1. Паўнамоцтвы імператараў.** Рымскія імператары мелі права камандаваць войскам, вырашаць пытанні вайны і міру. Імператар уносіў новыя законы, адмяняў старыя і быў галоўным суддзёй. Скаргаў на яго рашэнні не прымалася. У рымскіх правінцыях ён назначаў сваіх наместнікаў, устанаўліваў памеры падаткаў. Гэта прыносіла імператарскай казне вялікія даходы. Імператар займаў галоўныя жрэцкія пасады, а яго асоба лічылася свяшчэннай.

**2. Рымскія імператары: справы і лёсы.** Усе рымскія імператары імкнуліся пашырыць сваю ўладу. Для гэтага часта прымянялася насілле і жорсткасць. Так, імператар ***Аўгуст*** бязлітасна па-



Правообладатель Народная асвета




Будова грамадства ў Рымскай імперыі

даўляў усе выступленні сваіх праціўнікаў. Расказваюць, што пасля ўзяцця выступіўшага супраць яго горада ён пакараў смерцю ўсіх палонных. Тых, хто прасіў аб літасці, ён абрываў словамі «Ты павінен памерці». Самай вялікай заслугай Аўгуста стала ўстанаўленне міру і парадку ў дзяржаве. Грамадзянскія войны спыніліся, а з суседнімі дзяржавамі ўстанавіліся мірныя адносіны. Пачалося будаўніцтва і добраўпарадкаванне Рыма. Аказваліся спрыяльныя ўмовы для мастацтва.

Пераемнікі Аўгуста працягвалі любымі сродкамі ўмацоўваць вярхоўную ўладу імператара. ***Тыберый***, які прыйшоў яму на змену, спачатку адмаўляўся ад улады. Падобныя паводзіны аказаліся прытворнымі. Хутка ён пачаў праследаванне няўгодных яму людзей. Баючыся помсты, Тыберый пасяліўся на востраве Капры. Яго падазронасць да людзей і жорсткія ўчынкі выклікалі ўсеагульную нянавісць. Смерць Тыберыя народ сустрэў з радасцю.



Імператар Тыберый

Акрамя імкнення да неабмежаванай улады, рымскім імператарам былі ўласцівыя і іншыя асаблівасці. Імператар ***Нерон***, напрыклад, пастаянна клапаціўся аб сваёй славе. Ён зайздросціў усім, хто звяртаў на сябе ўвагу публікі. Усе ведалі аб яго імкненні ўдзельнічаць



Правообладатель Народная асвета

ва ўсякіх спаборніцтвах і атрымліваць за гэта ўзнагароды. Аднойчы Нерон загадаў забіць артыста, які сваім спевам заглушыў яго голас. Яшчэ адным прыкладам несапраўднай славы служыць яго загад падпаліць Рым. Віну за гэтае злачынства ўсклалі на іншых людзей. Прыкладам абуральнай раскошы стаў залаты дом Нерона. Пакоі палаца былі пакрыты золатам, упрыгожаны каштоўнымі камянямі і жамчужнымі ракавінамі. Насілле, скупасць і жорсткасць правіцеля прывялі да згубных для яго лёсу вынікаў. Сенат аб'явіў яго ворагам народа. Праследуемы сваімі праціўнікамі Нерон быў забіты.



Імператар Нерон з маці

Імператар ***Траян*** не быў падобны да сваіх папярэднікаў. Пры ім перасталі пастаянна праследаваць грамадзян. Судовыя справы па даносах спыніліся. Пры праўленні Траяна Рымская імперыя вяла актыўныя захопніцкія войны. У выніку дзяржава стала самай вялікай па тэрыторыі за ўсю гісторыю свайго існавання.



Імператар Траян

Да канца III стагоддзя н. э. пераход ад улады народа да ўлады аднаго чалавека завяршыўся канчаткова. Вярхоўны правіцель Рымскай імперыі ***Дыяклецыян*** быў ужо ўладаром усіх падданых імперыі. З цягам часу імператары ўсё больш залежалі ад арміі. А хутка правіцелямі Рыма сталі абвяшчаць выхадцаў з варварскіх плямён.

*Такім чынам, устанаўленне імператарскай улады спыніла кровапралітныя грамадзянскія войны ў канцы існавання рэспублікі. Імперыя аказалася ўстойлівай і праіснавала няўногім больш чым пяць стагоддзяў пасля яе ўтварэння.*



Правообладатель Народная асвета

1. Растлумачце значэнне паняццяў «імператар», «імперыя».
2. Якія паўнамоцтвы імператараў прыносілі рымскай казне вялікія даходы?
3. Што рабілі рымскія імператары для пашырэння і ўмацавання сваёй улады?
4. Пералічыце імёны самых вядомых рымскіх імператараў. Якое агульнае ўражанне склалася ў вас аб іх праўленні?
5*. Растлумачце, чаму імперыя аказалася ўстойлівай і праіснавала нямногім больш чым пяць стагоддзяў пасля яе ўтварэння.

## Для дапытлівых

**Імператар Дыяклецыян** (Паводле А. В. Фёдаравай)

З цягам часу Дыяклецыян зразумеў, што адзін імператар не ў сілах захаваць надоўга ўладу ў тым бушуючым моры, якое ўяўляла сабой у III стагоддзі Рымская імперыя, раздзіраемая міжусобнымі войнамі і акружаная раззлаваным светам варвараў. У 305 г. н. э. ён адрокся ад улады, пасяліўся ў вялікім раскошным палацы каля мора і заняўся развядзеннем кветак і вырошчваннем агародніны. Калі яго сталі клікаць вярнуцца да ўлады, ён, быццам адхіляючыся ад нейкай чумы, адказаў: «О, калі б вы маглі паглядзець на агародніну, вырашчаную маімі рукамі, вы б сказалі, што мне гэтага ніколі не трэба рабіць».

**Пытанні да дакумента.** Як адносіўся імператар Дыяклецыян да ўлады? Што зразумеў Дыяклецыян у канцы свайго праўлення?

# § 25. Рым — сталіца імперыі

**Успомніце.** Што вы ведаеце аб паўсядзённым жыцці старажытных грэкаў?

Да канца I стагоддзя да н. э. Рым быў самым буйным горадам не толькі Міжземнамор'я, але і ўсяго Старажытнага свету. У ім пражывала больш чым 1 мільён чалавек.

**1. «Усе дарогі вядуць у Рым».** Цэнтрам Рыма з'яўляўся *Палацінскі ўзгорак з форумам*, ад якога як сонечныя прамені разы-



Правообладатель Народная асвета

ходзіліся ўсе галоўныя вуліцы горада. Дарогі з далёкіх і блізкіх правінцый працягнуліся да сталіцы. У той час з'явілася прыказка: *«Усе дарогі вядуць у Рым»*. Сапраўды, і сухапутныя, і марскія шляхі вялі ў Вечны горад. Сюды прыязджалі і прыплывалі на караблях купцы, замежныя дыпламаты, прыбывалі шматлікія транспартныя і гандлёвыя караблі з сыравінай і рабамі. Адсюль адпраўляліся ў паходы палкаводцы з арміяй.



Арка імператара Канстанціна

На Палаціне былі пабудаваны палацы імператараў, якія ззялі золатам, мармурам і каштоўнымі камянямі. Слова «палацін» ва ўсіх еўрапейскіх мовах стала сімвалам палаца. У беларускую мову яно ўвайшло словамі «палац» і «палата». На форуме ў гонар свайго праўлення і перамог імператары ўзводзілі помнікі, розныя збудаванні, будавалі трыумфальныя *аркі*, фантаны. Аркі ўяўлялі сабой дугападобныя перакрыцці праёмаў у сцяне або пралётаў паміж дзвюма апорамі. Цэнтр горада ўжо ў той час стаў сапраўдным музеем пад адкрытым небам. Гонарам рымлян былі збудаванні для грамадскіх відовішчаў. Знаходзіліся гэтыя вялікасныя будынкі сярод цяністых паркаў з фантанамі і шматлікімі статуямі.

З самай раніцы вуліцы і плошчы горада былі запоўнены натоўпамі людзей. У Рыме забаранялася ездзіць на вазах і конях. Багатым дазвалялася перамяшчацца на насілках, якія неслі спецыяльна падрыхтаваныя рабы гаспадара. Большасць жа грамадзян павінна была хадзіць пешшу.

**2. Лазні.** Любімым месцам адпачынку рымлян з'яўляліся грамадскія лазні — *тэрмы*. Яны нічым не падобныя на нашы сучасныя грамадскія лазні. Гэта былі вялікасныя збудаванні, якія складаліся з некалькіх будынкаў, паркаў, спартыўных пляцовак, фантанаў. Наведвалі лазні ўсе: як багатыя, так і бедныя. Прыходзілі сюды не



Правообладатель Народная асвета

толькі мыцца, але і адпачыць, правесці вольны час у размовах з сябрамі. Можна было пагуляць у мяч, пад'есці, пачытаць кнігу ў спецыяльных бібліятэчных залах, паглядзець на дрэсіраваных звяроў або экзатычных жывёл у заасадзе.

Раздзеўшыся ў гардэробе, людзі ўваходзілі ў вялікую залу з басейнам, напоўненым халоднай вадой. Адтуль дзверы вялі ў іншыя памяшканні, дзе знаходзіліся ванны або басейны з вадой, тэмпература якой паступова павялічвалася. За імі размяшчалася парылка — зала, напоўненая гарачай парай. Тут, лежачы на лаўках, людзі парыліся. Былі яшчэ памяшканні, якія абаграваліся сухім паветрам.

Уваход у такія лазні каштаваў нядорага, часам і зусім быў бясплатным. Утрыманне рымскіх лазняў аплачвалі часцей за ўсё імператар або дзяржава.

**3. Паўсядзённае жыццё простых гараджан.** Рымляне амаль увесь вольны час праводзілі па-за домам, на вуліцах горада, у ценю калон прыгожых плошчаў, паблізу вялікасных палацаў, у парках з фантанамі і лазнях. Нічога дзіўнага ў гэтым не было. Большасць грамадзян жыла ў дрэнных умовах. У бедных кварталах цесна стаялі высокія пяці-, шасціпавярховыя дамы. Жыццё ў такіх дамах без каналізацыі, водаправода і асвятлення было цяжкім.

У кватэрах верхніх паверхаў плата бралася меншая, паколькі ўмовы былі яшчэ горшыя: туды дабіраліся па крутых лесвіцах, якія нагадвалі драбіны. У цесных аднапакаёвых памяшканнях, размешчаных высока пад дахам, жыхары летам цярпелі гарачыню, а зімой холад.



Дамы ў Рыме.
*Рэканструкцыя*

Вуліцы горада былі шумнымі і бруднымі. Пешаходы маглі быць абліты нечыстотамі, якія гаспадыні вылівалі праз вокны. Ноччу галасы і



Правообладатель Народная асвета

шум не давалі спакойна спаць. З-за неасцярожнага абыходжання з агнём часта ўзнікалі пажары.

*Такім чынам, Рым з'яўляўся не толькі палітычным, але і культурным цэнтрам Рымскай дзяржавы. У ім былі сканцэнтраваны вялікасныя будынкі і палацы. Вялікай папулярнасцю карысталіся лазні, у якіх з задавальненнем праводзілі час багатыя і бедныя. У адрозненне ад багатых большасць грамадзян пражывала ў няўтульных бедных кварталах.*

## Для дапытлівых

### Становішча знатнай жанчыны

Становішча жонкі ў доме мужа было пачэсным: яе паважліва называлі матронай, або маці сям'і. Жонка ўдзельнічала ў званых абедах. Яна магла свабодна прымаць гасцей, не толькі жанчын, але і мужчын. Знатныя матроны ў Старажытным Рыме аказвалі ўплыў на палітыку.



Сямья знатных рымлян

**Пытанні да дакумента.** Чаму рымская жанчына імкнулася выйсці замуж і стварыць сям'ю?

1. Як вы разумееце выраз «Усе дарогі вядуць у Рым»? Што прыцягвала ў гэты горад жыхароў Міжземнамор'я?
2. Чаму рымляне ганарыліся сваёй сталіцай і любілі яе?
3. Чым можна растлумачыць імкненне бедных рымскіх грамадзян праводзіць свабодны час па-за домам, на вуліцы?
4. Параўнайце паўсядзённае жыццё грамадзян Рыма і Афін. Які вывад можна зрабіць?
5. Вядома, што ў рымлян існавала прыказка «Адпачынак — пасля спраў». Аб чым паведамляе нам яе змест? Прывядзіце прыклады падобных беларускіх прыказак на гэтую ж тэму.



Правообладатель Народная асвета

# § 26. Культура Старажытнага Рыма

**Успомніце.** Аб асноўных дасягненнях старажытных грэкаў у галіне літаратуры і мастацтва.

**1. Рымляне — вучні грэкаў.** На рымлян зрабіла вялікі ўплыў грэчаская культура. На аснове грэчаскага алфавіта рымляне стварылі свой, лацінскі, алфавіт. Ім карыстаюцца многія народы свету і ў цяперашні час. Рымляне перакладалі на сваю мову літаратурныя творы грэкаў. У школах дзеці вывучалі грэчаскую мову і літаратуру. Багатыя рымляне ездзілі вучыцца ў Афіны, Карынф, Мілет і іншыя грэчаскія гарады. У выніку атрымалася так, што Рым заваяваў Балканскі паўвостраў, а сам быў пакораны мастацтвам грэкаў.

**2. Рымская літаратура і яе значэнне.** Рымская мастацкая літаратура стала сусветна вядомай дзякуючы паэзіі. Яе «залаты век», час росквіту адносіцца да перыяду праўлення першага рымскага імператара Аўгуста. У гэты час у Рыме было шмат таленавітых



Мецэнат прадстаўляе імператару Аўгусту свабоднае мастацтва. *Карціна італьянскага мастака Дж. Б. Цьепала*



Правообладатель Народная асвета

паэтаў. Найбольш вядомымі сталі ***Вергілій***, ***Гарацый*** і ***Авідзій***. Багаты рымлянін і сябар імператара Аўгуста ***Мецэнат*** арганізаваў у сваім доме гурток паэтаў. Ён аказваў ім разнастайную матэрыяльную дапамогу. За гэта пісьменнікі павінны былі служыць інтарэсам новага рэжыму на чале з імператарам. Імя Мецэната стала агульнай назвай і азначае «багаты апякун мастацтва».

Паэт Вергілій у сваёй паэме «Энеіда» раскрывае веліч Рыма, абгрунтоўваючы права Рыма кіраваць усім светам.

Блізкім сябрам Мецэната быў знакаміты рымскі паэт Гарацый. Ён чытаў свае вершы пры двары Аўгуста, быў у гуртку Мецэната. Гарацый стаў неперадўзыдзеным майстрам літаратурнай творчасці. Да скарбаў сусветнай паэзіі належыць яго ода «Помнік». З Гарацыя бралі прыклад рускія паэты Дзяржавін, Пушкін, Лермантаў. Пушкінскія радкі «Я памятник воздвиг себе нерукотворный» ведае любы сучасны адукаваны чалавек.

Авідзій — паэт іншага паэтычнага складу. Ён апяваў чалавечыя пачуцці, зразумелыя ўсім людзям. Тэмай для паэзіі станавілася жыццё простых людзей, навакольныя рэчы і нават любімы папугай. Гэта было выклікам тым, хто ўслаўляў суровыя норавы продкаў і самога імператара. Такую пазіцыю Авідзію не даравалі. Яго назаўсёды выслалі ў глухую рымскую правінцыю. Там ён склаў свае бессмяротныя творы «Метамарфозы» і «Журботныя элегіі», поўныя суму па радзіме.

**3. Асноўныя помнікі архітэктуры і скульптуры.** Архітэктура і скульптура адлюстроўвалі магутнасць і багацце Рыма. Рымскія збудаванні з годнасцю апраўдвалі сваё прызначэнне. Пабудаваны ў I стагоддзі н. э. *Калізей* змяшчаў дзясяткі тысяч гледачоў. Ён у многім нагадвае сучасны стадыён. Рымляне не толькі выкарысталі дасягненні архітэктуры грэкаў, але і ў справе будаўніцтва пайшлі далей сваіх настаўнікаў. Яны вынайшлі *бетон*. Выкарыстоўваючы гэты матэрыял, апаленую цэглу і рознакаляровае шкло, рымляне стварылі трывалыя і шыкоўныя збудаванні.



Правообладатель Народная асвета



Пантэон

«Храм усіх багоў» — *Пантэон* добра захаваўся да нашых дзён. Самае дзіўнае ў гэтым збудаванні — купал храма, які нагадвае небасхіл.

Пабудовы ўпрыгожваліся скульптурамі. Іх размяшчалі на плошчах, у парках і скверах. Казалі, што Рым быў заселены статуямі. Сенат нават выдаваў пастановы знесці некаторыя скульптуры. Дзіўнай з'явай культуры стала рымская партрэтная скульптура. Яна з дакладнасцю перадавала рысы твару і характар чалавека. І гэта падабенства — важнейшая яе асаблівасць.



Скульптура Артэміды-паляўнічай. *Рымская копія II ст. да н. э.*

Вялікае значэнне для гаспадарчага жыцця і ваеннай справы мела будаўніцтва форумаў, арак, мастоў, дарог. Многія з гэтых збудаванняў захаваліся да цяперашняга часу і выклікаюць захапленне сваёй грандыёзнасцю і трываласцю.

*Такім чынам, рымская культура мела свае арыгінальныя рысы. Паэты Вергілій,*



Правообладатель Народная асвета

*Гарацый і Авідзій праслаўлялі веліч рымскага народа, яго ідэалы і лад жыцця. Самымі знакамітымі архітэктурнымі збудаваннямі сталі Калізей і Пантэон. Рымская партрэтная скульптура здзіўляла сваёй дакладнасцю ў перадачы рысаў твару чалавека і яго характару. Практычны падыход да жыцця рымлян выявіўся ў будаўніцтве дарог і збудаванняў грамадскага прызначэння.*

**1.** Прывядзіце доказы таго, што рымляне сталі вучнямі заваёваных грэкаў.
**2.** Які век у рымскай паэзіі лічыцца «залатым»? Назавіце імёны найбольш вядомых паэтаў гэтага часу.
**3.** Што азначае тэрмін «мецэнат»? Растлумачце яго паходжанне.
**4.** Як вы думаеце, наколькі былі зацікаўлены рымскія імператары ў творчасці таленавітых паэтаў?
**5.** Што з дасягненняў помнікаў рымскай архітэктуры захавалася ў цяперашні час?
**6*.** Ці можна пагадзіцца з меркаваннем аб тым, што «Рым скарыў свет не толькі мячом — ён перамог яго сваёй культурай»? Чаму?

## Для дапытлівых

### З сямі цудаў імператарскага Рыма (Паводле А. І. Неміроўскага)

### Калізей

У 72 годзе н. э. у Рыме было пачата будаўніцтва гіганцкага амфітэатра. У Сярэднія вякі ён атрымаў назву Калосеум (каласальны, вялікі), адсюль — Калізей. Да нашага часу захаваліся тры каменныя ярусы. Зараз Калізей — гонар Рыма. Але вялікая колькасць машын, турыстаў, ды і ўвогуле рух аўтамабільнага транспарту, уяўляюць для гэтага рымскага цуда вялікую небяспеку.

**Пытанні да дакумента.** Што азначае слова «калізей»? Якое выпрабаванне перажывае Калізей у нашы дні?



Калізей



Правообладатель Народная асвета

# § 27. Рэлігія старажытных рымлян

**Успомніце.** Чым рэлігіі старажытных егіпцян і грэкаў адрозніваліся ад рэлігіі старажытных яўрэяў?



Багіня Веста

**1. Багі ў асабістым жыцці рымлян.** Першапачаткова старажытныя рымляне шанавалі духаў прыроды. Кожны гай, рака, крыніца — усё ў прыродзе мела сваіх духаў-апекуноў. У кожнага чалавека таксама былі духі-апекуны. У мужчын — *геніі*. Апякункамі жанчын былі асобныя боствы — *юноны*. Менавіта геніі рабілі ўсіх людзей непаўторнымі. Рымляне прыносілі багатыя дары сваіму генію ў дзень нараджэння. Апякункай дамашняга ачагу была багіня *Веста*. Ёй прысвячаўся агонь ачагу. Сямейнымі духамі, якія аберагалі жыллё, лічыліся *пенаты*.

Рымляне верылі розным прыметам і прадказанням. Прадказанні не раз вырашалі лёс Рыма. Напрыклад, пасля разбурэння горада галамі сенат раздумваў — адбудоўваць горад на ранейшым месцы ці перасяліцца на новае. У момант спрэчак сенатары выпадкова пачулі голас камандзіра, які скамандаваў воінам: «Застанемся тут». Сенат вырашыў, што гэта і ёсць важная падказка багоў.

**2. Багі Рымскай дзяржавы.** З развіццём Рымскай дзяржавы з'явіліся агульныя для ўсёй краіны багі. У іх гонар узводзіліся пышныя храмы, ім служылі шматлікія жрацы. Жрацы праводзілі абрады і варажбу, каб даведацца пра волю багоў і дабіцца іх прыхільнасці.

Вярхоўным уладаром багоў і людзей у рымлян лічыўся суровы грамавержац *Юпітэр*. Ваяўнічыя рымляне ўшаноўвалі жорст-



Правообладатель Народная асвета

кага бога вайны *Марса*. Багіня *Венера* была ў рымлян багіняй прыгажосці.

Самыя важныя храмы будаваліся на *форуме* — галоўнай плошчы сталіцы. Адзін з храмаў быў прысвечаны богу *Янусу*. Яго ўяўлялі з двума тварамі, накіраванымі ў розныя бакі. Янус — бог, які, паводле меркавання рымлян, звязваў мінулае і будучае. Ён апекаваўся над усімі пачынаннямі. Калі Рым ваяваў, вароты храма былі адчынены. Толькі некалькі разоў за ўсю тысячагадовую гісторыю горада гэтыя вароты ненадоўга зачынялі.



Бог Марс

Багіня дамашняга ачага Веста стала апякункай усёй Рымскай дзяржавы як адзінай сям'і. У храме гэтай багіні гарэў незгасальны агонь, які ўвасабляў адзіны ачаг цэлай краіны. Менавіта гэты храм рабіў усіх грамадзян Рыма адной абшчынай.



Бог Янус

Рымляне ўшаноўвалі багіню абуджэння сіл прыроды *Юнону*. У нашай мове захавалася роднаснае слова — «юнацтва». Адно з прозвішчаў гэтай багіні — Манета (Дарадчыца). У яе храме чаканілі грошы. Яна лічылася апякункай фінансаў у Рыме. Потым гэта прозвішча ў шмат якіх мовах стала назвай грошай — «манет».

**3. Пантэон Рыма.** Пасля прысваення імператару Актавіяну прозвішча Аўгуст — «свяшчэнны» — яго сталі шанаваць амаль як бога. Бюсты імператара-бога ставілі ў храмах па ўсёй імперыі.

У сталіцу вялікай імперыі прыязджалі і сяліліся людзі з розных краін. У Рыме з'явіліся храмы чужых багоў. Але хутка гэтыя багі сталі папулярнымі і сярод рымлян. Па ўсёй Рымскай імперыі



Правообладатель Народная асвета

шанавалі знакамітую егіпецкую багіню-маці *Ісіду*. Рымскія легіянеры пакланяліся іранскаму ваяўнічаму богу *Мітры* — пераможцу магутнага быка. У выніку з'явілася ідэя пабудаваць у Рыме вялікасны храм усім багам імперыі. Ён атрымаў назву *Пантэон*. У перакладзе са старажытнагрэчаскай мовы гэта азначае «ўсе багі». Храм атрымаўся грандыёзным — яго купал быў самым вялікім у Рыме.

Многія назвы месяцаў звязаны з імёнамі рымскіх багоў. Апекуном календара быў бог Янус. У яго гонар названы першы месяц года. Март быў названы ў гонар бога вайны Марса. Юлій Цэзар назваў адзін з месяцаў сваім іменем. А ў хуткім часе з'явіўся і месяц у гонар Актавіяна Аўгуста. У рускай мове назвы месяцаў: январь, март, июль, август.

*Такім чынам, спачатку рымляне пакланяліся духам прыроды. Заваяваўшы многія народы, яны стварылі Пантэон — храм у гонар багоў усіх народаў Рымскай імперыі.*

**1.** Якія ўражанні выклікалі ў вас раннія вераванні рымлян?
**2.** Што вы даведаліся пра багоў Рымскай дзяржавы? Чаму самыя важныя храмы ў іх гонар узводзіліся на форуме?
**3.** Што ўяўляў сабой рымскі Пантэон?
**4.** Разгледзьце ілюстрацыі ў вучэбным дапаможніку і растлумачце:
а) як у Пантэоне з'явіліся рысы грэчаскай архітэктуры;
б) што ў ім было самастойным вынаходствам рымлян.
**5.** Параўнайце рэлігіі старажытных рымлян і старажытных грэкаў. Зрабіце вывад. Чаму багі Рыма былі падобны да багоў Грэцыі?
**6*.** Растлумачце, чаму па ўсёй Рымскай імперыі шанавалі егіпецкую багіню Ісіду.

## § 28. Хрысціянства ў Рымскай імперыі

**Успомніце.** Дзе ўзнікла адзінабожжа і быў створаны Стары Запавет?

У Старажытным Рыме шырока распаўсюджваліся культы ўсходніх божастваў. Егіпецкай багіні Ісідзе пакланяліся ва ўсёй імперыі. Але не ўсе чужаземныя багі падабаліся рымлянам. Так, улады жорстка праследавалі хрысціян. Нягледзячы на ганенні,



Правообладатель Народная асвета



Пакаранне смерцю хрысціян. *Сучасны малюнак*

хрысціянства ўцалела і стала афіцыйнай рэлігіяй. Хрысціянская рэлігія аказала вялікі ўплыў на гісторыю, жыццё і культуру не толькі народаў Еўропы, але і ўсяго свету.

**1. Ісус Хрыстос і яго вучэнне.** Аснову хрысціянскай рэлігіі складае жыццё і вучэнне ***Ісуса Хрыста***.

Ісус Хрыстос нарадзіўся падчас праўлення Аўгуста ў далёкай Палесціне, заваяванай Рымам у I стагоддзі да н. э.

У юнацкія гады ён здзіўляў усіх сваімі мудрымі разважаннямі. Ва ўзросце 30 гадоў стаў вандруючым прапаведнікам, вылечваў людзей і, адпаведна з новазапаветнымі кнігамі, тварыў цуды.

Ісус гаварыў, што людзі загразлі ў зле і несправядлівасці, блізіцца канец свету і хутка наступіць дзень Божага суда. Ён заклікаў людзей тварыць добрыя справы, любіць і паважаць адзін другога, быць міласэрнымі да прыніжаных і пакрыўджаных. Вучыў любіць «Бога і бліжняга як самога сябе», «не рабіць другім таго, што не жадаеш сабе». Сябе ён называў Сынам Божым і Сынам Чалавечым, які прыйшоў у гэты свет, каб вырагаваць людзей. І для тых, хто ўвераваў у яго, хто пакутаваў і быў прыніжаны, наступіць Царства Божае на зямлі — царства дабра і справядлівасці. Адзін з распаў-



Правообладатель Народная асвета

сюджвальнікаў хрысціянства апостал (пасланнік) Павел вучыў: усе роўныя перад Богам — і эліны і іудзеі, і рабы і свабодныя, і мужчыны і жанчыны.

Словы Ісуса былі простыя і зразумелыя, знаходзілі водгук у сэрцах тых людзей, якім так не хапала дабра і справядлівасці. Вучні і паклоннікі Ісуса называлі яго ***Хрыстос***, а сябе — хрысціянамі. Першымі хрысціянамі станавіліся тыя, каму жылося асабліва цяжка — бednякі, удовы, сіроты, калекі.

Рымскія ўлады варожа ставіліся да хрысціян. Іудзейскія свяшчэннікі таксама бачылі ў Хрысце небяспечнага бунтаўшчыка. Яны абвінавацілі яго ў парушэнні рэлігійных правіл. Ісуса схапілі і прыгаварылі да смертнай кары за тое, што ён «назваў сябе Сынам Божым». Ісус быў укрыжаваны і яго пакінулі паміраць на крыжы. Яму было тады каля 33 гадоў.

На трэці дзень пасля пакарання разнеслася чутка, што Хрыстос уваскрэс. Ён сустрэўся з вучнямі і абяцаў вярнуцца для правядзення Божага суда.

**2. Распаўсюджанне хрысціянства.** Першыя хрысціянскія абшчыны ўзніклі ў Іудзеі. Хутка яны з’явіліся ў Рыме, Італіі, Грэцыі, Малой Азіі. Члены хрысціянскіх абшчын называлі адзін другога братамі і сёстрамі, праводзілі сумесныя малітвы і трапезы.



Распяцце Ісуса Хрыста.
*Сучасны малюнак*

У канцы II стагоддзя н. э. хрысціянства распаўсюдзілася на большай частцы Рымскай імперыі. Улады праследавалі хрысціян. Многія з іх паміралі пакутніцкай смерцю. Але хрысціянскіх абшчын станавілася ўсё больш і больш. У іх уступалі не толькі беднякі, але і заможныя рымляне. Кіравалі хрысціянскімі абшчынамі спецыяльна выбраныя кіраўнікі — *епіскапы*.



Правообладатель Народная асвета

Хрысціяне не заклікалі да супраціўлення рымскай уладзе і разбурэння імперыі. Таму ўлады паступова змянілі свае адносіны да новай рэлігіі. Яны вырашылі выкарыстаць яе для падтрымання парадку ў вялікай дзяржаве. Асабліва прывабнымі для іх былі ідэі хрысціянскага цярпення і пакоры, непраціўлення злу насіллем. Першым імператарам, які ўсвядоміў сілу хрысціянства, быў ***Канстанцін***. У 313 годзе з'явіўся ўказ, паводле якога дазвалялася будаваць храмы і адкрыта маліцца. У хуткім часе і сам Канстанцін стаў хрысціянінам. У канцы IV стагоддзя хрысціянства стала афіцыйнай рэлігіяй імперыі. Цяпер ужо язычніцкія рэлігіі праследаваліся так жорстка, як і раней хрысціянства.


Імператар Канстанцін

У канцы IV стагоддзя канчаткова склалася царкоўная арганізацыя. Царква ўключала вышэйшае духавенства (епіскапы), ніжэйшае духавенства (святары), манаства і простых хрысціян. Хрысціянскія храмы сталі называцца *царквою*. Адсюль два асноўныя сэнсы гэтага слова: царква — сукупнасць усіх веруючых у Хрыста і царква — храм, месца для сходу асобнай хрысціянскай абшчыны.

Епіскапы вызначылі, якія кнігі, напісаныя аб зямным жыцці Ісуса, лічыць свяшчэннымі. Гэтыя кнігі — ***Евангеллі*** — былі сабраны і склалі ***Новы Запавет***.

*Такім чынам, хрысціянская царква атрымала падтрымку ўладаў, стала апорай дзяржавы. Аднаасобная ўлада імператара мела патрэбу ў адзінай рэлігіі з верай у адзінага Бога.*

**1.** Ісус Хрыстос — хто ён? Чаму вучыў людзей? Пакажыце на карце краіну, дзе гэта адбывалася.
**2.** Калі і сярод якіх груп насельніцтва ўзнікла новая вера?
**3.** Як хрысціянскія запаведзі павінны былі ўплываць на паводзіны чалавека?



Правообладатель Народная асвета

4. Чым растлумачыць варожыя адносіны рымскіх уладаў да хрысціянства?
5. Якія прычыны заставілі імператарскую ўладу змяніць свае адносіны да хрысціянства і зрабіць яе дзяржаўнай рэлігіяй?
6. Растлумачце сэнс слова «царква».

## Для дапытлівых

### Чатыры Евангеллі

Каля трыццаці гадоў пасля смерці і ўваскрэсення Ісуса апосталы — вучні Хрыста — прапаведавалі Евангелле вусна. (Слова «евангелле» азначае «добрая вестка».) За гэты час сабраліся запісы яго выказванняў і паведамленні аб яго дзеяннях. У выніку гэтых запісаў і вусных сведчанняў у розных цэнтрах ранняга хрысціянства ўзніклі Евангеллі.

Евангеллі — гэта не проста біяграфіі Ісуса. Яны вельмі мала паведамляюць аб яго дзяцінстве і юнацтве, затое вельмі шмат аб апошнім тыдні яго жыцця і аб тым, што адбылося пасля яго смерці. Евангеллі нясуць людзям Добрую Вестку, якую прапаведаваў Ісус, падаюць яго вучэнне, паведамляюць аб здзейсненых ім вылечваннях і, самае галоўнае, аб выратаванні, якое ён прынёс свету праз свае смерць і ўваскрэсенне.

**Пытанні да дакумента.** Што новага нясуць людзям Евангеллі?

# § 29. Падзенне Заходняй Рымскай імперыі

**Успомніце.** Імёны найбольш вядомых рымскіх імператараў.

**1. Крызіс гаспадаркі і ўпраўлення ў Рымскай імперыі ў III стагоддзі н. э.** З часу свайго ўзнікнення Рымская імперыя жыла за кошт аграблення пакораных народаў. Але ўжо ў IV стагоддзі н. э. Рымская дзяржава стала грабіць уласны народ. Правіцелі імкнуліся сабраць як мага больш падаткаў, даводзячы гэтым да галечы свабоднае на-



Правообладатель Народная асвета




Падзенне Заходняй Рымскай імперыі

сельніцтва. Каб забяспечыць збор падаткаў, імператар Канстанцін вырашыў прымацаваць людзей да месца жыхарства. Кожнаму быў вызначаны занятак земляробствам ці рамяством і вызначана норма падатку. Залежных і прымацаваных да зямлі людзей называлі ***калонамі***.

Прымяненне рабскай працы ў сельскай гаспадарцы стала нявыгадным. Рабам нельга было давяраць больш сучасныя прылады працы, жняярку або плуг. Акрамя таго, трымаць разам вялікую коль-



Правообладатель Народная асвета

касць рабоў было небяспечным. На гэты кошт у Рыме існавала прыказка: *«Колькі рабоў, столькі ворагаў»*. Працу рабоў сталі замяняць працай калонаў. Калоны мелі невялікія ўчасткі зямлі ва ўласнасці або арэндавалі яе. Прымацаванне калонаў да зямлі прывяло да скарачэння колькасці свабодных людзей, якія папаўнялі б войска. Замест іх сталі набіраць варвараў. Вынікам стала зніжэнне баяздольнасці рымскай арміі.

Да канца IV стагоддзя н. э. у рымскім грамадстве змяніліся думкі і ўчынкі людзей. Рымская знаць стала гультаяватай і фанабэрыстай, легкадумнай і забабоннай. Народ жа ўсё больш цярпеў ад насілля і падаткаў з боку мясцовых і рымскіх чыноўнікаў.

Мяняўся настрой усяго грамадства. Раней кожны грамадзянін быў гатовы ахвяраваць сабой у імя дабрабыту сваёй абшчыны або горада. Цяпер людзі ўжо не клапаціліся аб зямным жыцці. Галоўнымі сталі клопаты аб замагільным жыцці. Усе бачылі навакольны свет грахоўным і раўнадушна глядзелі на пагібель «грамадскай справы». Вера ў традыцыйную рымскую рэлігію патухала. У гэты час многія людзі звярнуліся да хрысціянства.

**2. Рым і варвары.** Рымскае грамадства і дзяржава сустракалі ўсё новыя цяжкасці. Пачаліся пастаянныя сутыкненні з варварамі. Першым сур'ёзным праціўнікам Рыма сталі германскія плямёны *готаў*. Абодва войскі сустрэліся каля *Адрыянопаля* ў 378 годзе. Готы атрымалі перамогу. Аднак спроба авалодаць *Канстанцінопалем* аказалася ім не пад сілу. У **395 годзе** імперыя канчаткова раздзялілася на дзве часткі: ***Усходнюю*** і ***Заходнюю***.

Праз некаторы час готы, якіх узначальваў *Аларых*, вырашылі аднавіць вайну супраць рымлян. Але рымлянам удалося дамовіцца з праціўнікам аб выкупе. На аплату пазыкі пераплавілі нават статую багіні Доблесці. Аднак і гэта не дапамагло. Рым быў узяты варварамі ў **410 годзе**.

Затым з прыкаспійскіх стэпаў на імперыю абрушыліся шматлікія паўдзікія плямёны *гунаў*. Рымлян выратавала толькі нечаканая смерць правадыра гунаў ***Атылы***. Пасля нашэсця гунаў Вечнаму



Правообладатель Народная асвета



Разграбленне Рыма вандаламі. *Сучасны малюнак*

гораду сталі пагражаць *вандалы*. Высадзіўшыся каля Рыма, яны не сустрэлі ніякага супраціўлення. Толькі папа Леў I (галава Рымскай царквы) адзін выйшаў насустрач варожаму войску. Вандалы ўварваліся ў Рым. Жорсткае абрабаванне Рыма назаўсёды засталося ў гісторыі пад назвай *вандалізм*.

Апошнім імператарам стаў ***Ромул Аўгустул,*** які быў звергнуты ў **476 годзе**. Заходняя Рымская імперыя перастала існаваць. Імператарская ўлада страціла свой сэнс, а яе сімвалы — карону і пурпуровую мантыю — адправілі ў Канстанцінопаль.

*Такім чынам, Рымская імперыя аслабела па многіх прычынах. Свабоднае насельніцтва было даведзена да галечы, а рабы не былі зацікаўлены ў працы. Рым не мог устаяць супраць варвараў, а армія не стала яго надзейнай аховай. Перасталі існаваць старыя парадкі і рэлігія. Імперыя загінула, але яе культурная спадчына захавалася да нашых дзён.*

**1.** Вызначце прычыны аслаблення Рымскай імперыі.
**2.** Хто такія калоны? Чым яны адрозніваліся ад рабоў?



Правообладатель Народная асвета

3. Прывядзіце прыклады з жыцця рымскага грамадства, якія сведчаць аб упадку старых нораваў у канцы IV стагоддзя н. э.
4. Складзіце паведамленне на тэму «Разгром Рыма варварамі».
5. Якое значэнне тэрміна «вандалізм»? Што ён абазначае сёння?
6*. Адзначце на стужцы часу гады, звязаныя з раздзяленнем Рымскай імперыі на Усходнюю і Заходнюю, абвяшчэннем першага і звяржэннем апошняга імператараў.

## Абагульненне да раздзела «Старажытны Рым»

Вы пазнаёміліся са старажытным грэка-рымскім светам і яго культурай. Усё, што адносіцца да гісторыі гэтага свету, прынята называць антычнасцю. Нехта можа сказаць: а навошта нам ведаць антычнасць? Ужо надта далёка мы ад яе — у пачатку XXI стагоддзя. Так, сапраўды, нас і гісторыю антычнасці раздзяляюць тысячагоддзі. Але нават няўмольны час не ў сілах сцерці з памяці чалавецтва вялікія дасягненні грэкаў і рымлян.

Давайце яшчэ раз добра ўдумаемся ў тое, аб чым прачыталі, аб чым гаварылі і спрачаліся на ўроках, што даказвалі і спрабавалі зразумець. І стане зразумела, што нашай сучаснай цывілізацыі проста не было б без антычнай цывілізацыі.

Нават зараз, чытаючы гэтыя радкі, углядваючыся ў літары, з якіх складаюцца словы, кожны з нас дакранаецца да подзвігу безыменных стваральнікаў алфавіта. А колькі такіх подзвігаў было? Чаргой паўстаюць яны перад намі.

У рымлян навучыліся еўрапейцы будаваць гарады, узводзіць масты і крапасныя збудаванні, пракладваць дарогі.

У Старажытнай Грэцыі нарадзілася дэмакратыя. Рым даў прыклады рэспубліканскага ладу жыцця і кіравання.

У Рымскай імперыі ўзнікла хрысціянства, былі закладзены асновы будучага росквіту еўрапейскай культуры.

У той жа час не трэба забываць, што магутнасць Рыма і яго дасягненні ў многім заснаваны на працы самай бяспраўнай і прыгнечанай часткі насельніцтва — рабоў. Яны не раз падымалі паўстанні, якія застаўлялі здрыгануцца Рымскую дзяржаву.



Правообладатель Народная асвета

1. Вызначце словамі месцазнаходжанне Старажытнага Рыма, пакажыце яго на карце.
2. Якія тэрыторыі былі заваяваны Рымам у часы Рымскай імперыі? Калі Рымская дзяржава дасягнула найбольшых памераў?
3. Параўнайце прыроду Італіі і Грэцыі. Зрабіце вывад, якім заняткам людзей у старажытнасці яна спрыяла.
4. З імёнамі якіх праслаўленых людзей вы звязваеце гісторыю Старажытнага Рыма? Раскажыце пра аднаго з іх, выкарыстайце для гэтага дадатковы матэрыял. Растлумачце, якія якасці характару прывабілі вас у гэтым чалавеку.
5. Адзначце на стужцы часу важнейшыя падзеі рымскай гісторыі. Прыдумайце храналагічныя задачы.
6. Выхаванне любові да Рыма (як і любові да радзімы ў старажытных грэкаў) лічылася важнай задачай усіх грамадзян. Паразважайце, у якіх справах, учынках, дзеяннях грамадзянін (плебей, патрыцый, імператар) мог праявіць сваю адданасць Айчыне. Ці сучасна гэта для нас?

# Раздзел 3. **СТАРАЖЫТНЫЯ ГЕРМАНЦЫ І СЛАВЯНЕ**

## § 30. Старажытныя германцы

**Успомніце.** Якія народы жылі на ўскраінах Рымскай імперыі?

Заходняя Рымская імперыя, як вы ўжо ведаеце, рухнула пад націскам варварскіх народаў. Варварамі грэкі і рымляне называлі ўсіх чужаземцаў, у тым ліку германцаў і славян, з-за іх быццам бы грубых моў і дзіўных звычаяў. Варвары сыгралі вялікую ролю не толькі ў гісторыі Старажытнага свету, але і ўсёй Еўропы.

**1. Прарадзіма і рассяленне германцаў.** Асобнае месца сярод варвараў займалі *германскія плямёны*. Прарадзімай гэтага народа лічыцца поўдзень Скандынавіі і Ютландскі паўвостраў. З-за пагаршэння клімату і ў пошуках лепшых зямель германцы пачалі перасяляцца ў паўднёвым напрамку. Да I стагоддзя н. э. яны рассяліліся да Рэйна і Одэра на захадзе і да Дуная на поўдні. Ад 3 да 4 мільёнаў германцаў жылі на вялікай тэрыторыі, якая выцягнулася дугой ад Скандынаўскага паўвострава да Чорнага мора.

Народная асвета



Правообладатель Народная асвета

**2. Германскае грамадства**. Старажытныя германцы пражывалі ў невялікіх адасобленых паселішчах. Зямлі вакол хапала ўсім, але галоўным багаццем лічыўся статак. Роднасныя сем'і аб'ядноўваліся ў роды, некалькі родаў — у племя.

Галава сям'і валодаў бясспрэчным аўтарытэтам, яму падпарадкоўваліся суродзічы, ён распараджаўся агульнай маёмасцю. Яго жонка таксама займала віднае становішча ў грамадстве. Над імі стаялі родавыя старэйшыны і жрацы, а ў выпадку паходаў — *ваенныя правадыры*. Самыя важныя пытанні вырашаліся на агульным сходзе дарослых мужчын племені. Няўгодныя прапановы яны адмаўлялі шумным гулам, а ў знак згоды з тым ці іншым рашэннем падымалі коп'і.

Паступова родавыя старэйшыны і ваенныя правадыры сталі ўзвышацца. Яны ігралі галоўную ролю на народных сходах, жылі ў умацаваных сядзібах, мелі шмат зямлі і статку, забіралі сабе большую частку ваеннай здабычы. Першапачаткова правадыры выбіраліся супляменнікамі з ліку найбольш моцных і храбрых воінаў. Але з цягам часу іх улада пачала перадавацца ў спадчыну. З'яўленне такіх правадыроў (*канунгаў*) стала важным крокам на шляху фарміравання дзяржавы ў старажытных германцаў.

У германскім грамадстве высока цанілася сіла, ваенная адвага і храбрасць. Падобна спартанцам германцы лічылі, што сапраўдны воін павінен ці атрымаць перамогу, ці загінуць у баі. Шчыт, пакінуты на полі бою, мог належаць толькі мёртваму воіну. Ваяўнічасць германцаў аказала вялікі ўплыў на іх рэлігійныя вераванні. У германскім пантэоне мы знаходзім багоў, якія любілі ваяваць і паляваць. *Вотан*, або *Одзін*, быў богам вайны, ведаў і паэзіі. Яшчэ адным богам вайны з'яўляўся *Тор*-грамавержац.

**3. Германцы і Рым.** Доўгі час германцы жылі на паўночна-ўсходніх граніцах рымскага свету. У II стагоддзі да н. э. яны ўпершыню ўварваліся ў межы Паўночнай Італіі. Рымскія легіёны спынілі рух наперад германцаў, але пакарыць іх так і не змаглі. У 9 годзе н. э.



Правообладатель Народная асвета



Бітва ў Тэўтабургскім лесе. *Сучасны малюнак*

рымляне пацярпелі знішчальнае паражэнне ад германскіх плямён у *Тэўтабургскім лесе* паблізу ракі Рэйн.

З гэтага часу імперыя, стрымліваючы націск дзёрзкіх варвараў, думала толькі аб абароне. А з канца II стагоддзя н. э. рымскія імператары стараліся ператварыць германцаў у сваіх саюзнікаў. Воіны-германцы ўзмацнілі рымскую армію, а некаторыя з іх сталі віднымі военачальнікамі. Але рымляне па-ранейшаму адносіліся да германцаў звысоку. У **476 годзе** правадыр наёмных германскіх атрадаў ***Адаакр*** зняў апошняга рымскага імператара і абвясціў сябе правіцелем Італіі.

*Пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі на яе багатыя і вялізныя землі з усіх бакоў накінуліся шматлікія германскія плямёны. У гісторыі Еўропы пачаўся новы перыяд.*

**1.** Пакажыце на карце прарадзіму і месца пражывання германскіх плямён у старажытнасці.

**2.** Што ўяўляла сабой старажытнагерманскае грамадства? Каму ў ім належала ўлада?



Правообладатель Народная асвета

3. Вызначце, што было агульнага паміж германцамі і спартанцамі ў іх ладзе жыцця.
4. Ці можна сцвярджаць, што ваяўнічыя германцы былі язычнікамі?
5. Якую ролю ў гісторыі Рымскай імперыі сыгралі германцы?
6*. Што аб'ядноўвае падзеі, якія адбыліся ў 9 і ў 476 гадах н. э.? Адзначце іх на стужцы часу.

## § 31. Старажытныя славяне

**Успомніце.** Рэлігійныя вераванні старажытных грэкаў.

Славяне — буйнейшая ў Еўропе група роднасных народаў (каля 300 мільёнаў чалавек), якая ўзнікла ў глыбокай старажытнасці. Таму беларуская, руская і іншыя сучасныя славянскія мовы захоўваюць спадчыну адзінай старажытнаславянскай мовы. Яны блізкія да санскрыту — цяпер «мёртвай мовы» Вед, якую ведаюць у Індыі толькі жрацы-брахманы.

**1. Прарадзіма славян і іх рассяленне.** Вучоныя да гэтага часу спрачаюцца аб тым, дзе знаходзіцца прарадзіма славян, калі і як адбывалася іх рассяленне на прасторах Усходне-Еўрапейскай раўніны, у Цэнтральнай Еўропе і на Балканскім паўвостраве.

З агульнай сям'і індаеўрапейскіх народаў славяне выдзеліліся ў *другім тысячагоддзі да н. э.* Яны паступова рассяліліся па Еўропе, і ў сярэдзіне *першага тысячагоддзя н. э.* займалі вялікую тэрыторыю паміж рэкамі Днепр і Одэр. Значная працягласць старажытнаславянскага рассялення стала прычынай таго, што некалі адзіная праславянская мова раздрабілася на мноства дыялектаў. У выніку гістарычна сфарміраваліся тры групы славян: *усходнія* (у басейне Дняпра), *заходнія* (у басейне Віслы) і *паўднёвыя* (на Балканах). На тэрыторыі Беларусі славяне з'явіліся прыкладна ў V стагоддзі н. э.

**2. Грамадскія адносіны ў старажытных славян.** У старажытнасці славяне жылі вялікімі сем'ямі. Некалькі такіх сем'яў складалі род. На чале роду заўсёды стаяў усімі паважаны чалавек старога ўзросту — *старэйшына*, або *дзед*. На больш познім этапе некалькі



Правообладатель Народная асвета

родаў аб’ядноўваліся ў больш буйную групу — племя — паводле прыметы кроўнага радства. На чале племені ставіўся правадыр, якога выбіралі шляхам галасавання на народным сходзе. Нярэдка гэта быў воін, які вызначаўся асобым ваенным майстэрствам і мужнасцю.

**3. Культура і рэлігійныя вераванні.** Яркае ўяўленне пра духоўны свет старажытных славян даюць міфы, многія з якіх захаваліся да нашых дзён.

Першапачаткова славяне верылі ў добрых і злых духаў прыроды. Затым наступіла эпоха вялікіх багоў, сярод якіх на першы план вылучыўся бог *Род*, стваральнік усяго існуючага. Славянскія багі былі грознымі, але справядлівымі і добрымі. *Пярун* забіваў маланкай злодзеяў. *Лель* і *Лада* ахоўвалі закаханых. *Чур* аберагаў межы ўладанняў. Вясёлы і прыгожы *Купала* з’яўляўся абаронцам купальніц, богам лета, палявых пладоў і летніх кветак. У пачатку жніва ў яго гонар праводзіліся святы, яму прыносілі ахвяры; юнакі і дзяўчаты запальвалі вялікія вогнішчы на палях, танцавалі і спявалі каля агню.



Бог Пярун.
*Сучасны малюнак*

Абрады язычніцкага богаслужэння праводзілі спецыяльна выбраныя людзі. Яны называліся *вешчунамі, жрацамі, ведунамі* і *вядуннямі*. Іх паважалі за дабрыню і мудрасць, лічылі пасрэднікамі паміж людзьмі і божаствамі. Вешчуны лячылі людзей і складалі календары, займаліся гаданнем і прадказаннямі. Вешчуны-ахоўнікі выраблялі розныя амулеты — абярогі і выявы багоў, а вешчуны-кашчуннікі былі апавядальнікамі «кашчун», старажытных паданняў і міфаў.

Акрамя багоў і багінь, славяне насялялі свой свет і менш значнымі істотамі: русалкамі, лесунамі, вадзянікамі, дамавікамі, істотамі, якія жывуць у хлявах і лазнях.



Правообладатель Народная асвета



Свяцілішча старажытных славян.
*Сучасны малюнак*

Старажытным славянам былі вядомы элементы малюнкавага пісьма. Гэтае пісьмо шырока выкарыстоўвалася ў арнаментальных упрыгожаннях рытуальных прадметаў. Так, выява акружнасці абазначала знак Рода. Акружнасць з крыжам — гэта знак сонца і бога сонечнага дыска Хорса. Узаранае поле, сам араты, а таксама багацце ў малюначных запісах абазначаліся рашоткай. Славяне падобна рымлянам дзялілі год на дванаццаць месяцаў.

*Гісторыя славянскай культуры захоўвае нямала тайнаў, якія чакаюць яшчэ сваіх першаадкрывальнікаў.*

1. Да якой групы народаў належалі старажытныя славяне?
2. Пакажыце на карце тэрыторыю рассялення славянскіх плямёнаў у сярэдзіне першага тысячагоддзя н. э. Назавіце іх асноўныя групы.
3. Раскажыце аб грамадскіх адносінах у славян у старажытнасці.
4. Параўнайце рэлігійныя ўяўленні старажытных славян і грэкаў. Зрабіце вывад.
5. У чым заключаюцца асаблівасці старажытнаславянскай пісьменнасці? Як яна захавалася ў памяці нашых сучаснікаў?
6*. Складзіце і запоўніце табліцу, у якой запішыце імёны славянскіх багоў і віды дзейнасці, якіх яны апекавалі.

Правообладатель Народная асвета

# ПАМЯТКА

## I. Як скласці план

1. Уважліва прачытайце тэкст, разбіце яго на закончаныя часткі.

2. Кожнай частцы дайце загаловак па галоўнай думцы. Гэта асноўныя пункты плана (пранумаруйце іх рымскімі лічбамі).

3. Выдзеліце некалькі сказаў, якія ўдакладняюць асноўныя пункты плана (пранумаруйце іх арабскімі лічбамі).

## II. Як скласці паведамленне аб гістарычным героі (асобе)

1. Вызначце, дзе і калі жыў герой, якімі якасцямі валодаў.

2. Да чаго імкнуўся, як дабіваўся мэты.

3. Чым праславіўся (прывядзіце звесткі з мастацкай і іншай літаратуры аб гэтым чалавеку).

4. Выкажыце сваё меркаванне і адносіны да гістарычнага дзеяча (што цэніце ў ім, што не ўхваляеце).

## III. Вучыцеся працаваць з ілюстрацыяй

1. Разгледзьце ілюстрацыю (малюнак).

2. У думках разбіце яе на часткі і разгледзьце кожную з іх (назавіце, што адлюстравана ў розных частках).

3. Апішыце, у што апрануты адлюстраваныя людзі; назавіце, якія прылады працы яны выкарыстоўваюць, чым займаюцца і г. д.

4. Складзіце паведамленне паводле малюнка. Зрабіце агульныя вывады.

## IV. Вучыцеся параўноўваць

1. Вызначце, што будзеце параўноўваць (мэта параўнання).

2. Праверце, ці ведаеце вы матэрыял, які хочаце параўноўваць.

3. Складзіце план параўнання. Знайдзіце асновы для параўнання.

4. Праверце параўнанне па плане, знайдзіце падобнасць (або адрозненні).

5. Зрабіце вывад з параўнання.



Правообладатель Народная асвета

# СЛОЎНІК ГІСТАРЫЧНЫХ ТЭРМІНАЎ І ПАНЯЦЦЯЎ

**Агара́** — месца народных сходаў у грэкаў. Як правіла, гэта гарадская плошча або рынак. Агара была цэнтрам палітычнага жыцця грэчаскіх полісаў. Найбольш вядомая агара ў Афінах. Агарай таксама называўся сам народны сход.

**Аліга́рхія** — форма праўлення, пры якой улада належыць невялікай групе арыстакратаў або багачоў, г. зн. нямногім. Тэрмін «алігархія» ўпершыню сустракаецца ў творах старажытнагрэчаскіх пісьменнікаў.

**Анты́чнасць** — гісторыя і культура Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма. Паходзіць ад лацінскага слова «антыквус», што азначае «старажытны». Можна сказаць, што антычнасць — гэта грэка-рымская старажытнасць.

**Ва́рвары** — людзі, якія для старажытных грэкаў, а затым і для рымлян былі чужаземцамі, размаўлялі на незразумелай мове. Варвар у перакладзе са старажытнагрэчаскай мовы азначае «нягрэчаскі, чужаземны».

**Усходняя Ры́мская імпе́рыя** — такую назву атрымала Усходняя частка Рымскай імперыі пасля яе канчатковага аддзялення ад Заходняй у 395 г. Сталіцай Усходняй Рымскай імперыі стаў горад Канстанцінопаль (сучасны Стамбул). Пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі ў 476 г. яна стала называцца Візантыяй.

**Грамадзя́нін** — у Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме свабодны чалавек, які меў пэўныя правы і абавязкі. Грамадзянін меў права ўдзельнічаць у кіраванні сваім горадам-дзяржавай (полісам), валодаў як уласнік участкам зямлі, павінен быў абавязкова ўдзельнічаць у народным апалчэнні ў выпадку знешняй пагрозы.

**Грамадзя́нская вайна́** — узброеная барацьба за ўладу ў дзяржаве паміж рознымі групамі грамадзян.

**Дэмакра́тыя** — у перакладзе з грэчаскай мовы — улада народа. Дэмакратычная ўлада склалася ў Старажытнай Грэцыі. У Афінах, напрыклад, яна належала грамадзянам ва ўзросце звыш 20 гадоў. Яны збіраліся рэгулярна, праз кожныя 9—10 дзён, у Народным



Правообладатель Народная асвета

сходзе і рашалі дзяржаўныя справы большасцю галасоў. Вышэйшыя службовыя асобы назначаліся шляхам выбараў. Пры гэтым трэба памятаць, што большая частка насельніцтва (жанчыны, метэкі, рабы) не мелі палітычных правоў, паколькі яны не з’яўляліся грамадзянамі. Толькі грамадзян афіняне называлі народам, які кіруе дзяржавай.

**Дыктату́ра** — сукупнасць надзвычайных уладных паўнамоцтваў у Старажытным Рыме. У Старажытным Рыме такой паўнатой улады надзяляліся дыктатары паводле рашэння сената ў выпадку вайны або іншай надзвычайнай сітуацыі.

**Заходняя Ры́мская імпе́рыя** — у 395 г. адбылося канчатковае раздзяленне Рымскай імперыі на Заходнюю і Усходнюю часткі. Сталіцай Заходняй Рымскай імперыі па-ранейшаму застаўся Рым. У 476 г. апошні імператар Заходняй Рымскай імперыі Ромул Аўгустул быў звергнуты кіраўніком германскіх плямён Адаакрам. Гэта азначала канчатковае падзенне Заходняй Рымскай імперыі.

**Імпера́тар** — тытул правіцеля ў Старажытным Рыме. Гл. «Імперыя».

**Імпе́рыя** — ад лац. *imperium* — паўната ўлады. У Старажытным Рыме гэта слова першапачаткова азначала вярхоўную ўладу. Такой уладай карысталіся консулы, дыктатары і інш. З 27 года да н. э. гэта слова ператварылася ў тытул Цэзара Аўгуста і яго пераемнікаў. Адначасова яно стала абазначаць тэрыторыю, на якую распаўсюджвалася ўлада рымскіх імператараў. Рымская дзяржава стала называцца Рымскай імперыяй (Imperium Romanum).

**Калізе́й** — самы вялікі амфітэатр Рыма і ўсяго антычнага свету. Сваю назву атрымаў ад калоса (статуя), які стаяў паблізу ад амфітэатра. Быў асвячоны і адкрыты імператарам Цітам у 80 годзе н. э. Змяшчаў каля 50 тысяч гледачоў. У Калізеі адбываліся гладыятарскія баі.

**Калоны** — арандатары зямлі ў Старажытным Рыме. Калоны атрымлівалі ад землеўладальніка права апрацоўваць (арэндаваць) участак зямлі, а ўзамен выплачвалі яму грашовы падатак. У IV стагоддзі яны былі прымацаваны да зямлі свайго гаспадара і ўжо не маглі пакінуць яго. Іх становішча было падобнае да становішча рабоў.



Правообладатель Народная асвета

**Каме́дыя** — мастацкі твор з вясёлым, смешным зместам, а таксама пастаноўка яго на сцэне. Камедыя ўзнікла ў Старажытнай Грэцыі з розных народных забаў і святкаванняў, якія наладжваліся ў гонар багоў. Старажытнагрэчаская камедыя чэрпала тэмы з паўсядзённага жыцця поліса. Аўтары выступалі ў масках і касцюмах, крытыкавалі відных грамадзян і весялілі гледачоў. Найвышэйшага росквіту грэчаская камедыя дасягнула ў творчасці Арыстафана, а рымская — у Плаўта. Камедыя звычайна проціпастаўляецца трагедыі.

**Легіён** — асноўнае воінскае падраздзяленне ў арміі Старажытнага Рыма. У розны час налічвала ад 4 да 7 тысяч чалавек. Складаўся з пехацінцаў і коннікаў. Легіён меў кідальныя гарматы, розную баявую тэхніку і майстэрні па зброі. У перыяд праўлення імператара Аўгуста рымская армія налічвала каля 25 легіёнаў.

**Мецэна́т** — апякун мастацтва і літаратуры. У імператара Аўгуста быў прыбліжаны па імені Цыльній Мецэнат. Ён апекаваўся над маладымі паэтамі, падтрымліваў матэрыяльна Вергілія і Гарацыя. Мецэнат імкнуўся выкарыстаць іх для праслаўлення Аўгуста. Імя Мецэната стала агульнай назвай.

**Пантэон** — храм, прысвечаны ўсім багам. Пантэон — будынак у Рыме, які захаваўся да нашых дзён. Пабудаваны ў II стагоддзі н. э. Гэта велічнае купальнае збудаванне антычнасці вышынёй 43 м. У цэнтры Пантэона некалі стаялі статуі рымскіх багоў. У цяперашні час будынак Пантэона з'яўляецца хрысціянскай царквою.

**Патры́цыі** — «нашчадкі бацькоў», спрадвечна рымскія грамадзяне, якія валодалі ўсімі правамі. Толькі яны маглі займаць дзяржаўныя пасады і засядаць у сенаце. Пад націскам плебеяў у пачатку III стагоддзя да н. э. прывілеі патрыцыяў былі адменены.

**Плебе́і** — прышлае насельніцтва Старажытнага Рыма, першапачаткова не карысталася палітычнымі правамі ў адрозненне ад патрыцыяў.

**Поліс** — горад-дзяржава ў Старажытнай Грэцыі. Улада ў ім належала паўнапраўным грамадзянам. Толькі яны мелі права на зямельную ўласнасць, права выбіраць і быць выбранымі ў органы ўлады. Частка насельніцтва горада не мела грамадзянскіх правоў



Правообладатель Народная асвета

(метэкі, перыэкі, рабы). Форма ўлады ў полісе была разнастайнай: алігархія, дэмакратыя, арыстакратыя. Кожны поліс імкнуўся захаваць сваю свабоду, самастойнасць і незалежнасць. Таму ў Старажытнай Грэцыі так і не была створана адзіная і магутная дзяржава.

**Рэспу́бліка** — форма праўлення, пры якой вышэйшая ўлада ў дзяржаве належыць службовым асобам, якія выбіраюцца ўсеагульным галасаваннем. Такая ўлада ўпершыню ўзнікла ў Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме. Выбары вышэйшых органаў улады былі «грамадскай справай» для ўсіх. «Грамадская справа» ў перакладзе з лацінскай мовы і ёсць «рэспубліка». Рэспубліка супрацьлеглая манархіі.

**Трагéдыя** — музыкальны і тэатральны спектакль у Старажытнай Грэцыі, а таксама від мастацкага твора. Трагедыю выконвалі хор і акцёры. У трагедыі паказвалася напружаная барацьба, асабістая або грамадская катастрофа. Трагедыя звычайна заканчвалася смерцю героя. Яна супрацьлеглая камедыі. Першапачаткова ўдзельнікі хору апраналіся ў касцюмы саціраў — істот з хвастом, рагамі і казлінымі нагамі. Адсюль, верагодна, і паходзіць назва «трагедыя» — казліная песня.

**Форум** — першапачаткова словам «форум» называлі рыначную плошчу. З цягам часу форум ператварыўся ў цэнтр палітычнага і культурнага жыцця рымскага горада. На тэрыторыі форума знаходзіліся найбольш значныя храмы. Тут судзілі злачынцаў і ладзілі розныя цырымоніі. Найбольш вядомым быў Рымскі форум. Адно са значэнняў старажытнарымскага форума захавалася да нашых дзён — масавы сход, з’езд.

**Хрысція́нства** — адна з трох сусветных рэлігій. Ісус Хрыстос — стваральнік хрысціянскай царквы.

**Царква́** — тэрмін, які мае некалькі значэнняў: хрысціянскі храм, месца рэлігійных сходаў для правядзення хрысціянскага богаслужэння, арганізацыя паслядоўнікаў хрысціянскай рэлігіі.

**Э́лін** — слова, якім грэкі называлі самі сябе. Яно паходзіць ад імя легендарнага героя — Эліна. Паводле падання, Элін быў прабацькам грэчаскага роду.

Правообладатель Народная асвета

# ХРАНАЛАГІЧНАЯ ТАБЛІЦА

## Старажытная Грэцыя

| | |
|---|---|
| Канец трэцяга тысячагоддзя да н. э. | Узнікненне «палацавых дзяржаў» на в. Крыт |
| XVI—XV стагоддзі да н. э. | Росквіт цывілізацыі на в. Крыт |
| XV—XIII стагоддзі да н. э. | Росквіт ахейскіх царстваў на Пелапанесе (Мікены, Тырынф, Пілос) |
| Каля 1240 года да н. э. | Пачатак Траянскай вайны |
| X век да н. э. | Узнікненне Спарты |
| VIII—VI стагоддзі да н. э. | Вялікая грэчаская каланізацыя |
| 776 год да н. э. | Першая Алімпіяда |
| 594 год да н. э. | Заканадаўства Салона |
| 500—449 гады да н. э. | Грэка-персідскія войны |
| 490 год да н. э. | Бітва пры Марафоне |
| 480 год да н. э. | Бітва пры Фермапілах, Саламіне |
| 479 год да н. э. | Бітва пры Платэях |
| 444—429 гады да н. э. | Перыкл на чале Афін |
| 431—404 гады да н. э. | Пелапанеская вайна ў Грэцыі |
| 405 год да н. э. | Разгром спартанцамі афінскага флота пры «Казіных рэчках» |
| 359—336 гады да н. э. | Праўленне македонскага цара Філіпа II. Пачатак узвышэння Македоніі |
| 338 год да н. э. | Перамога македонскага цара Філіпа II над грэкамі ў бітве пры Херанеі |
| 336—323 гады да н. э. | Праўленне Аляксандра Македонскага |
| 334—324 гады да н. э. | Усходнія паходы Аляксандра Македонскага |



Правообладатель Народная асвета

## Старажытны Рым

| | |
|---|---|
| 753 год да н. э. | Легендарнае заснаванне Рыма |
| 510 год да н. э. | Выгнанне апошняга цара з Рыма |
| 509 год да н. э. | Устанаўленне рэспублікі |
| 494 год да н. э. | Устанаўленне пасады народных трыбунаў у Рыме |
| 451—450 гады да н. э. | Прыняцце «Законаў XII табліц» |
| Пачатак IV стагоддзя да н. э. | Разрабаванне Рыма галамі |
| 264—241 гады да н. э. | Першая Пунічная вайна |
| 218—201 гады да н. э. | Другая Пунічная вайна |
| 216 год да н. э. | Перамога Ганібала над рымлянамі пры Канах |
| 202 год да н. э. | Бітва пры Заме |
| 149—146 гады да н. э. | Трэцяя Пунічная вайна. Гібель Карфагена |
| 133 год да н. э. | Рэформа Тыберыя Гракха |
| 123—122 гады да н. э. | Рэформа Гая Гракха |
| 107 год да н. э. | Ваенная рэформа Гая Марыя |
| 74—71 гады да н. э. | Паўстанне Спартака |
| 49—45 гады да н. э. | Грамадзянская вайна ў Рыме. Барацьба за ўладу паміж Цэзарам і Пампеем |
| 44 год да н.э., 15 сакавіка | Забойства Юлія Цэзара |
| 27 год да н. э. — 14 год н. э. | Аднаасобнае праўленне Актавіяна Аўгуста |
| 395 год | Канчатковае раздзяленне Рымскай імперыі на Усходнюю і Заходнюю |
| 410 год | Узяцце і разгром Рыма готамі |
| 475—476 гады | Ромул Аўгустул — апошні імператар Заходняй Рымскай імперыі |
| 476 год | Звяржэнне Ромула Аўгустула. Падзенне Заходняй Рымскай імперыі |

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## ШТО ЧЫТАЦЬ

Буриан Я., Моухова Б. Загадочные этруски. Любое издание.

Винничук Л. Люди, нравы и обычаи Древней Греции и Рима. М., 1988.

Воронкова Л. Ф. В глуби веков: роман. М., 1973.

Гаспаров М. Л. Занимательная Греция: рассказы о древнегреч. культуре. М., 2002.

Гиро П. Быт и нравы древних греков. Смоленск, 2000.

Джованьоли Р. Спартак: роман. Любое издание.

Дмитриева Н. А., Акимова Л. И. Античное искусство. М., 1988.

Древний Рим: кн. для чтения / под ред. Д. П. Каллистова и С. Л. Утченко. М., 1969.

Древняя Греция: кн. для чтения / под ред. С. Л. Утченко. М., 1974.

Езерский М. В. Сила Земли: роман. Любое издание.

Исчезнувшие цивилизации. Помпеи. М., 1996.

Исчезнувшие цивилизации. Удивительные эгейские царства. М., 1996.

Кносс. Загадка лабиринта Минотавра. М., 2000. (Тайны истории.)

Кун Н. А. Легенды и мифы Древней Греции. М., 1997.

Мартели С. Мифологические рассказы. М., 1997.

Мартели С. Энеида. Приключения Энея. М., 1996.

Милиадис Я. Истории из Геродота. М., 1983.

Немировский А. И. Легенды ранней Италии и Рима. М., 1996.

Он же. Александр Македонский. М., 1996.

Он же. Илиада. Троянская война. М., 1996.

Он же. Слоны Ганнибала: повесть. М., 1963.

Он же. Мессенские войны: повесть. М., 1969.

Он же. Сын Зевса: повесть. Любое издание.

Сенкевич Г. Камо грядеши (Куда идешь): роман. М., 1986.

Тарновский В. Гладиаторы. М., 1995. (Что есть что.)

Тудоровская Е. А. Приключения Одиссея. Любое издание.

Ян В. Огни на курганах: повесть о жизни скифов. М., 1988.



Народная асвета

Правообладатель Народная асвета

## ЗМЕСТ

Раздзел 1. **СТАРАЖЫТНАЯ ГРЭЦЫЯ** . . . . 4
§ 1. Прырода і насельніцтва Старажытнай Грэцыі . . . . —
§ 2. Мінойскі Крыт і яго культура . . . . 6
§ 3. Ахейская Грэцыя . . . . 11
§ 4. Рэлігія старажытных грэкаў . . . . 15
§ 5. Узнікненне грэчаскага поліса . . . . 19
§ 6. Вялікая грэчаская каланізацыя . . . . 22
§ 7. Старажытная Спарта . . . . 26
§ 8. Узнікненне і развіццё Афінскай дзяржавы . . . . 30
§ 9. Грэка-персідскія войны і росквіт Афін . . . . 34
§ 10. Пелапанеская вайна і заняпад Афін . . . . 38
§ 11. Дзяржава Аляксандра Македонскага . . . . 41
§ 12. Школа, навуковыя веды і рэлігія . . . . 46
§ 13. Старажытнагрэчаскае мастацтва . . . . 49
§ 14. Старажытнагрэчаскі тэатр і святы . . . . 53
§ 15. Паўсядзённае жыццё грэкаў . . . . 56
§ 16. Эліністычная культура . . . . 59
Абагульненне да раздзела «Старажытная Грэцыя» . . . . 63

Раздзел 2. **СТАРАЖЫТНЫ РЫМ** . . . . 65
§ 17. Легендарны пачатак Рыма . . . . —
§ 18. Ранняя Рымская рэспубліка . . . . 69
§ 19. Заваяванне Рымам Італіі . . . . 73
§ 20. Заваяванне Рымам Міжземнамор'я . . . . 76
§ 21. Зямельная і ваенная рэформы ў Рыме . . . . 80
§ 22. Рабаўладанне ў Рыме . . . . 83
§ 23. Падзенне Рымскай рэспублікі і стварэнне імперыі . . . . 87
§ 24. Улада рымскіх імператараў . . . . 91
§ 25. Рым — сталіца імперыі . . . . 94
§ 26. Культура Старажытнага Рыма . . . . 98
§ 27. Рэлігія старажытных рымлян . . . . 102
§ 28. Хрысціянства ў Рымскай імперыі . . . . 104
§ 29. Падзенне Заходняй Рымскай імперыі . . . . 108
Абагульненне да раздзела «Старажытны Рым» . . . . 112

Раздзел 3. **СТАРАЖЫТНЫЯ ГЕРМАНЦЫ І СЛАВЯНЕ** . . . . 113
§ 30. Старажытныя германцы . . . . —
§ 31. Старажытныя славяне . . . . 116

Памятка . . . . 119
Слоўнік гістарычных тэрмінаў і паняццяў . . . . 120
Храналагічная табліца . . . . 124
Што чытаць . . . . 126



Правообладатель Народная асвета

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Ацэнка навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Кошалеў** Уладзімір Сяргеевіч
**Корзун** Міхаіл Сямёнавіч
**Мініцкі** Мікалай Іосіфавіч і інш.

**ГІСТОРЫЯ СТАРАЖЫТНАГА СВЕТУ**

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У 2 частках

Частка 2

2-е выданне, перапрацаванае

Заг. рэдакцыі *В. Г. Бехціна*. Рэдактар *А. М. Парахневіч*. Мастацкі рэдактар *А. А. Валатовіч*. Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *Л. І. Шаўко*. Карэктары *В. С. Бабеня, А. П. Тхір*.

Падпісана ў друк 12.08.2014. Фармат $70 \times 90^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура літаратурная. Друк афсетны. Умоўн. друк. арк. 9,36. Ул.-выд. арк. 6. Тыраж 19 000 экз. Заказ .

Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Народная асвета»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/2 ад 08.07.2013. Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Народная асвета

Правообладатель Народная асвета